Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

5 САКАВІКА 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 42 (29411)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА

ПСЕЎДАНІМ... У ПАШПАРЦЕ 19

КУДЫ ВЯДЗЕ ДАРОГА ДАРОГ 21

ЦЫТАТА ДНЯ

Іван КУБРАКОЎ, міністр унутраных спраў:

«Беларуская міліцыя ўжо паказала, што мы гатовыя да любых выклікаў і пагроз. Хачу ўсім сказаць, што галоўная задача міліцыі і асноўная работа супрацоўнікаў органаў унутраных спраў на самай справе нябачныя. Не проста так раскрываюцца злачынствы — гэта карпатлівая, штодзённая праца. Таму і тут мы ўжо працуем на прафілактыку. Што да заклікаў выходзіць на пратэсты, мы ведаем людзей, якія заклікаюць. Памятаеце, калі на Усебеларускі сход спрабавалі таксама некаторыя заклікаць на вуліцу, сладзіць хаос. Усе гэтыя людзі былі ўстаноўленыя, затрыманыя і прыцягнутыя да ўстаноўленай законам адказнасці».

Пакаленні — розныя, клопаты — агульныя

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Мінск. Каля ўвахода ў найстарэйшы парк сталіцы — Чалюскінцаў.

КАРОТКА

- **ENSREG ухваліла папярэднюю справаздачу аб партнёрскім агляду нацплана па выніках стрэс-тэстаў БелАЭС.**
- «Белтэхагляд» у студзені-лютым выдаў у 2,3 раза больш дазволаў на допуск да ўдзелу ў дарожным руху, чым за аналагічны перыяд мінулага года.
- **БДУ падняўся на 100 пазіцый у рэйтынгу QS па фізіцы і астраноміі.**
- Першы электрадом увядуць у Мінску ў II квартале. Ён з'явіцца ў Маскоўскім раёне, у ім будзе 150 кватэр.
- **Маштабную мадэрнізацыю пачаў шклозавод у Лізаве.**

ISSN 1990 — 763X

Рэдкая прафесія

РАМАН З ЭПІГРАФІКАЙ, або Галасы далёкіх продкаў

Першапраходцы ў любую эпоху — людзі адзінкавыя. Неверагодна цікава сустрэць іх сярод сваіх суайчыннікаў і сучаснікаў

Дацэнт кафедры дапаможных дысцыплін і методыкі выкладання гісторыі БДПУ імя М. Танка, кандыдат гістарычных навук Іна КАЛЕЧЫЦ — першы і пакуль адзіны спецыяліст у Беларусі, які займаецца эпіграфікай. Вось ужо амаль 20 гадоў яна вывучае старажытныя надпісы на каменнях, керамікі, металах і іншых матэрыялах, якія выкарыстоўвалі замест паперы ў тыя далёкія часы, калі яе яшчэ не было.

Пра тое, як нечакана для сябе захапілася навукай, пра «галасы» даўно памерлых продкаў, якія чуе з глыбіні стагоддзяў, пра радасць, якую адчувае, папаўняючы скарбонку ведаў аб мінулым, мы і пагаварылі з маёй суразмоўніцай.

СТАР. 5

Кузня чэмпіёнаў

Аляксей НІКУЛІН:

«У РАБОЦЕ З МОЛАДДЗЮ ДРОБЯЗЯЎ НЕ БЫВАЕ»

Як спорт перамагае канфлікт бацькоў і дзяцей

Легендарная беларуская тэнісістка Вікторыя Азаранка часта ў інтэрв'ю расказвала, што ў яе не было дзяцінства, яго яна праводзіла на тэнісных кортах. Пераможца Australian Open 2021 года Новак Джокавіч у дзяцінстве не ведаў ніводнага чалавека, які б умела спраўляўся з ракеткай. Але неяк, седзячы ў піцэрыі бацькоў у маленькім курортным горадзе Капаонік у Сербіі, хлопчык убачыў па тэлевізары фінал Уімблдона і захацеў аднойчы выйграць гэты турнір. І зрабіў гэта аж пяць разоў. І калі чэмпіёнамі не нараджаюцца, а становяцца, то рысы, неабходныя да заваявання важных тытулаў, даюцца чалавеку ад нараджэння, трэба іх толькі разгледзець і развіць.

Як выхаваць з дзіцяці добрага тэнісіста? Да чаго на гэтым шляху трэба быць гатовым юнаму спартсмену і яго бацькам? Як несці на плячах адказнасць за будучыню спорту? На гэтыя пытанні адказаў Аляксей НІКУЛІН, старшы трэнер Гомельскага абласнога цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па тэнісе, трэнер Нацыянальнай акадэміі тэніса.

СТАР. 6

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Нацыя можа развівацца толькі на пазітыўных ідэях і справах»

Прэзідэнт уручыў дзяржаўныя ўзнагароды і пагоны вышэйшаму афіцэрскаму і кіруючаму складу

Па традыцыі, якая склалася за некалькі гадоў, напярэдадні галоўнага жаночага свята Палац Незалежнасці прымае шаноўных гасцей з ліку жанчын, узнагароджаных ордэнам Маці і мужчын, якім прысвоена чарговае воінскае званне. Акрамя дзясятка маці і шасці прадстаўнікоў сілавых структур, з рук Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі атрымалі ўзнагароды дзяржаўныя служачыя, работнікі вытворчасці і сельскай гаспадаркі, настаўнікі, медыкі — адным словам, тыя, хто дасягнуў значных поспехаў у прафесійнай дзейнасці.

Фота БелТА.

Галоўны ўрач Віцебскага абласнога клінічнага раддома Алена ЛЕАНОВІЧ узнагароджана ордэнам Пашаны.

Прэзідэнт у сваім выступленні адзначыў, што ў Год народнага адзінства традыцыйная цырымонія мае асаблівы сэнс: тут сабраліся людзі, якіх можна лічыць перадавым атрадам арміі дабра і стварэння, творчымі асобамі, нацэленымі на вынік.

«І гэта вельмі важна. Бо нацыя, якая клапоціцца аб заўтрашнім дні, можа згуртавацца і паспяхова развівацца толькі на пазітыўных ідэях і справах. Кожны з вас працуе на Айчыну і народ, сваёй працай робіць нашу краіну мацнейшай і прыгажэйшай. Гэта армія, адданая народу і прысязе, органы правапарадку, якія верныя свайму абавязку. І гэта яны спраўна прадэманстравалі ў апошнія месяцы», — адзначыў кіраўнік краіны.

Ён мяркуе, што за гады незалежнасці ў нас сфарміравалася грамадства, якое добра ўсведамляе, што падмурак адзінства народа і яго паспяховай будучыні — упартая стваральная праца, згуртаванасць і ўзаемадапамога. «Па-іншаму і быць не павінна, бо мы жывём на роднай зямлі, мы адзіны народ, любім сваю краіну і зробім усё, каб дзеці і ўнукі жылі ў міры і згодзе. Сёння па традыцыі мы ўручаем генеральскія пагоны сапраўдным мужчынам, якія прывыклі прама глядзець у вочы небяспецы і добра ведаюць цану міру і чалавечага жыцця», — заявіў Прэзідэнт.

Таксама ён выказаў словы ўдзячнасці ўсім тым, хто зараз знаходзіцца на варце, ахоўвае мірную працу і спакой беларусаў. Асаблівыя словы падзякі ад Аляксандра Лукашэнкі — супрацоўнікам міліцыі, якія адзначалі ўчора сваё прафесійнае свята.

«Лёсам вызначана, што прызначэнне мужчыны — абараняць. У той час як прызначэнне жанчыны — быць захавальніцай ачага, сямейных і нацыянальных традыцый, каштоўнасцяў», — дадаў кіраўнік краіны.

Гаворачы аб ролі жанчын, Прэзідэнт адзначыў: «Гэта вы ў літаральным сэнсе слова дорыце жыццё, дапамагаеце маленькаму чалавеку зрабіць першыя крокі, адкрываеце для яго вялікі свет. Вы ўсё паспяваеце: клапоціцеся пра родных і блізкіх, ствараеце атмасферу цяпла і ўтульнасці ў доме, пастаянна вучыцеся, дасягаеце вялікіх прафесійных поспехаў, актыўна ўдзельнічаеце ў грамадскіх справах і палітыцы. Часта пераўзыходзіце нас, мужчын», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў Прэзідэнта, мы ўсе разам пабудавалі і адстаялі незалежную Беларусь. «І ў гэтым ваша вялікая заслуга. Наша заслуга таксама немалая. Мы гэта ўсё рабілі дзеля вас. Не было б вас, не было б тых спраў, якія ўласцівы сапраўдным мужчынам. Упэўнены, у поўнай меры гэта адносіцца да ўсіх жанчын, якім я сёння з велізарным задавальненнем уручу дзяржаўныя ўзнагароды», — звярнуў увагу Прэзідэнт.

Асаблівыя словы ўдзячнасці і захаплення Аляксандр Лукашэнка адрасаваў шматдзетным маці. «Вы выконваеце сваю галоўную і важную місію на зямлі, — канстатаваў ён. — І не трэба казаць, што жанчыны — гэта слабы пол. Вы моцныя і мацнейшыя за нас. Вы не проста адказна і добрасумленна ставіцеся да справы, але і нам, мужчынам, даяце матывацыю да працы, натхненне для творчасці, становіцеся апорай у цяжкіх сітуацыях, часам немагчымых».

Напярэдадні веснавога свята самыя цёплыя віншаванні адрасаваў кіраўнік краіны ўсім жанчынам — маці, сёстрам, жонкам, дочкам, сяброўкам і калегам.

«Беларускія жанчыны — гэта не проста наша багацце, гэта здабытак нацыі. Дазвольце мне павіншаваць усіх вас з узнагародамі і высокімі званнямі. Абсалютна ўпэўнены, што гэта добрая традыцыя захаваецца назаўсёды», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Ён звярнуў увагу, што ўсе ўзнагароды і званні маюць асаблівую вагу ў сённяшняй сітуацыі. Генералаў, якія атрымалі пагоны, кіраўнік краіны назваў людзьмі, якім можна давяраць і якія здольныя абараніць нашу краіну.

«І вы, жанчыны, нараджаючы для нас дзяцей, павінны быць абсалютна ўпэўненыя, што вы і вашы дзеці знаходзіцеся пад нашай жалезнай аховаю. Вы за гэта не турбуйцеся і не хвалюйцеся. Мы сапраўды вас нікому не аддадзім», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Марыя ДАДАЛКА.

• Каментарый у тэму

Жанна БАТУРЫЦКАЯ, начальнік упраўлення Дэпартамента выканання пакарання МУС (атрымала званне «Заслужаны супрацоўнік органаў МУС»): «Па спецыяльнасці я заўсёды займалася работай, звязанай з выкананнем прыгавораў. Акрамя таго, заўсёды ўдзельнічала ў заканатворчай дзейнасці. Трэба сказаць, што я брала ўдзел у распрацоўцы ўсіх законаў аб амністыі, якія рыхтаваліся ў нас з 1996 года. То-бок гэта 16 праектаў і законаў, якія потым былі прыняты кіраўніком дзяржавы. Я арганізоўвала здзяйсненне законаў аб амністыі ў нашых установах выканання пакарання.

Кожная работа, і мая таксама, патрабуе аддавацца сябе, калі ты хочаш стаць прафесіяналам. Ты жывеш работай, пастаянна вучышся, вывучаеш чыйсьці вопыт, чытаеш шмат літаратуры, маеш зносіны з калегамі. Ты заўсёды ў руху. Нельга адбыцца ў прафесіі, знаходзячыся на адной планцы, трэба ўдасканальвацца.

Я ганаруся тым, што магу спалучаць жаноцкасць, сям'ю і службу. Я атрымліваю задавальненне і ад аднаго, і ад другога».

Вольга НЯФЁДАВА, актрыса Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы (атрымала медаль Францыска Скарыны): «Для ўсіх было дзіўна, што мы ўсё-ткі адкрылі 101-ы сезон 3 сакавіка пасля сямі месяцаў, калі павінна было адбыцца адкрыццё. Як учора прымаў нас глядач — нешта неверагоднае! Мы жартавалі, што, мабыць, так «Паўлінку» прымалі толькі ў 1944 годзе. Людзі не адпускалі, крычалі «Дзякуй». Мы ўсе былі кранутыя да слёз, бо была зроблена вялікая работа. Нас засталося мала, каб выпусціць спектакль. Я думаю, усё напярэдзе... Для маладых рабят гэта было баявое хрышчэнне. Яны казалі, што такога не чакалі, дзякавалі за магчымасць выходзіць на гэтую сцэну».

Мікалай КАРПЯНКОЎ, намеснік міністра ўнутраных спраў — камандуючы ўнутранымі войскамі (яму прысвоена званне генерал-маёра): «Адчуваю хваляванне і гордасць. Гордасць за калектыў, якім кіраю. Унутраныя войскі — асноўная сіла і магутнасць Міністэрства ўнутраных спраў. Там служаць самыя адданыя і надзейныя абаронцы нашай Айчыны. Перадусім маё званне — заслуга калектыву, якім я кіраю. Ён гатовы з поспехам выканаць усе адказныя задачы, якія перад намі паўсталі. Мы, камандзіры, выконвалі складаныя задачы, не баяліся рызыкаваць, хацелі наступаць, перамагаць, хацелі хуткага навядзення парадку. Мы адчувалі, што кіраўнік краіны ўсё трымае пад кантролем, валодае абстаноўкай. Мы бачылі разумныя рашэнні і атрымлівалі дакладныя загады, а ў самыя складаныя моманты кіраўнік дзяржавы разам з намі знаходзіўся ў баявым парадку, дэманструючы сабою мужнасць і прыклад таго, як трэба любіць і абараняць сваю Радзіму. Такім чынам, аб'яднаўшыся, мы прыйшлі да перамогі.

Хачу сказаць, што наш абавязак перад сённяшнім і будучым пакаленнямі — захаваць краіну, і мы яе захаваем, чаго б гэта ні каштавала. Усведамляем свой абавязак па ахове бяспекі нашай Радзімы, захаванні нацыянальнага суверэнітэту. Мы гатовыя да выканання задач любой складанасці».

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Эксперты Bloomberg назвалі галоўны драйвер аднаўлення сусветнай эканомікі

Згодна з данымі агенцтва, за час пандэміі каранавіруса спажыўцы ў найбуйнейшых эканоміках планеты назапасілі каля 2,9 трыльёна долараў. Толькі ў грамадзян ЗША такіх назапашванняў $1,5 трлн, што перавышае сярэднегадавы рост ВУП краіны, а таксама з'яўляецца эквівалентам гадавога аб'ёму вытворчасці Паўднёвай Карэі. Эксперты адзначаюць, што гэта вялікія грошы. І менавіта яны стануць асноўным драйверам для вяртання глабальнай эканомікі да даковідных паказчыкаў. На думку спецыялістаў, апытаных агенцтвам, гэтыя грошы будуць выдаткаваны на шопінг, рэстараны, турызм, забавы і спорт. Шэраг экспертаў лічыць, што людзі накіруюць назапашаныя сродкі на пакрыццё даўгоў.

Volvo поўнасцю пяройдзе на вытворчасць электрамабіляў

Шведскі аўтаканцэрн Volvo Cars мае намер да 2030 года поўнасцю перайсці на вытворчасць электрамабіляў. Аб гэтым паведаміла Financial Times са спасылкай на заяву кампаніі. «Кліент заўсёды мае рацыю, але я абсалютна перакананы, што [да канца дзесяцігоддзя] не застанецца кліентаў, якія сапраўды хацелі б машыну з бензінавым рухавіком», — заявіў гендырэктар канцэрна Хакан Самуэльсан. Кампанія таксама плануе прадаваць усе свае машыны анлайн, самастойна кантраляваць цэнаўтварэнне і адмовіцца ад супрацоўніцтва з аўтадылерамі. «Мы хочам мець трывалыя адносіны з кліентамі, якія непасрэдна выкарыстоўваюць нашы аўтамабілі», — адзначыў Самуэльсан. Volvo не першы з сусветных аўтавытворцаў заявіў пра намер перайсці на выпуск выключна электрамабіляў. Раней аб пераходзе на вытворчасць электракараў ужо да 2025 года паведаміў Jaguar Land Rover.

У Аргентыне знайшлі астанкі найстаражытнейшага тытаназаўра

Палеантолагі знайшлі ў аргентынскай Патагоніі астанкі самага старажытнага тытанозаўра ў свеце, паведамляе CNN. Навукоўцы выявілі акамянелыя косткі буйной траваеднай жывёлы на поўдні горада Неукен. Адзначаецца, што старажытны яшчар дасягаў у даўжыню 20 метраў, узрост акамянеласцяў склаў 140 мільёнаў гадоў. Дзякуючы знаходцы стала відавочна, што тытанозаўры існавалі нашмат раней, чым меркавалася да гэтага. «Рэшткі знаходзяць у розных канцах свету, але тыя, аб якіх было вядома раней, былі бліжэйшыя да сучаснасці, чым новая знаходка», — расказаў адзін з даследчыкаў.

Блізкая ўлада

ВЯСНА ЗВАНКОЎ НЕ АДМЯНЯЕ

Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 6 сакавіка, з 9.00 да 12.00 правядуць:

- намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Генадзь Іосіфавіч БАРЫСЮК. Тэл. 8 016 221 31 21;
- кіраўнік спраў Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Анатолевіч БАРАНОЎСКІ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар Францавіч ПРАНЮК. Тэл. 8 015 273 56 44;
- намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Анатолевіч МАЛАШКА. Тэл. 8 022 250 18 69;
- намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Мікалай Міхайлавіч РАГАШЧУК. Тэл. 8 017 500 41 60;
- намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Аляксандр Вікенцьевіч ДАРАХОВІЧ. Тэл. 8 017 222 44 44

Вынікі і планы

ЗАРОБКІ І ПЕНСІІ ПАВІННЫ ВЫРАСЦІ, БЕСПРАЦОЎЕ — ЗМЕНШЫЦЦА

Зарплаты ў медыкаў, настаўнікаў і іншых работнікаў бюджэтнай сферы ў найбліжэйшыя пяць гадоў павінны вырасці. Стымуляваць да работы незанятых у эканоміцы грамадзян плануецца эканамічнымі механізмамі. Нязменнай застаецца і задача дасягнуць 40-працэнтных суадносін пенсій да сярэдняй зарплаты. Як паведамляе БелТА, на выніковай калегіі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны паставілі новыя задачы на найбліжэйшую пяцігодку і расказалі пра выкананне папярэдніх планаў.

ЗАРПЛАТА Ў НАЙБЛІЖЭЙШАЙ ПЯЦІГОДЦЫ ВЫРАСЦЕ

Зарплата ў краіне ў намінальным выражэнні вырасла за пяцігодку ў 1,9 раза, у бюджэтнай сферы — гэтак жа. Суадносіны зарплаты ў бюджэтнай сферы да сярэдняй зарплаты па краіне на канец 2020 года складалі 80,4 %. Такім чынам, узровень заробкаў бюджэтнікаў дасягнуў адной тысячы рублёў.

На новую пяцігодку даведзены новыя параметры, прычым па асобных катэгорыях работнікаў бюджэтнай сферы. Так, урачы і прафесарска-выкладчыцкі састаў павінны атрымліваць 150 % сярэдняй зарплаты па краіне, настаўнікі — амаль 106 %, работнікі фізічнай культуры і спорту — 105 %, педагагічныя работнікі — 100 %, сярэдні медперсанал — 90 %, работнікі сацыяльнай абароны, культуры — 80 %.

Як сказала міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына Касцевіч, у рэальным выражэнні зарплата ў бюджэтнай сферы вырасце ў сярэднім у 1,3 раза.

СТЫМУЛЯВАЦЬ ДА РАБОТЫ БУДУЦЬ ЭКАНАМІЧНЫМІ МЕХАНІЗМАМІ

Узровень беспрацоўя ў Беларусі знізіўся з 5,8 % у 2016 годзе да 4 % па выніках 2020 года. «Узровень занятасці ў 83 % — гэта высокі паказчык», — падкрэсліла міністр.

Сістэма органаў занятасці працягне займацца грамадзянамі, якія з'яўляюцца як актыўнымі беспрацоўнымі, так і пасіўнымі. За мінулую пяцігодку ўдалося працаўладкаваць больш за 740 тысяч чалавек. Прафесійную падрыхтоўку прайшло каля 40 тысяч беспрацоўных, больш за 9 тысяч атрымала фінансавую падтрымку для адкрыцця сваёй справы.

— Частка грамадзян прыходзіць у службу занятасці, частка знаходзіць работу самастойна. Для гэтага ёсць і агульнарэспубліканскі банк вакансій, дзе на сённяшні дзень 74 тысячы вакансій, і паслугі амаль 200 агенцтваў па працаўладкаванні, — пералічыла Ірына Касцевіч. Яна падкрэсліла, што працаваць плануецца і з пасіўнымі грамадзянамі: праз навучанне, перападрыхтоўку, пошук работы ў наймальніка. Але перш за ўсё павінна быць цікавасць у самога чалавека. І каб прастымуляваць чалавека да работы, будуць дзейнічаць эканамічныя механізмы.

— Калі мы па базе незанятых у эканоміцы бачым, што ёсць людзі, якія не працуюць па 10–15 гадоў, гэта выклікае заклапочанасць. У тым ліку таму, што, хутчэй за ўсё, яны занятыя ў ценявым бізнесе. Наша задача — легалізаваць іх працоўную дзейнасць, растлумачыўшы, што гэта ў тым ліку іх будучыя пенсійныя гарантыі.

ЗМЯНЕННІ Ў ПРАЦОЎНЫМ КОДЭКСЕ

У студзені 2020 года запрацаваў вялікі блок змяненняў, унесеных у Працоўны кодэкс. Закладзены і заканадаўча замацаваны такія важныя нововвядзенні, як дыстанцыйная занятасць і часовы перавод работніка на іншую работу з яго згоды на тэрмін да шасці месяцаў за год. З'явілася і такая норма, як тры дні адпачынку для работніка без дакументаў, якія пацвярджаюць хваравіты стан. Гэтыя змены прыйшліся да месца падчас складанай эпідсітуацыі. Ёй жа было абумоўлена і прынятае Указа № 178, накіраванага на падтрымку калектываў і асобных людзей. Гэта даплата з бюджэту да мінімальнай зарплаты і ўзмацненне дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі людзям, у якіх сярэднедушавы даход ніжэйшы за бюджэт пражыткоўка мінімуму. Амаль 55 тысяч чалавек атрымалі фінансавую падтрымку на агульную суму восем мільёнаў рублёў.

ДАСЯГНУЦЬ 40-ПРАЦЭНТНЫХ СУАДНОСІН ПЕНСІЙ ДА ЗАРПЛАТЫ

На 2021 год запланавана амаль 15 мільярдаў на выплату пенсій (гэта каля 9 % ВУП). На пенсійным фондзе вялікая нагрузка з улікам таго, што 27 % грамадзян краіны з'яўляюцца атрымальнікамі з яго. На люты, па словах Ірыны Касцевіч, сярэдні памер пенсіі склаў 513 рублёў. І хоць так і не атрымалася дасягнуць суадносін памеру сярэдняй пенсіі да памеру сярэдняй зарплаты ў 40 %, на працягу пяцігодкі паказчык набліжаўся да гэтага значэння. Задача на новую пяцігодку не здымаецца.

«Але мы павінны разумець, што на гэтыя суадносіны ўплываюць не толькі тыя грошы, якія накіроўваюцца на выплату пенсій. Гэта залежыць яшчэ і ад партрэта пенсіянера. Чым больш у сістэму будзе прыходзіць пенсіянераў, у якіх была высокая зарплата, вялікі стаж, тым лягчэй забяспечыць гэтыя 40-працэнтныя суадносіны», — падкрэсліла міністр.

Насельніцтва Беларусі няўмольна старэе, як і ў большасці краін свету. Людзей ад 65 гадоў і старэйшых ужо больш за 15 %. Па прагнозах, да 2030 года кожны пяты жыхар нашай краіны перасягне 65-гадовую мяжу.

У 2020 годзе ў Беларусі прынята Нацыянальная стратэгія «Актыўнае даўгалецце — 2030», якая дасць магчымасць не толькі змякчыць наступствы старэння насельніцтва, але і выкарыстаць патэнцыял пажылых грамадзян. Будуць створаны ўмовы для больш працяглага працоўнага жыцця праз рэалізацыю прынцыпу «адукацыя праз усё жыццё», развіццё медыка-сацыяльнай і герыятрычнай дапамогі, сацыяльнага абслугоўвання. Тым часам, усё больш пажылых людзей будзе мець патрэбу ў доглядзе і клопаце.

У Беларусі функцыянуюць 92 дамы-інтэрнаты і 146 тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання. Больш за 130 тысяч чалавек атрымлівае сацыяльныя паслугі дома, у дамах-інтэрнатах пражывае больш за 20 тысяч.

У плане на новую пяцігодку — унесці сур'ёзныя змяненні ў Закон «Аб сацыяльным абслугоўванні».

— Неабходны новыя сучасныя падыходы: па вызначэнні патрэб, па ўключэнні ў аказанне сацыяльных паслуг прыватнага камерцыйнага сектара, які ўжо развіваецца. Мы павінны бачыць такога партнёра і працаваць з гэтым сегментам, — паясніла Ірына Касцевіч. — Будзем пераймяноўваць дамы-інтэрнаты, ухараняць сучасныя паслугі.

Надвор'е

ВОДГУЛЛЕ АД СКАНДЫНАЎСКАГА «ДЫХАННЯ»

Вось і не адгадаў каляндар з вясновым надвор'ем: уначы істотна прымарозіць і будзе снег...

Здаецца, усё проста — прыйшла вясна, прынесла цяпло. Усё так, ды не так. Яшчэ ў канцы лютага і ў першых чыслах сакавіка ў нашай краіне быў павышаны тэмпературны рэжым. Аднак у атмасферы намеціліся змены. Днямі да паўночных раёнаў Беларусі падышоў халодны атмасферны фронт. Ссоўваючыся на поўдзень, ападкаў ён прынясе няшмат. Але ўслед за ім распаўсюдзіцца халоднае паветра, і тэмпературны фон наблізіцца да кліматычнай нормы, якая характэрная для гэтых дзён сакавіка. А мы прывыклі, што бойкая вясна надыходзіць хутка, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Сёння ўдзень месцамі па Беларусі пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе снегу і мокрага снегу. Максімальная тэмпература паветра будзе ад мінус 2 градусаў да 4 цяпла. А вось у суботу надвор'е ў краіне абумовіць халодная няўстойлівая паветраная маса, якая перамяшчаецца са Скандынаўскага паўвострава. Будзе воблачна з праясненнямі. У асобных раёнах пройдзе невялікі кароткачасовы снег. На дарогах месцамі чакаецца галалёдзіца. Вецер прагназуецца заходні, паўночна-заходні ўмераны, удзень па поўначы парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе 3—9 марозу, пры праясненнях — да мінус 11 градусаў. Удзень будзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў.

У нядзелю краіна апынецца пад уплывам атмасферных франтоў ад атлантычнага цыклона, які ссоўваецца з боку поўначы Скандынаўскага паўвострава на Валагодскую вобласць Расіі. Беларусь пры гэтым апынецца ў яго ветранай частцы. У многіх раёнах чакаецца моцны парывісты вецер заходняга напрамку. Уначы месцамі, раніцай і ўдзень на большай частцы краіны пройдзе кароткачасовы снег, мокры снег. На асобных участках дарог магчымая галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да мінус 6 градусаў, удзень будзе ад мінус 1 градуса да 4 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, 8 сакавіка не чакаецца цёплага надвор'я, але паступова сціхне вецер. Уначы на большай частцы краіны, а ўдзень месцамі пройдзе кароткачасовы снег. На асобных участках дарог магчымая галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўночны, паўночна-заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—9 марозу, у паўночных раёнах пры праясненнях будзе падмарожваць да мінус 10—12 градусаў. Удзень будзе ад мінус 6 градусаў па поўначы да 2 цяпла па поўдні краіны.

Сяргей КУРКАЧ.

АМБІЦЫЙНЫЯ ЗАДАЧЫ ПА ЗАРОБКАХ

У 2020 годзе забяспечаны прырост узроўню даходаў насельніцтва

Гэта адзначыў намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА на пасяджэнні калегіі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, як перадае прэс-служба ўрада.

«Летась устойліва павышалася заработная плата. Яе рэальны рост па эканоміцы ў цэлым склаў 108,2 працэнта, па бюджэтнай сферы — больш за 113 працэнтаў. Выкананы галоўны мэтавы арыенцір — суадносіны зарплаты бюджэтнікаў да сярэдняй па краіне перавысілі 80 працэнтаў. Практычна цалкам вырашылі задачу па зніжэнні колькасці арганізацый з заробкам менш за 500 рублёў», — сказаў віцэ-прэм'ер.

Статыстыка за студзень гэтага года сведчыць, што яшчэ даволі значная колькасць арганізацый знаходзіцца ў памежным стане і не мае ўстойлівага перавышэння над зададзеным параметрам.

Па словах Ігара Петрышэнкі, сёлета задача больш амбіцыйная — «падцягнуць» зарплату ў арганізацыях, у якіх яна не перавышае сярэднюю па галіне.

«Што датычыцца бюджэтнай сферы, то тут патрэбна выразная стратэгія, як будзем рухацца далей. Мэтавыя задачы вызначаны, у тым ліку па асобных катэгорыях работнікаў — педагогам, урачам і іншым. Цалкам відавочна, што тут прыйдзецца задзейнічаць усе магчымыя крыніцы і рэзервы — ад развіцця падатковага бюджэтнай дзейнасці да аптымізацыі сеткі і пераходу на нарматыўна-мэтавы прынцып бюджэтавання галін», — заявіў намеснік прэм'ер-міністра.

Таксама ён падкрэсліў, што ключавым кірункам работы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны ў бягучай пяцігодцы застаецца выпрацоўка эфектыўных мер дзяржаўнай падтрымкі сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей. На VI Усебеларускім народным сходзе Прэзідэнтам даручана распрацаваць праграму «Шматдзетная Беларусь» і напоўніць яе дзейснымі мерамі.

Акрамя таго, намеснік прэм'ер-міністра дадаў, што найважнейшым інструментам падтрымкі грамадзян, якія апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, з'яўляецца сістэма дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі. Толькі за 2020 год яе атрымальнікамі стала звыш 305 тыс. чалавек, што на 3,5 працэнта больш у параўнанні з 2019 годам.

Ігар Петрышэнка звярнуў увагу на далейшае ўдасканаленне пенсійнай сістэмы — кожны чацвёрты жыхар нашай краіны сёння з'яўляецца атрымальнікам гэтых выплат.

«Расходы Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва на названыя мэты перавысілі ў 2020 годзе 13,3 млрд рублёў. Гэта больш за 9 працэнтаў ВУП. У няпростых эканамічных умовах не дапушчана зніжэння пакупніцкай здольнасці пенсій. Іх рост у рэальным выражэнні забяспечаны на ўзроўні 4 працэнтаў», — адзначыў віцэ-прэм'ер.

Ён звярнуў увагу на пытанні, якія датычацца сацыяльнай дапамогі і сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. На яго думку, актуальнасць і значнасць гэтых пытанняў для эканомікі і грамадства будзе толькі нарастаць, бо да 2030 года кожны пяты жыхар нашай краіны перасягне 65 гадоў.

Ведай нашых!

«Плацдарм» — найлепшы праект

У Мінску былі падведзены вынікі штогадовага творчага конкурсу на найлепшае асвятленне ў сродках масавай інфармацыі пытанняў будаўніцтва і развіцця Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Заснавальнікамі конкурсу з'яўляюцца міністэрствы абароны і інфармацыі. За час яго існавання ў ім паўдзельнічалі дзясяткі журналістаў. Яны працуюць на тэлебачанні, на радыё, у газетах і ў электронных рэсурсах.

Сярод намінантаў — загадчык аддзела РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» Валяр'ян Шкленнік. Укладка «Плацдарм», якую ён вядзе, адзначана першай узнагародай у намінацыі «Спецыяльны праект».

Ёсць нагода

«Жанчыны Беларусі ўнікальныя і непаўторныя»

Сёння свой 20-гадовы юбілей святкуе самая вялікая арганізацыя Беларускага саюза жанчын — аб'яднаная арганізацыя ААТ «ААБ Беларусбанк». Яна аб'ядноўвае тысячы супрацоўніц гэтай установы ў розных пунктах краіны. Пра ініцыятывы і добрыя справы, якія штодзень ладзяць актыўныя і неабыякавыя жанчыны, мы паразмаўлялі з кіраўніком арганізацыі Алай РАЙЦЭС.

— Ала Аляксандраўна, ваша арганізацыя з'яўляецца самай буйной у Беларускім саюзе жанчын. Як яна стваралася?

— Першае структурнае падраздзяленне Беларускага саюза жанчын у банку было створана ў цэнтральным апараце (цяпер гэта галаўны офіс) 5 сакавіка 2001 года і налічвала 76 членаў. Ідэйнай натхняльніцай жаночага руху ў нашай сістэме стала Надзея Андрэеўна Ермакова, а першым і доўгі час нязменным яе кіраўніком была Наталля Іванаўна Петрачкова.

«Пярвічка» расла, і 15 гадоў таму стала аб'яднанай арганізацыяй ААТ «ААБ Беларусбанк» грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын», якая складаецца са 128 пярвічных арганізацый, у тым ліку створаных у дачыных кампаніях банка — «ААБ Лізінг», «ААБ Кансалт», «Санаторый Спадарожнік». Сёння ў арганізацыі 7 752 жанчыны, а гэта, між іншым, амаль у тры разы больш, чым у наступнай за намі па колькасці арганізацыі.

— Беларускі саюз жанчын вядомы сваімі дабрачыннымі мерапрыемствамі. Якія ініцыятывы рэалізуе ваша арганізацыя?

— Аб'яднаная арганізацыя банка аказвае дапамогу хворым, а таксама дзецям, жанчынам і іншым катэгорыям грамадзян, якія трапілі ў цяжкую жыццёвую сітуацыю. Таксама садзейнічаем жанчынам у абароне іх правоў і законных інтарэсаў, павышэнні іх ролі ў грамадскім, эканамічным, сацыяльным і культурным жыцці банка. Наша арганізацыя ўзяла актыўны ўдзел у акцыі «Марафон падтрымкі» па аказанні дапамогі медыцынскім работнікам ва ўмовах пандэміі COVID-19, у навагодняй дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» ў сацыяльных прытулках, дзіцячых дамах, дамах сямейнага тыпу (банк, дарэчы, пабудаваў і курыруе 16 такіх дамоў). У рамках гэтай акцыі нашы жанчыны наведалі 229 устаноў, а падтрымка аказана на 56,5 тысячы рублёў. Штогадовымі і традыцыйнымі сталі акцыі «Дабро не мае межаў» (яна ахоплівае дзяцей-сірот памерлых работнікаў банка, а ў нас іх 52), «Збяром партфель разам». Арганізацыя цесна супрацоўнічае з Рэспубліканскім рэабілітацыйным цэнтрам для дзяцей-інвалідаў. Дзевяць дзяцей-інвалідаў работнікаў банка з розных рэгіёнаў прайшло бясплатную медыцынскую рэабілітацыю ў гэтай установе.

У лютым 2021 года пярвічныя арганізацыі Саюза жанчын банка правялі акцыю «Марафон добрых спраў» для падтрымкі ўразлівых слаёў насельніцтва і бяздомных жывёл. Марозная зіма сама падказала вектар работы. Былі сабраны прадметы першай неабходнасці, пасцельныя рэчы, зімовая вопратка і абутак, якія перадалі манастырам і касцёлам, у дамы начнога знаходжання, сем'ям, што маюць патрэбу, дамам сямейнага тыпу і спецыяльным інтэрнатам. Калегі-мужчыны, акрамя матэрыяльнай падтрымкі, дапамаглі нам з пагрузкай і дастаўкай сабраных рэчаў і корму для жывёл у рэгіёны. Дастаўляць, дарэчы, давялося грузавым транспартам. Для бяздомных жывёл мы перадалі ў зоабарончыя арганізацыі, дзяржаўныя прадпрыемствы і валанцёрам сотні кілаграмаў кармоў, лекі, вакцыны, латкі, сурвэткі, памперсы. Многіх жывёл удалося ўладкаваць, напрыклад у Воранаве знайшлі прытулак для кацянят. Наша ініцыятыва ўразіла многіх, нам дагэтуль тэлефануюць і пытаюць, як можна забраць тую ці іншую жывёлу.

— Вы былі дэлегатам VI Усебеларускага народнага сходу. Падзяліцеся ўражаннямі, што з агучаных ініцыятыў актуальна і цікава для Беларускага саюза жанчын, ды і для жанчын у цэлым.

— Прэзідэнт сказаў: «Як толькі нас падзеляць у нашым уласным доме — мы будзем асуджаны, мы загінем. Мы не павінны дапусціць гэтага падзелу. Трэба сціснуць зубы, сабрацца і перажыць гэты складаны і нявызначаны перыяд».

Гэтыя словы запалі ў душу і не пакінулі абыякавымі ў зале ніводнага чалавека, у тым ліку жанчын. «Пакуль мы адзіныя — мы непераможныя» — гэта не проста лозунг. У ім закладзены глыбокі сэнс, гістарычны вопыт і гістарычная памяць нашага народа. У процівагу яму можна згадаць іншы, уласціывы захопнікам — «Падзяляй і ўладар». Пакуль мы ўсе разам (няхай розныя, няхай у кожнага свае мэты і погляды), мы можам многае: захаваць цэласнасць і незалежнасць краіны, прызнаць памылкі і пайсці далей. У адваротным выпадку нас напаткае лёс суседніх краін, якія страцілі тэрыторыі і трапілі ў залежнасць ад іншых дзяржаў (як Украіна, Грузія).

Многія блізкія нам прыгранічныя краіны страцілі да 40 % насельніцтва сваёй тэрыторыі за кошт працоўнай міграцыі. Насельніцтва з'ехала за мяжу ў пошуках работы і, як правіла, гэта моладзь. Але кім яны працуюць? У большасці сваёй на рабочых месцах, якія не патрабуюць высокай кваліфікацыі, з невысокай аплатай. Скажыце, якая жанчына застанецца абыякавая да таго, што адбываецца? Хто з нас захоча адправіць «на бойню» або ў працоўнае рабства свайго мужа ці дзяцей?

Жанчыны Беларусі мудрыя і справядлівыя. Па сваёй сутнасці жанчына — стваральніца, а не разбуральніца, яна цэнтр сусвету. Яна заклікана нараджаць і выхоўваць дзяцей, уладкоўваць дом, клапаціцца пра старых і дапамагаць слабым. Веру, што жанчыны не дапусцяць расколу нацыі і распаду краіны, страты дома і сваёй сям'і.

— Сімвалічна, што юбілей самая буйная арганізацыя Беларускага саюза жанчын святкуе напярэдадні Міжнароднага жаночага дня. Што пажадаеце свайм калегам і ўсім жанчынам?

— Ад усёй душы віншую кожную жанчыну з Міжнародным жаночым днём! Я не перастану паўтараць, што жанчыны Беларусі самыя адукаваныя і разумныя, самыя ініцыятыўныя і таленавітыя, самыя ўнікальныя і непаўторныя, адкрытыя і добрыя, цярплівыя і мудрыя. Нідзе такіх больш няма.

Незалежна ад прафесіі і пасады, жанчыны краіны не баяцца цяжкасцяў, заўсёды гатовыя прыйсці на дапамогу, узяць на сябе адказную і складаную работу і давесці даручаную справу да канца! Я перакананна, што ўсе памкненні жанчын ідуць ад чыстага сэрца і з найлепшымі намерамі. І будзьце ўпэўненыя, што ўсё добра, якое жанчына нясе навакольным, абавязкова ёй вернецца.

Няхай усе выдатныя якасці кожнай з нас, памножаныя на тысячы, і ў будучыні застаюцца візітнай карткай жанчын нашай краіны. З надыходзячым святам вясны! Усміхайцеся і радуйцеся кожнаму дню!

Алена КРАВЕЦ.

Лічбы і факты

ВА ЎСІХ СФЕРАХ ДЗЕЙНАСЦІ

Прадстаўніцы прыгожай палавіны рэалізуюць сябе не толькі ў сям'і

У гэтым годзе на праграмным узроўні будуць рэалізоўвацца меры для павышэння статусу жанчын у грамадстве і забеспячэння гендарнай роўнасці. Пра гэта паведаміў журналістам намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валерый КАВАЛЬКОЎ.

Фота Белта.

Сёння жанчыны складаюць больш за 55 % ад агульнай колькасці работнікаў і рэалізоўваюць сябе практычна ва ўсіх сферах дзейнасці. Каля 40 % працуючых жанчын мае вышэйшую адукацыю, амаль палова кіраўнікоў — жанчыны, сярод спецыялістаў — 73 %.

«Дзяржава робіць нямала для павышэння статусу жанчын, паляпшэння ўмоў працы, павышэння эканамічнай актыўнасці, а таксама аховы іх здароўя. На 2021 год запланаваны шэраг нарматыўна-прававых актаў, якія будуць спрыяць вышэйзгаданаму. Гэта ў першую чаргу нацыянальны план дзеянняў па забеспячэнні гендарнай роўнасці і дзве дзяржаўныя праграмы: «Рынак працы і садзейнічанне занятасці» і «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека». Дадзеныя праграмныя дакументы маюць на ўвазе пашырэнне эканамічных магчымасцяў жанчын — садзейнічанне ім у развіцці прадпрымальніцтва, у тым ліку ў сельскай мясцовасці», — сказаў Валерый Кавалькоў.

Нацыянальны план дзеянняў зацвярджаецца на пяць гадоў, і гэта ўжо шосты план. Адна з Мэт устойлівага развіцця — забеспячэнне гендарнай роўнасці. У адпаведнасці з гэтым і нацыянальны план будзе ўключаць у сябе пералік мерапрыемстваў па гарантаванні жанчынам пэўных эканамічных, сацыяльных прэферэнцый.

Адна з дзейсных мер — выдзяленне дзяржавай бязвыплатных субсідый. Летась амаль 45 % тых, хто атрымаў субсідыі на адкрыццё сваёй справы, склалі жанчыны. А за мінулыя пяць гадоў 3,7 тыс. жанчын атрымалі субсідыю і змаглі пачаць сваю справу. Бізнес-лэдзі выбіраюць самыя розныя сферы дзейнасці — аказанне цырульніцкіх паслуг, арганізацыя кафэ і г. д. Перад гэтым будучыя прадпрымальніцы праходзяць неабходнае навучанне па менеджменце, атрымліваюць дапамогу ў складанні бізнес-плана.

Банк развіцця Беларусі таксама падключаецца да падтрымкі жаночага бізнесу — у мінулым годзе прафінансавана 73 такія праекты на суму Br9,5 млн.

Развіваюцца і механізмы рэінтэграцыі жанчын на рынку працы. У мінулым годзе на прафесійную падрыхтоўку і перападрыхтоўку было накіравана 1,7 тыс. беспрацоўных жанчын. А за апошнія пяць гадоў звыш 14 тыс. жанчын прайшло перападрыхтоўку і змагло стаць больш запатрабаванымі на рынку працы. Каб жанчыны ў дэкрэтным водпуску не страчвалі навыкі, прывабнасць для наймальнікаў у прафесійным плане, дадзена магчымасць павышаць сваю кваліфікацыю ў гэты перыяд. За пяць гадоў 343 жанчыны ў перыяд знаходжання ў водпуску па доглядзе за дзіцем прайшлі курсы павышэння кваліфікацыі, пры гэтым яшчэ і атрымлівалі стыпендыю.

Летась дыстанцыйная работа атрымала прававую аснову — гэта таксама адкрыла дадатковыя перспектывы для жанчын.

Намеснік міністра падкрэсліў, што апошнія восем гадоў узровень беспрацоўя сярод жанчын стабільна нізкі. Але пры гэтым застаецца актуальная праблема двайной занятасці жанчын: на рабоце і дома. Менавіта на яе рашэнне і будуць накіраваны максімальныя намаганні — як заканадаўчыя, так і інфармацыйныя.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Раскажы пра «Жанчын-легенд»

Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі дае старт рэспубліканскаму інтэрнэт-праекту з такой цудоўнай назвай. Ён прымеркаваны да Дня жанчын і будзе рэалізаваны ў афіцыйных пабліках БРСМ у сацыяльных сетках з 4 сакавіка да 31 мая.

Саюз моладзі раскажа інтэрнэт-аўдыторыі гісторыі пра нашых зямлячак, што прыўнеслі ў маладзёжную палітыку краіны сплаў мудрасці і вопыту, які яны і сёння перадаюць новым пакаленням. Гераінямі праекта «Жанчыны-легенды» стануць як кіраўнікі маладзёжнага руху, так і тыя, хто распачынаў дзейнасць студэнцкіх атрадаў і ўсё сваё жыццё быў побач з моладдзю. Сярод іх — Рэўміра Піёнава, Вера Пракашава, Жанна Булыга, Ірына Енджаеўская і многія іншыя.

Жанчына заўсёды асацыюецца з прыгожай парой года і гармоніяй. Таму праект, прымеркаваны да 8 Сакавіка, будзе доўжыцца ўсю вясну. З публікацыямі пра гераінь можна будзе пазнаёміцца ў цэнтральных, абласных, раённых групах Саюза моладзі ва «УКантакце», Instagram, Telegram. Публікацыі аб'яднае хэштэг #женщинылегенды. Далучыцца да праекта і расказаць гісторыі пра жанчын-легенд можа кожны ахвотны. У БРСМ будуць удзячныя, калі карыстальнікі сацсетак пашыраць тэму і раскажуць пра выдатных жанчын розных прафесій.

Сяргей РАСОЛЬКА.

РАМАН З ЭПІГРАФІКАЙ...

Іна Леанідаўна Калечыц — аўтар манаграфіі «Эпіграфіка Беларусі X—XIV стст.». Сёлета ў маскоўскім выдавецтве выйдзе «Корпус графіці Спаса-Праабражэнскай царквы г. Полацка» — каталог з фатаграфіямі і прамалёўкамі кожнага надпісу, тлумачэннем яго зместу і ўказаннем часу і аўтарства.

ЗНАЙСЦІ СВАЁ ПРЫЗВАННЕ

— Навукай занялася нечакана для сябе, — прызнаецца Іна Леанідаўна. — Я філолаг па спецыяльнасці, выкладчык рускай мовы і літаратуры. Выйшла замуж, нарадзіла дзвюх дачок і была цалкам сабой задаволеная. Калі другі дэкрэтны адпачынак падышоў да канца, хацела вярнуцца ў школу, але мяне не ўзялі, палічыўшы, мусіць, што ад мамы дваіх маленькіх дзяцей больш клопатаў, чым толку. Тады ўладкавалася лабаранткай на кафедру дапаможных дысцыплін і методыкі выкладання гісторыі БДПУ імя М. Танка. Археолаг Леанід Уладзіміравіч Калядзінскі, ведаючы пра мой валанцёрскі вопыт удзелу ў археалагічных раскопках, параіў паступіць у аспірантуру і заняцца вывучэннем эпіграфічных крыніц.

Так пачаўся яе «раман» з эпіграфікай. Тады Іна Леанідаўна нават не ўяўляла, якія складанасці чакаюць яе наперадзе. Можа, таму і не спалохалася асвойваць навуковую «цаліну». А потым настолькі захапілася работай, што ўжо гатова была пераадольваць любыя цяжкасці. Летась ёй упершыню выдзелілі фінансаванне даследаванняў. Да гэтага Іна Калечыц сама зарабляла на тое, каб праводзіць іх. У некаторыя гады ў Полацку, дзе вывучала графіці ў Спаса-Праабражэнскай царкве, праводзіла часу больш, чым у Мінску. У тым ліку і свае адпачынкі. Добра, што дазволілі жыць пры манастыры, дый харчавалася ў яго трапезнай.

Хтосьці зверху, відавочна, спрыяў таму, каб Іна Калечыц і эпіграфіка знайшлі адзін аднаго. Веданне старажытнарускай, стараславянскай моў, гісторыі, здольнасці да малявання, любоў да фатаграфіі — усё гэта вельмі дапамагло маёй гераіні ў яе навуковых даследаваннях.

— Надпісы важна не толькі прачытаць, але і датаваць, — адзначае Іна Калечыц. — Паколькі дат, асабліва ў раннім Сярэднявеччы, не ўказвалі, даводзіцца звяртацца да палеаграфіі, якая займаецца графікай літар, і мовазнаўства, якое вывучае моўныя асаблівасці. Наогул навука сёння міждысцыплінарная. Даводзіцца ўвесь час папаўняць веды. Вельмі дапамагаюць у рабоце новыя тэхналогіі. Напрыклад, фотаграмметрыя дорыць новыя магчымасці фіксацыі надпісаў. Не заўсёды атрымліваецца вывучаць графіці на месцы. Тады фатаграфуеш і даследуеш іх дыстанцыйна.

СКРАДЗЕНЫЯ ПРАСЛІЦЫ

— Першыя гады я аналізавала надпісы, зробленыя на археалагічных артэфактах (усяго крыху больш за 100), якія захоўваюцца ў музеях, — расказвае Іна Леанідаўна. — Нашы продкі часта адзначалі на прадметах іх прыналежнасць. Гэта даказвае: у XII—XVII стагоддзях пісьменныя былі прадстаўнікі розных саслоўяў.

Напрыклад, імёны сустракаюцца на прасліцах — грузіках для верацяна, якое ўжывалася пры ткацтве. Інструмент бралі на вячоркі і прасліцы падпісвалі, каб не пераблытаць з чужымі. Запомніліся прасліцы з Пінска з надпісам «Бабіна» і з Полацка — «пататныя», што на старажытнарускай азначае «выкрадзеныя».

Сустракаюцца імёны і на амфарах — гліняных гарлачах, прывезеных з Візантыі. Надпісы на камянях — напрыклад, Барысавых або на Варацішыным крыжы — таксама прыклад эпіграфікі.

ЗАГАДКІ НА СЦЕНАХ ХРАМА

Даследаваць графіці Спаса-Праабражэнскай царквы ў Полацку Іна Калечыц пачала ў 2012 годзе, як толькі рэстаўратары знялі са сцен храма алейны жывапіс, пад якім яны і хаваліся. Займаецца Іна Леанідаўна іх вывучэннем да гэтага часу.

— Вельмі карпатлівая праца — кожная літара патрабуе пільнай увагі, — падкрэслівае мая суразмоўніца. — З моманту пабудовы храма ў XII стагоддзі і да 1842 года на яго паверхнях пакінулі каля 4 тысяч самых розных надпісаў. Часам адзін накладваецца на другі, цяжка бывае разабраць змест і сэнс. Сустракаюцца надпісы ў алтары, на калонах храма, сценах; ёсць на старажытнарускай мове, старабеларускай, лацінкай. Верагодней за ўсё для іх нанясення карысталіся пісаламі (стыламі) — адмысловымі прыстасаваннямі, з аднаго боку вострымі, з другога — у выглядзе лапатачкі.

Некаторыя графіці выкананы, відавочна, нажом ці чымсьці накшталт яго. У шэрагу выпадкаў літары вельмі тонкія: часам глыбока ўрэзаныя, а часам вельмі павярхоўныя, хутчэй за ўсё, у гэтых выпадках выкарыстоўвалі іголку.

Ці лёгка быць першапраходцам?

Царкоўныя законы забаранялі драпаць на фрэсках у доме Божым. Але гэтыя табу парушаліся. Што тут зробіш — людзі хочуць пакінуць пасля сябе след, памяць. Дастаткова шмат на паверхнях царквы імёнаў і прозвішчаў. У XVII стагоддзі тэрыторыю Спаса-Праабражэнскай царквы перадалі езуіцкаму калегіуму. Самую вялікую колькасць (каля 25) надпісаў на сценах і калонах храма пакінуў шкаляр Геліаш Шэвердзец, прычым, пра свае грахі Геліаш злёгку драпаў, а вось аўтографы пакінуў вельмі выразныя!

Эпіграфіка — прыкладная гістарычная і філалагічная дысцыпліна, якая вывучае змест і формы надпісаў на цвёрдых матэрыялах (каменнях, кераміцы, металах) і класіфікуе іх у адпаведнасці з іх часавым і культурным кантэкстам.



Спіс з сямі імёнаў для памінання (XIII стагоддзе).

Сустракаюцца ў храме надпісы з літар — А, Б, В. Гэтага ў Сярэднія вякі было дастаткова, каб паказаць пісьменнасць. Часам трапляюцца радкі адной літары, паўтораныя шмат разоў, як у дзіцячых пропісях. Самыя старажытныя надпісы — памінальныя. Сярод іх, напрыклад, аб Ульяне Цвярской, жонцы вялікага князя літоўскага Альгерда, маці вялікага князя літоўскага і караля польскага Ягайлы. Да нядаўняга часу нічога не ведалі пра ігуменняў абіцелі пасля Ефрасінні Полацкай. А выяўленыя надпісы дазволілі ўстанавіць імёны па меншай меры трох яе пераемніц — Кацярыны, Ганны, Акуліны.

Знаходзіла Іна Калечыц і малітоўныя звароты — «Госпадзі, дапамажы рабу свайму, Осію Панамарову», і прызнанні ў грахах — «Госпадзі, дапамажы рабу свайму, архімандрыту гарадзецкаму Іовану», а зверху: «а піў есмь». Ёсць іншы падобны надпіс, ён належыць манашцы, якая злоўжывала віном у Лазараву суботу. Маралісты пакінулі нашчадкам сведчанне: «А Саўка, панамар Святого Спаса, служыць чрэву, працуе целу» або іншае: «Пабіце (імя закрэслена) за злыя ігранія чэрава і хулен смех у келлі». Гэта значыць нечае бурчанне ў жываце выклікае смех манахаў у келлі. А як вам такое пажаданне: «Па чэраве, па хрыбце Спірыдапапа біце пугамі, паеў прасфор адзін канун»? Трэба меркаваць, поп з'еў усе прасфоры сам, не даўшы сваякам памянуць нябожчыка.

Графіці пра смерць ігуменні Ганны (XIV стагоддзе).

— Запомніўся надпіс-загадка: «Бацька мяне нарадзіў, я нарадзіў сабе жонку, жонка нарадзіла мне дзяцей». Нескладана здагадацца, што гаворка пра Адама, — працягвае Іна Леанідаўна. — Сустракала напісаны ў адваротны бок зварот «Госпадзі, дапамажы!» Магчыма, для таго, каб прадэманстраваць здольнасць валодання люстраным пісьмом.

Вельмі крануў мяне «голас» з мінулага, што належыць, відавочна, нейкаму святару, які страціў жонку: «Прадставілася раба Божая, мая Феўроння». Быццам праз стагоддзі чуеш боль чалавечага сэрца: «мая Феўроння». Наогул, займаючыся эпіграфікай, я пераканалася, як мала змяняецца чалавек. Мы сёння гэтаксама любім, пакутуем, працуем, каемся, як і нашы далёкія продкі.

ШЧАСЦЕ ВУЧОНАГА

— Я часта адчуваю радасць, здзяйсняючы маленькія адкрыцці, складаючы з разрозненых знаходак цэласную карціну, дапаўняючы ўяўленне пра гістарычнае мінулае, — прызнаецца Іна Калечыц. — Вядома, вельмі хацелася б падрыхтаваць вучняў, сфарміраваць у Беларусі сваю навуковую эпіграфічную школу. Але пакуль ахвотных не знаходзіцца: эпіграфіка патрабуе часу, цярпення, энтузіязму. Трымаецца яна, як амаль уся гуманітарная навука сёння, у асноўным на падзвіжніках. Для дасягнення выніку даследчыкам трэба шмат чым ахвяраваць, а ў маладосці гэта няпроста.

І ўсё ж такі з часам паслядоўнікі ў Іны Калечыц, напэўна, з'явяцца. Самае цяжкае — пакласці пачатак, зрабіць першыя крокі. Тым, хто пойдзе следам, упэўнена, будзе значна лягчэй.

Вольга ПАКЛОНСКАЯ,
фота Анастасіі ДЗЕРВАН
і з архіва Іны КАЛЕЧЫЦ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Дзеля памяці

ВЯРНУЎСЯ ДА РАСКОЛАТАГА НЕБА

Памёр пісьменнік, генерал-маёр авіяцыі, ваенны лётчык 1-га класа (засвоіў 14 тыпаў самалётаў і правёў у небе больш за дзве тысячы гадзін!) Анатоль Канстанцінавіч СУЛЬЯНАЎ.

Нарадзіўся літаратар у 1927 годзе ў вёсцы Аксінніна Маскоўскай вобласці, у звычайнай сялянскай сям'і. З дзяцінства захапляўся авіяцыяй, заўжды ўзіраўся ў неба, калі над роднымі палеткамі праляталі самалёты. У 1946 годзе скончыў Маскоўскую спецшколу Ваенна-паветраных сіл. Пасля — Тамбоўскае і Армавірскае ваенныя авіяцыйныя вучылішчы. Спачатку служыў ваенным лётчыкам, затым перайшоў на партыйна-палітычную работу, закончыў у 1962 годзе Ваенна-палітычную акадэмію імя У. І. Леніна. Першыя матэрыялы афіцэра былі надрукаваны ў часопісе «Советский воин» і газеце «Советская авиация». Друкаваўся Анатоль Сульянаў і ў газетах «Правда», «Комсомольская правда», «Красная звезда».

Мастацкім вобразам, знаходкам і адкрыццям спрыялі, несумненна, жывая работа з людзьмі, сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, многімі маршаламі Савецкага Саюза і генераламі, проста з адметнымі асобамі. Частку сваёй вайсковай службы Анатоль Сульянаў правёў у Беларусі. Яго добра ведала творчая інтэлігенцыя краіны. Анатоль Канстанцінавіч пасябраваў з народным пісьменнікам Беларусі Васілём Быкавым. Часта разам з ім бываў на сустрэчах у воінскіх калектывах. У розныя гады ліставаўся з Васілём Уладзіміравічам, дзяліўся з ім сваімі шчырымі разважаннямі пра жыццё, вайсковую службу.

Член Саюза пісьменнікаў Беларусі Анатоль Сульянаў — аўтар кніг «Толькі адна ноч», «Блакітныя снягі», «На крытычных вуглах» і іншых зборнікаў мастацкай прозы, як правіла, прысвечанай ваенным лётчыкам, вайсковай службе. Асобны складнік творчасці пісьменніка, які доўгі час жыў у Беларусі, — біяграфічная літаратура. Анатоль Канстанцінавіч напісаў кнігі, прысвечаныя Маршалу Перамогі — «Маршал Жукаў. Слава. Забыццё. Бессмяротнасць», сталінскаму палачу Лаўрэнцію Берыю — «Арыштаваць у Крамлі», класіку рускай літаратуры — «Пушкін, Эліз Кутузава і Долі Фікельмон». Напісаў Анатоль Сульянаў і гісторыка-публіцыстычную кнігу «Вайна, якой магло не быць»...

5 лютага 2021 года пісьменнік пайшоў з жыцця. Вярнуўся да расколатага Неба, у якім і жывуць многія з яго герояў.

Кастусь ЛЕШНІЦА.

«У РАБОЦЕ З МОЛАДДЗЮ ДРОБЯЗЯЎ НЕ БЫВАЕ»

НОВАЕ ПАКАЛЕННЕ ЎЛАДАРОЎ РАКЕТКІ

«Дзякуючы перамогам Наталлі Зверавай, Вікторыі Азаранкі, Арыны Сабаленкі, Аляксандры Сасновіч у беларускім тэнісе наперадзе дзяўчаты. Але маладыя хлопцы ў будучым могуць гэта змяніць. Нашы юнакі зараз вельмі канкурэнтаздольныя. Будзем спадзявацца, што з іх вырастуць зоркі ўзроўню Максіма Мірнага ці Уладзіміра Валчкова», — адзначыў Аляксей Нікулін.

Новым Мірным можа стаць Станіслаў Бульбянкоў, выпускнік гомельскай школы, абсалютны чэмпіён першынства Беларусі ў 12-гадовай катэгорыі. Вялікі патэнцыял маюць Арсеній Бялоў і Арцём Аскірка. У лютым Мікалай Банькоў заваяваў першы тытул у сваёй кар'еры. Ён выйграў міжнародны турнір сярод тэнісістаў да 18 гадоў, што праходзіў у Казахстане. «Дзякуючы гэтай перамозе Коля зараз падымецца дзесьці да 120-й пазіцыі ў сусветным рэйтынгу. Яму нядаўна споўнілася 16 гадоў, і ў сваім узросце ён паказвае выдатныя вынікі. Я яго першы трэнер, мы працавалі з ім дзевяць гадоў. І дай бог, каб у яго ўсё атрымлівалася так, як мы планавалі. Ён заўсёды быў зараджаны на спорт і ў яго вялікае будучае», — расказаў Аляксей Нікулін.

У краіне шмат таленавітых дзяцей. Толькі трэба, каб кожны з іх знайшоў свайго трэнера, які будзе весці яго па спартыўным шляху і развівацца разам з ім.

Тэнісу, як і каханню, усе ўзросты пакорныя. Усё залежыць ад асаблівасцяў дзіцячага арганізма. Часцей за ўсё гуляць у тэніс пачынаюць у 5-7 гадоў, некаторыя і ў чатыры гады бяруць ракетку ў рукі. Пачынаючы з 10-гадовага ўзросту тэнісіст можа выступаць на розных турнірах, набіраючы рэйтынгавыя балы і вопыт.

Еўрапейская тэнісная федэрацыя (Tennis Europe) ужо шмат гадоў праводзіць свой юніёрскі тур — серыю спаборніцтваў для тэнісістаў ад 12 да 16 гадоў. Турніры, якія праходзяць пад эгідай Tennis Europe, па словах Аляксея Нікуліна, «выдатная пляцоўка для развіцця і станаўлення гульцоў, удасканалення іх прафесійных якасцяў». У студзені 2021 года Еўрапейская тэнісная федэрацыя (Tennis Europe) аднавіла правядзенне турніраў сярод тэнісістаў да 12 гадоў, якія пэўны час не праводзіліся праз пандэмію каранавіруса. І ў студзені ў Мінску прайшоў турнір для спартсменаў да 14 гадоў Smena Cup. У канцы лютага ў Мінску прайшоў першы сёлета турнір Tennis Europe сярод тэнісістаў да 12 гадоў. На Spartak Cup прыехалі юныя спартсмены з 12 краін, заявілі аб сабе і гаспадары турніру. Найлепшыя вынікі сярод беларускіх спартсменаў паказала Улада Разіна, якая дайшла да фіналу, Аляксандра Баюшчанка ў пары з малдаўскай тэнісісткай Ліяй Белібавай дайшла да фіналу парнага разраду. Сярод хлопчыкаў далей усіх па турнірнай сетцы прайшоў Арцём Аскірка, які стаў паўфіналістам. На гэтым жа этапе ў парным разрадзе яны спыніліся разам з Арсеніем Бяловым.

«У нашай краіне шмат дзяцей, якія добра выступаюць на спаборніцтвах Tennis Europe у розных узроставых катэгорыях. Яны паказваюць нядрэнныя вынікі на міжнародных стартах. Але не заўсёды гэта азначае безумоўны поспех на прафесійным узроўні. Арына Сабаленка да 14 гадоў на міжнародным узроўні не вылучалася», — адзначае Аляксей Нікулін.

НАВАТ У ІНДЫВІДУАЛЬНЫМ СПОРЦЕ ПАТРЭБНА КАМАНДА

Не так цяжка выхаваць спартсмена, як цяжка захаваць яго сілы і жаданне падчас пераходнага ўзросту. Па словах Аляксея Нікуліна, праца гэта складаная, але яна таго

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аляксей НІКУЛІН і Мікалай БАНЬКОЎ.

каштуе: «У рабоце са спартсменамі-падлеткамі ўсё мае значэнне. Мяняецца арганізм, фізіялогія — змяняецца тэхніка. Задача трэнера — адразу наладзіць супрацоўніцтва з урачом, фізіятэрапеўтам. Спартсмены — гіперхалерыкі, яны неардынарныя, нестандартныя ў сваіх дзеяннях, бо на корце трэба хутка думаць і прымаць незвычайныя рашэнні. І трэба іх імпульсіўнасць і эмацыянальнасць накіраваць у правільнае рэчышча. Мая задача як трэнера — навучыць дзяцей вечнаму спартыўнаму правілу «без паражэнняў не будзе перамог». У пераходным узросце праблемы ёсць ва ўсіх. Але ў кожнага падлетка, асабліва ў спартсменаў, павінен быць побач чалавек, які дапаможа і дасць мудрую параду. І трэнер абавязаны пра гэта памятаць».

У многіх установах таленавітых дзяцей берагуць. І з цягам часу школа дапамагае бацькам вырашаць фінансавыя пытанні, звязаныя з экіпіроўкай ці выездам на спаборніцтвы. Аднак для гэтага трэба добра сябе праявіць.

Каб пераходны ўзрост у будучым стаў цёплым успамінам, а не кашмарным сном, у падлетка павінна быць свая каманда — бацькі і трэнер. Аляксей Нікулін лічыць, што выхаваць добрага спартсмена без удзелу бацькоў немагчыма: «Так, дзеці шмат часу праводзяць са мной на корце, а яшчэ больш часу яны праводзяць дома з бацькамі. Усё, што робіць чалавек, ідзе з сям'і. І бацькі павінны трымаць руку на пульсе. Калі бацькі, трэнер і спартсмен будуць трымацца разам і разам ісці да мэты — будзе вынік. Прыкладаў вельмі шмат. Трэнер Максіма Мірнага — яго бацька Мікалай Мікалаевіч — заўсёды быў побач з ім. Мама Вікі Азаранкі Ала была метадыстам цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па тэнісе і прымала вялікі ўдзел у кар'еры дачкі. Я сябраваў з сям'ёй Шарапавых, яны ж з Гомеля, там і зараз жыве іх бабуля. І я добра памятаю, як Юра праводзіў трэніроўкі разам з маленькай Машай».

СПОРТ — ГЭТА ШКОЛА ЖЫЦЦЯ

Спорт, асабліва тэніс, даўно разбурыў стэрэатып аб тым, што спартсменам трэба ведаць толькі правілы гульні. «Каб вырасці ў выдатнага спартсмена, трэба быць усебакова развітым чалавекам. Некаторыя маюць спартсмены займаюцца ў музычнай школе, ходзяць на розныя гурткі, ім трэба развівацца як асобам», — упэўнены Аляксей Нікулін.

Усебаковае развіццё датычыцца не толькі інтэлектуальных здольнасцяў, але і фізічных. Эфектыўная замежная практыка мультыспорту набывае папулярнасць і ў Беларусі. Згодна з гэтай канцэпцыяй дзеці не павінны займацца адным відам спорту, а спрабаваць розныя. Гэта дапаможа добра фізічна развіць маленькага чалавека і выбраць спорт, да якога ён больш схільны. Аляксей Нікулін падтрымлівае гэту ідэю: «Мае вучні Коля Банькоў, Стас Бульбянкоў і іншыя ў самым пачатку не засяроджваліся толькі на тэнісе. Яны гулялі ў футбол, займаліся адзінаборствамі, плавалі. Колю Банькову прапаноўвалі заставацца ў кожнай спартыўнай секцыі, якую ён наведваў. Ён так добра гуляў у футбол, што ў 10 гадоў яму прыйшлося выбіраць паміж ім і тэнісам. Тэнісістам у першую чаргу важна мець базу гульнявых відаў спорту. Многія знакамітыя тэнісісты, напрыклад Рафаэль Надаль, добра гуляюць у баскетбол ці футбол. Гэта дае адчуванне мяча і вучыць добра ім валодаць. Дарэчы, тэнісістам варта ўзяць некалькі ўрокаў бокса, як гэта калісьці рабілі Вікторыя Азаранка і Марыя Шарапава. Бокс трэніруе хуткасць і сілу рук, падчас заняткаў адпрацоўваецца выкідванне рук. Дзяўчынкі часта займаюцца гімнастыкай, але карысць для тэнісістаў даволі спрэчная. Для ўмацавання мышачнага корпуса, плячэй, прэса трэба плаваць. Нельга забываць пра інтэлектуальнае развіццё, таму дзецям варта гуляць у шахматы, абавязкова вучыць замежныя мовы».

Тэнісу, як і каханню, усе ўзросты пакорныя. Усё залежыць ад асаблівасцяў дзіцячага арганізма. Часцей за ўсё гуляць у тэніс пачынаюць у 5-7 гадоў, некаторыя і ў чатыры гады бяруць ракетку ў рукі.

З розных бакоў развіваць здольнасці маленькіх тэнісістаў дапамагаюць спарынгі паміж дзяўчынкамі і хлопчыкамі. «Для паляпшэння сваіх вынікаў варта трэніравацца з сапернікамі розната ўзроўню, розната ўзросту. Тэнісісты на трэніроўках часта гуляюць мікст, дзяўчаты выходзяць на корт супраць хлопцаў. Гэта праверка сіл і адпрацоўка тактычных намераў і здольнасцяў, якія можна прымяніць на спаборніцтвах», — тлумачыць Аляксей. Каб упэўніцца ў правільнасці такога падыходу, варта ўспомніць, што Вікторыя Азаранка і Максім Мірны выйгралі Алімпійскія гульні 2012 года менавіта ў міксце.

Аляксей НІКУЛІН і яго вучні.

...І АКАДЭМІЯ ТЭНІСА

Комплексным выхаваннем тэніснай будучыні займаецца Нацыянальная акадэмія тэніса, якая была створана ў 2017 годзе для падрыхтоўкі спартыўнага рэзерву. З акадэміяй супрацоўнічаюць найлепшыя беларускія і замежныя спецыялісты. Рэгулярна ў розных гарадах краіны Акадэмія тэніса разам з федэрацыяй праводзяць майстар-класы і семінары. «Гэта выдатная магчымасць знайсці таленавітых дзяцей, даць ім карысныя веды. Падчас такіх майстар-класаў мы не толькі паказваем пэўныя тэхнічныя прыёмы. Са спартсменамі працуюць псіхолаг, фізіятэрапеўт, трэнер па агульнай фізічнай падрыхтоўцы. Выхаванне маладога пакалення — вельмі адказная праца, дзе значэнне мае ўсё. Я шмат паездзіў па розных краінах, маю зносіны з калегамі з іншых краін і магу сказаць, што беларуская методыка падрыхтоўкі рэзерву адна з самых эфектыўных. Спадзяюся, мы ў гэтым упэўнімся, калі нашы дзеці будуць добра выступаць на турнірах вялікага шлема», — расказаў Аляксей Нікулін, трэнер Нацыянальнай акадэміі тэніса.

Месцаў для трэніровак у беларускіх тэнісістаў хапае, і не толькі ў сталіцы ці рэгіянальных гарадах. У верасні 2020 года тэнісная секцыя была адкрыта ў аграгарадку Аляксандрыя Магілёўскай вобласці. А 2021 год пачаўся з адкрыцця тэніснага манежа з трыма кортамі ў Салігорску. Пералічваць можна доўга, бо тэніс развіваецца па ўсёй краіне сіламі дзяржаўных і прыватных школ.

Добры прыклад рэгіянальным школам паказвае Гомельскі абласны цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па тэнісе. «Наша школа існуе 13 гадоў, і для рэгіёна яна дастаткова вялікая — у нас займаецца каля 250 дзяцей. Добра, што ўмовы дазваляюць: ёсць летнія корты і пяць крытых кортаў для заняткаў зімой. Актыўна праводзяцца міжнародныя спаборніцтвы, напрыклад сёлета Spartak Cup павінен быў прайсці ў Гомелі, але праз пандэмію перанеслі ў Мінск. Увогуле гомельская школа ў краіне другая пасля сталічнай. На алімпійскіх днях моладзі мы занялі другое месца, рэгулярна ўваходзім у тройку прызёраў першынства краіны сярод школ. Вучні нашай школы Дар'я Хамуцянская, Аляксей Хамротаў, Данііл Рыжанкоў і Уладзіслава Манжас — члены нацыянальных каманд. Дзяніс Жарын нават выступаў за каманду Беларусі на адным з этапаў Кубка Дэвіса», — не хавае гонару Аляксей Нікулін.

САМЫЯ ВЫГАДНЫЯ ІНВЕСТЫЦЫІ

Трэнер заспакойвае бацькоў, якія хвалююцца, што дзіця можа атрымаць траўму — тэніс не надта траўманебяспечны спорт. У адзінаборствах, хакеі ці футболе траўм значна больш. Аднак тэніс «траўманебяспечны» для бацькоўскіх кашалькоў, гэта элітны спорт, таму і цэны адпаведныя. Але ў многіх установах таленавітых дзяцей берагуць. І з цягам часу школа дапамагае бацькам вырашаць фінансавыя пытанні, звязаныя з экіпіроўкай ці выездам на спаборніцтвы. Аднак для гэтага трэба добра сябе праявіць.

Аляксей Нікулін упэўнены, у краіне шмат таленавітых дзяцей. Толькі трэба, каб кожны з іх знайшоў свайго трэнера, які будзе весці яго па спартыўным шляху і развівацца разам з ім. «Я займаюся трэнерскай дзейнасцю 20 гадоў. Рознае было на гэтым шляху. І я цвёрда ўпэўніўся, што разам з пяцігадовым дзіцем расце і трэнер. Я вучу сваіх дзяцей быць добрымі тэнісістамі, а яны многаму вучаць мяне. Вось і ўвесь сакрэт агульнага поспеху».

Валерыя СЦЯЦКО.
Фота з асабістага архіва героя.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

5 сакавіка 2021 г. № 8 (593)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

Фота Яна ХВЕДЫНА.

Штогод у органы дзяржаўнага кіравання звяртаецца каля мільёна чалавек

Такая лічба прагучала падчас семінара «Звароты грамадзян і юрыдычных асоб. Заканадаўства і практыка прымянення», які прайшоў у Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу з удзелам парламентарыяў і прадстаўнікоў дзяржкіравання.

Па словах спікера ніжняй палаты парламента Уладзіміра АНДРЭЙЧАНКІ, для парламентарыяў работа з насельніцтвам мае асаблівае значэнне, яны заўсёды знаходзяцца ў эпіцэнтры грамадскага жыцця ў сваіх выбарчых акругах. Так, за мінулы год дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў праведзена больш за пяць з паловай тысяч сустрэч у працоўных калектывах, арганізавана звыш дзвюх тысяч асабістых прыёмаў, прынята больш за восем тысяч чалавек, разгледжана больш чым дзесяць тысяч зваротаў.

«І гэта толькі ў акругах. Акрамя таго, у Палаце прадстаўнікоў за гэты ж час разгледжана больш за тры тысячы зваротаў грамадзян і юрыдычных асоб. Часцей за ўсё звароты датычацца якасці аказання жыллёва-камунальных паслуг, стану дарог, праблем банкаўскага і паштовага абслугоўвання на вёсцы. Грамадзян хвалююць пытанні росту цэн на тавары першай неабходнасці і лекі. Таму дэпутатам і ў далейшым неабходна працягваць маніторынг цэнаўтварэння», — звярнуў увагу старшыня ніжняй палаты парламента.

Ён адзначыў, што семінар дасць старт сур'ёзнай прафесійнай дыскусіі аб перспектывах удасканалення прававой базы. Згодна з планам законапраектнай дзейнасці, у бягучым годзе прадугледжана ўнясенне змяненняў у Закон «Аб звароце грамадзян і юрыдычных асоб». «Варта сказаць, што мы не першы раз звяртаемся да гэтай тэмы. Дэпутацкі корпус актыўна абмяркоўвае актуальныя пытанні дзеючага заканадаўства ў рамках «круглых сталоў», рабочых сустрэч з прадстаўнікамі розных дзяржаўных органаў. Для парламентарыяў работа з насельніцтвам мае асаблівае значэнне, а ў яе аснове заўсёды быў, ёсць і будзе клопат пра чалавека», — канстатаваў Уладзімір Андрэйчанка.

У мерапрыемстве, акрамя дэпутатаў, узялі ўдзел члены Савета Рэспублікі, прадстаўнікі галоўнага ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Адміністрацыі Прэзідэнта, Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў, Камітэта дзяржаўнага кантролю, Канстытуцыйнага суда, кафедры дзяржаўнага кіравання Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце, выканаўчых і распарадчых органаў. Да ўдзелу запрошаны прадстаўнікі ведамстваў Гродзенскай і Віцебскай абласцей.

Начальнік галоўнага ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Адміністрацыі Прэзідэнта Грыгорый ШЛЫК расказаў: штогод у органы дзяржаўнага кіравання звяртаецца каля мільёна грамадзян.

«Тут я не хачу казаць пра нейкае сацыяльнае ўтрыманства, «прафесійных» скаржнікаў — не яны робяць надвор'е і не пра іх размова. Трэба казаць пра тых асоб, што з надзеяй і верай у сумленнасць прыходзяць у кабінеты рознага ўзроўню. Мы лічым, што ступень даверу паміж насельніцтвам і ўладай павінна захоўвацца і павышаецца», — адзначыў Грыгорый Шлык.

Ён дадае, што час патрабуе больш высокага ўзроўню ўзаемадзеяння дзяржавы і народа, заснаванага на інфармацыйных тэхналогіях. На думку Грыгорыя Шлыка, звароты грамадзян — лакмусавая паперка настрояў у грамадстве.

«Мінулы год быў няпросты для ўсіх, але ў прынцыпе нічога не змянілася ў плане пошты, што прыходзіла ў Адміністрацыю Прэзідэнта. Тэмы зваротаў, як правіла, датычацца жыллёва-камунальнай гаспадаркі, выплаты пенсій, сацыяльнага забеспячэння, аховы здароўя, будаўніцтва жылля. Адзінае, з'явілася новая тэндэнцыя — насельніцтва стала больш палітычна актыўнае. То-бок падымаліся не толькі пытанні жыццязабеспячэння, але і далейшага сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага развіцця краіны», — канстатаваў Грыгорый Шлык.

Ірына ДАЎГАЛА, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве, падкрэсліла, што ў Беларусі створана шырокая сетка суб'ектаў дзяржаўнай улады, якія прымаюць людзей са зваротамі.

«На мой погляд, рашэнні тады будуць успрымацца людзьмі, калі кожны дзяржорган і кожны чалавек з дзяржорганаў, якія вядуць прыём грамадзян і разглядаюць звароты людзей, будуць разглядаць іх як свае ўласныя», — сцвярджае дэпутат.

(Заканчэнне на 8-й стар.)

На кантролі ў дзяржавы

На гэтым тыдні намеснік старшыні Савета Рэспублікі Анатоль Ісачанка наведаў ААТ «Мінскі малочны завод № 1»

Парламентарый азнаёміўся з вытворчасцю, а таксама правёў сустрэчу з кіраўніцтвам прадпрыемства, паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента.

«У якасці ўпаўнаважанага прадстаўніка кіраўніка дзяржавы па Мінскай вобласці, а таксама ў мэтах выканання даручэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь працягваецца вывучэнне фінансава-гаспадарчай дзейнасці шэрагу прадпрыемстваў рэгіёна», — адзначыў віцэ-спікер Савета Рэспублікі.

Як падкрэсліў Анатоль Ісачанка, пытанні дзейнасці гаспадарчых таварыстваў і ў далейшым будуць на пастаянным кантролі ў дзяржавы.

НА ШЛЯХУ ДА МЭТ

18-я ў рэйтынгу

Існуючая дзяржаўная палітыка дала магчымасць Беларусі ўвайсці ў спіс сусветных лідараў у галіне ўстойлівага развіцця

Намеснік старшыні Савета Рэспублікі, нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця Анатоль Ісачанка правёў беларуска-венгерскія кансультацыі па тэматыцы МУР з кіраўніцтвам Дзяржаўнага сакратарыята Міністэрства інавацый і тэхналогій Венгрыі і офісам нацыянальнага каардынатара МУР Венгрыі.

Падчас сустрэчы бакі абмеркавалі актуальныя пытанні рэалізацыі Парадку дня ў галіне ўстойлівага развіцця да 2030 года, у тым ліку стан і перспектывы двухбаковага ўзаемадзеяння па лініі МУР, паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента.

«Палітыка, якая рэалізуецца ў Беларусі, і абраны нашым народам чвэрць стагоддзя таму курс, накіраваны на пабудову моцнай дзяржавы, у аснове якога знаходзяцца ў першую чаргу інтарэсы чалавека, дазваляюць сёння займаць Рэспубліцы Беларусь 18-е месца ў глабальным рэйтынгу Мэт устойлівага развіцця», — канстатаваў нацыянальны каардынатар Беларусі.

Ён таксама падкрэсліў, што прынятыя на VI Усебеларускім народным сходзе прыярытэты на наступныя пяць гадоў адпавядаюць глабальнаму Парадку дня да 2030 года, які рэалізуецца, і яшчэ раз падкрэсліваюць прыхільнасць Беларусі да ключавых прынцыпаў устойлівага развіцця.

У сваю чаргу, венгерскі бок акрэсліў пазітыўны вопыт Беларусі ў дасягненні МУР на рэгіянальным узроўні. Было таксама адзначана, што ў нашай краіне створана і паспяхова функцыянуе нацыянальная архітэктура кіравання працэсамі ўстойлівага развіцця.

«Мы гатовыя і ў далейшым выбудоўваць дыялог на аднолькавых правах з нашымі замежнымі партнёрамі, але ў аснове гэтай камунікацыі павінна быць павага да беларускага народа, да яго права на самавызначэнне, да нашай гісторыі, традыцый і культуры», — падкрэсліў Анатоль Ісачанка.

ПАРЛАМЕНТАРЫЗМ

БЯСПЕКА — СПРАВА КАЛЕКТЫЎНАЯ

ПАСЯДЖЭННЕ Пастаяннай камісіі Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы па палітычных пытаннях і міжнародным супрацоўніцтве прайшло на гэтым тыдні ў фармаце відэаканферэнцыі. Беларускую дэлегацыю на ім прадставілі старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па нацыянальнай бяспецы і міжнародным супрацоўніцтве Сяргей РАЧКОЎ і член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Сяргей ДЗІК.

На парадак дня былі вынесены дзевяць пытанняў, якія датычыліся задач на бягучы перыяд, што ставіць перад сабой краіна, якая сёлета выступае старшынёй у гэтай уплывовай міжнароднай арганізацыі. На цяперашні момант дадзеную функцыю выконвае Таджыкістан. З прыярытэтамі краіны сваіх калег пазнаёміў **старшыня камітэта Маджлісі намаядаган Маджлісі Алі Рэспублікі Таджыкістан па правапарадку, абароне і бяспецы Рустам ШАХМУРОД.**

Адной са змястоўных тэм на парадку дня былі стан і тэндэнцыі ў развіцці міжнароднай палітычнай абстаноўкі ў зоне адказнасці АДКБ і прылеглай тэрыторыі, мерах па далейшым удасканаленні сістэмы калектыўнай бяспекі і яе прававым забеспячэнні.

Парламентарыі разгледзелі сучасныя пагрозы і выклікі, якія стаяць перад краінамі — удзельніцамі АДКБ па ўсім перыметры граніц краін, якія ўваходзяць у гэты дагавор.

— Тэма вельмі актуальная і тут прагучалі перасцярогі — нашымі апанентамі канцэнтруецца ўвага вакол краін Цэнтральнай Азіі і постсавецкай прасторы, з якой вылучаецца Украіна як магчымы інструмент, які будзе выкарыстаны супраць краін — удзельніц АДКБ, — падкрэсліў у размове з карэспандэнтам «МС» Сяргей Рачкоў.

Акрамя таго, адна з актуальных тэм, якую цалкам падтрымала беларуская дэлегацыя, адлюстравана ў праекце заявы Савета Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы аб недапушчальнасці замежнага ўмяшання ў выбарчыя працэсы дзяржаў — краін Арганізацыі.

У ёй ідзе гаворка аб тым, што праект заявы падрыхтаваны з улікам выбараў, якія прайшлі ў шэрагу дзяржаў — членаў Арганізацыі ў 2020 годзе, і ўнутрыпалітычных падзей, што адбыліся пасля іх. Гэтыя падзеі былі шмат у чым справакаваныя звонку і з выкарыстаннем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

У той жа час вынікі непасрэднага і дыстанцыйнага міжнароднага нагляду за выбарамі, у тым ліку і выбарамі, якія адбыліся ў пачатку 2021 года, пацвярджаюць сталасць і ўстойлівасць выбарчых сістэм дзяржаў — членаў АДКБ, свабодны, адкрыты, канкурэнтны характар выбараў, іх поўную адпаведнасць агульнапрызнаным універсальным і рэгіянальным міжнародным абавязацельствам дзяржаў-членаў і іх нацыянальнаму заканадаўству ў гэтай галіне.

Тым не менш, апошняе не перашкодзіла асобным міжнародным субрэгіянальным парламенцкім арганізацыям падвергнуць выбарчыя сістэмы краін — удзельніц АДКБ неаб'ектыўнай крытыцы і ацэнцы, пры поўным ігнараванні відавочных фактаў прамога і ўскоснага ўмяшання ў ход выбараў з боку заходніх удзельнікаў.

Не былі імі асуджаны факты шырокага выкарыстання дасягненняў інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій для сістэматычных інфармацыйных укідаў, накіраваных на расслаенне і палярызацыю грамадства, правакацыю электарата да радыкальных дзеянняў.

Гэта, безумоўна, сведчыць аб палітычнай ангажаванасці такіх дзеянняў і ацэнак, выкарыстанні двайных стандартаў і дэградацыі палітычнай культуры.

Праект заявы адзначае антыдэмакратычныя факты, а таксама канстатуе адпаведную калектыўную рэакцыю на іх як на прамую пагрозу суверэнітэту і нацыянальнай бяспецы дзяржаў — членаў Арганізацыі, падкрэслівае недапушчальнасць умяшання ва ўнутраныя справы дзяржаў — членаў АДКБ і неабходнасць прыняцця мер па ўзмацненні нацыянальнага нагляду за замежнымі інфармацыйнымі рэсурсамі, а таксама асуджае грубае парушэнне асноўных дэмакратычных прынцыпаў і свабод у глабальных інфармацыйных сетках і ўтрымлівае заклік, адрасаваны міжнародным, у тым ліку парламенцкім, арганізацыям, па адэкватнай ацэнцы такіх фактаў з іх боку.

Праект гэтай заявы вынесла на абмеркаванне парламенцкая дэлегацыя Дзяржаўнай думы Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі і была цалкам падтрымана беларускай дэлегацыяй. Праект дакумента накіраваны для разгляду ў нацыянальныя парламенты краін — удзельніц АДКБ. Наступным крокам павінен стаць разгляд на Савеце Парламенцкай Асамблеі гэтай арганізацыі, правядзенне якога запланавана ў канцы сакавіка.

Вольга АНУФРЫЕВА.

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

ДАГАВОР НЕАБХОДНА ЧЫТАЦЬ УВАЖЛІВА

ПАДКРЭСЛІВАЕ старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ, якая правяла на гэтым тыдні прамую тэлефонную лінію.

Геаграфія званкоў да сенатара была, як звычайна, разнастайная: ёй тэлефанавалі з розных куткоў Беларусі, каб атрымаць параду, папрасіць аб дапамозе, падзякаваць ці проста выказаць сваю прапанову.

Бабруйчанка Ніна Уладзіміраўна расказала сваю гісторыю: заключылі дагавор з прыватнікам аб набыцці аднапакаёвай кватэры пад растэрміноўку на некалькі гадоў. У адным экземпляры была прыведзена адна інфармацыя, у другім — іншая. Людзі падпісалі і толькі пазней даведаліся, што ў другім дакументе ідзе гаворка аб рэканструкцыі былых збудаванняў вайсковай часці і не аб растэрміноўцы па набыцці жылля, а даванні пазыкі. З гэтым забудоўшчыкам у судзе ўжо ёсць прэцэдэнты, і людзі разгубленыя: што рабіць далей?

Таццяна Рунец падкрэслівае: заўсёды трэба чытаць любы дагавор, які вы падпісваеце, асабліва ўважліва тое, што падаецца дробным шрыфтам. Тым больш калі гэта датычыцца такіх сур'ёзных рэчаў, як набыццё жылля.

— Каб мець магчымасць аказаць вам дапамогу, трэба першнаперш азнаёміцца з умовамі, з якімі вы пісьмова пагадзіліся, — адзначыла сенатар і прапанавала даслаць копіі дакументаў у прафільную камісію, каб тэлефонны званок меў практычны вынік.

Не надта разабралася з умовамі крэдытнага дагавора і жыхарка Івацэвіцкага раёна Валянціна Дзмітрыеўна, якая ў свой час пазычыла грошы ў банка. Установа ліквідавалася, і жанчына не разабралася з тым, каму ж цяпер трэба вяртаць узяты крэдыт. Як вынік — пеня, штраф і пастанова суда аб вылічэнні доўгу з невялікай пенсіі.

— Два гады нічога не пыталі, а тут налічылі пеню і вылічваюць больш за сто рублёў штомесяц, — скардзілася пажылая жанчына.

Аб тым, што ў банка павінен быць праваперaемнік, маўляў, нічога не ведала і не чула... Якія папярэджанні дасылалі па пошце, не зразумела...

— Трэба вывучаць дакументы, якія ёсць па гэтай справе, — звярнула ўвагу сенатар і даручыла спецыялістам профільнай камісіі скрупулёзна падысці да вырашэння праблемы, агучанай грамадзянкай.

Падчас прамой лініі былі ўзняты і бытавыя праблемы. Жыхарка Барысаўскага раёна Вольга Уладзіміраўна наракала на суседку, што прывяла ў непрыдатнасць агульную дарогу, якую зрабіла часткай свайго агарода. Дабірацца да ўласнага ўчастка, на якім будуе дом, шматдзетная сям'я можа толькі з дапамогай лясной дарогі. Маладая жанчына сцвярджае, што звярталася да мясцовых улад, ёсць адпаведнае прадпісанне, але справа далей не ідзе. Спецыялісты профільнай камісіі зоймуцца вывучэннем гэтага пытання. Адпаведнае даручэнне дадзена і сенатару, у акрузе якога знаходзіцца гэтая тэрыторыя.

А вось Людмілу Мікалаеўну з аграгарадка Жамчужны, што ў Баранавіцкім раёне, непакоіць перабоі ў падачы гарачай вады, таму і скардзілася падчас прамой лініі на камунальныя службы: маўляў, хоць бы папярэджвалі людзей аб такіх непрыемных момантах.

Дарэчы, гэта адзінае, што хвалюе жанчыну. Усім астатнім яна задаволена — унутранай палітыкай, бытавымі ўмовамі, пенсіяй.

Іншы заяўнік — Васіль Адольфавіч са Жлобіна — не наракаў, а пытаў: чаму ўвесь час павышаюць цэны на паліва? Яму паабяцалі даць абгрунтаваны адказ на гэтае пытанне з аргументацыяй адказных асоб з нафтахімічнай галіны.

А вось пенсіянер з Кобрына Уладзімір Львовіч убачыў у існуючых нарматыўна-прававых актах спрэчнае пытанне, якое і вырашыў агучыць з прапановамі аб яго вырашэнні з удзелам сенатарскага корпуса. Гэтую заўвагу паабяцалі разгледзець на базе Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў з запрашэннем усіх зацікаўленых бакоў.

Трэба сказаць, што ўсяго на прамую лінію патэлефанавала 15 чалавек. Акрамя агучаных вышэй тэм, былі выказаны прапановы па паляпшэнні экалагічнай сітуацыі і ахове навакольнага асяроддзя.

Парламентарый дала заяўнікам неабходныя тлумачэнні і рэкамендацыі, дзесяць звароткаў было ўзята на кантроль. Пытанні, якія патрабуюць дадатковага вывучэння, накіраваны ў кампетэнтныя дзяржаўныя органы з просьбай разабрацца ў сітуацыі і праінфармаваць аб выніках Пастаянную камісію.

Вольга АНУФРЫЕВА.

Штогод у органы дзяржаўнага кіравання звяртаецца каля мільёна чалавек

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Валянціна РАЖАНЕЦ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі, расказала, што ў лістападзе 2021 года да дэпутатаў павінен паступіць абноўлены праект закона «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб», і семінар быў стартавай пляцоўкай для гэтай дзейнасці.

«Я думаю, што з развіццём лічбавых тэхналогій значна пашыраюцца магчымасці грамадзян, якія жывуць у Беларусі, звяртацца ў дзяржорганы, да дэпутатаў, у грамадскія арганізацыя рознымі спосабамі, таму зваротаў шмат. Гэта добра, бо мы бачым увесь спектр пытанняў, што ёсць у рэгіёнах, і для іх эфектыўнага вырашэння, натуральна, трэба ведаць іх глыбіню і тонкасці», — сказала Валянціна Ражанец.

Яна звярнула ўвагу, што ў абноўлены нарматыўна-прававы акт магчыма ўнесці змяненні наконт атрымання электронных звароткаў, таксама неабходна папрацаваць над кнігай заўваг і прапаноў, удакладніць спосабы яе вядзення, запаўнення.

Марыя ДАДАЛКА.

Слухаем роднае

«Культура» адзначае прэм'ерай стагоддзе з дня нараджэння Івана Мележа

З сакавіка ў эфіры спецыялізаванай радыёхвалі ў выкананні артысткі Лікі Пташук пачалі ажываць старонкі рамана «Людзі на балоце» — ён распачынае серыю мастацкіх чытанняў знакамітай трылогіі «Палеская хроніка» ў рамках праекта «Літаратурная анталогія».

— Творчасць айчынных класікаў заўсёды прыцягвае нашу ўвагу, — кажа **намеснік дырэктара канала «Культура», заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, пісьменнік Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ.** — У прыватнасці, да стагоддзя Івана Шамякіна ў нашым эфіры ўжо прагучалі старонкі яго рамана «Трывожнае шчасце», працягваецца мастацкае чытанне аповесці «Шлюбная ноч». А ў сакавіку ўвазе слухачоў будзе прадстаўлены несмяротны твор Івана Мележа «Людзі на балоце». Як вядома, героі «Палескай хронікі» былі шырока прадстаўлены ў кінафільмах, тэлеспектаклях, радыёпастаноўках, а наша новая работа, якая прагучыць на канале «Культура» ў монавыкананні, дапоўніць мастацкае ўвасабленне творчасці класіка беларускай літаратуры.

Нагадаем, праект «Літаратурная анталогія» можна слухаць на хвалях канала з панядзелка да пятніцы ў 14.15, 23.00 і 04.00. На сайце www.radiokultura.by маецца архіў перадачы, дзе змешчаны выпускі, якія прагучалі ў эфіры.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 115

Сваю новую задачу прапануе Мікалай Быкаў з Баранавіцкага раёна **(гл. дыяграму)**.

Белыя: Крс3, Ла5, Лf2, Се3, Сf3, Кf7, Кf8, пп. d5, e2 (9).

Чорныя: Крf5, Лg6, Cd1, пп. e7, f6 (5).

Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru.

* * *

Мы ўжо паведамлялі, што ў Мінску прайшлі чэмпіянаты Беларусі сярод удзельнікаў да 18 гадоў. У юнацкім турніры (53 удзельнікі) першыя тры месцы занялі адпаведна майстар ФІДЭ Максім Царук, майстар ФІДЭ Арцём Сіняўскі і Глеб Галкін. Дарэчы, нароўні з юнакамі змагалася экс-чэмпіёнка Беларусі сярод жанчын Аляксандра Тарасенка, якая фінішавала на 11-м месцы. У дзяўчат (29 удзельніц) прызавую тройку склалі Ксенія Норман, Варвара Палякова і Караліна Галоўчыц.

Вось як гулялі новыя чэмпіёны.

Максім Царук — Міхаіл Яшчук. 1. e4 e6 2. d4 d5 3. Kd2 Kf6 4. e5 Kfd7 5. Cd3 c5 6. c3 Kc6 7. Ke2 cd 8. cd f6 9. ef K:f6 10. 0-0 Cd6 11. Kf3 Фc7 12. Cg5 0-0 13. Ch4 Kh5 14. Фc2 h6 15. Ch7+ Kph8 16. Cg6 Kf4 17. K:f4 C:f4 18. Лfe1 Cd7 19. Лad1 Лac8 20. Фe2 a6 21. Cb1 Kb4 22. Ce7 Cb5 23. Ф:e6 Лfe8 24. g3 Kc2 25. C:c2 Ф:c2 26. gf Лc6 27. Фf7 Лg6+ 28. Cg5 Лe2 29. Лc1 Л:e1+ 30. Л:e1 hg 31. K:g5 Лf6 32. Лe8+, 1:0.

Злата Данчанка — Ксенія Норман. 1. c4 e5 2. Kc3 Kc6 3. g3 f5 4. Cg2 Kf6 5. e3 Cb4 6. Kge2 e4 7. d3 ed 8. Ф:d3 d6 9. 0-0 0-0 10. Kd5 Cc5 11. Kec3 Ke5 12. Фe2 c6 13. Kf4 g5 14. Kd3 Cb6 15. b3 f4 16. K:e5 de 17. ef ef 18. gf Фd4 19. Фe5 Kg4 20. Ф:g5+ Kph8 21. Kd1 K:f2 22. K:f2 Ф:a1 23. c5 Cd8 24. Фh5 Фg7 25. Kph1 Cf5 26. Ke4 Cg4 27. Фe5 Ф:e5 28. fe Л:f1+ 29. C:f1 Ce7 30. Крg1 Лg8 31. Крf2 Лf8+ 32. Крg1 Ch4 33. Cc4 b5 34. cb ab 35. Cb2 h5 36. a4 Ch3 37. Kf6 Лd8 38. Kd7 Л:d7 39. e6+ Лg7+, 0:1.

* * *

Міжнародны майстар Міхаіл Нікіценка выйграў турнір у сербскім горадзе Нові-Сад (19 удзельнікаў). З дзесяці партый ён перамог у шасці, а чатыры звёў унічыю.

Борка Лайтхайм — Міхаіл Нікіценка. 1. e4 c5 2. c3 d5 3. ed5 Ф:d5 4. Kf3 g6 5. Ka3 Cg7 6. Cc4 Фd8 7. Фb3 Kh6 8. d4 0-0 9. C:h6 C:h6 10. Ke5 e6 11. dc Фg5 12. Kf3 Ф:g2 13. Крe2 Фg4 14. Cd3 Kd7 15. Фb4 Фh5 16. c6 Ke5 17. Фe4 K:d3 18. Кр:d3 e5 19. Крe2 Cf5 20. Фh4 Cg4, 0:1.

Міхаіл Нікіценка — Горан Тадаровіч. 1. c4 e6 2. g3 d5 3. Cg2 Kf6 4. Kf3 c5 5. 0-0 Kc6 6. b3 d4 7. e3 Cd6 8. ed cd 9. d3 h6 10. Ca3 0-0 11. Лe1 Лe8 12. c5 Cf8 13. b4 a5 14. Фa4 K:b4 15. C:b4 Cd7 16. Фc2 ab 17. K:d4 Ca4 18. Фc4 Лa5 19. Kd2 Л:c5 20. Ф:b4 Фd7 21. Фb2 Лd8 22. K2f3 Лdc8 23. Ke5 Фc7 24. Фe2 Лd8 25. Kdf3 Лc2 26. Фe3 Kd5 27. Фe4 b5 28. Ch3 Kc3 29. Фh4 Ke2+ 30. Kpf1 Лd5 31. Фe4 Kc3 32. Фe3 b4 33. K:f7 Л:d3 34. Ф:e6 Л:f3 35. K:h6+ Kph7 36. Cf5+ Л:f5 37. Ф:f5+ g6 38. Ф:f8 Фc4+ 39. Крg1 Ke2+ 40. Л:e2 Ф:e2 41. Kg8, 1:0.

* * *

У Нові-Садзе прайшоў яшчэ адзін турнір (25 удзельнікаў): Міхаіл Нікіценка фінішаваў шосты, Арцём Стрыбук — дзясяты. Малады беларускі майстар Ягор Сіліч у першых двух турах выйграў у будучага пераможцы турніру, расійскага гросмайстра Мікіты Пятрова і ў М. Нікіценкі, але пазней сышоў з дыстанцыі.

У Мемарыяле С. Багдановіча, які праходзіў анлайн (134 удзельнікі), лепшы з беларусаў быў Дзяніс Лазавік — 15-е месца. Аляксей Аляксандраў фінішаваў шосты ў Мемарыяле А. Гіпсліса (таксама анлайн).

* * *

Рашэнне задачы М. Кошаля з мінулага выпуску: 1. Ke1! Не вялі да мэты падманныя сляды 1. Л:c5? Kd6!, 1. Kb2? c4! або 1. K:c5? Kf2! Першыя правільна адказалі Ігар Ананіч, Віктар Жук, Васіль Жуковіч, Сяргей Цяльпук, Васіль Барысевіч.

Вадзім ЖЫЛКО.

Сядзі і глядзі

«Карнавал» на восьмага сакавіка

Каляндарная вясна ўжо прыйшла, а значыць, зусім блізка і Міжнародны дзень жанчын. Расказваем пра два фільмы, якія знялі сорак гадоў таму, але яны і сёння здольныя даць падставу для роздумаў і нагадаць любімыя не адным пакаленнем мелодыі і сюжэты. Бо падымуць настрой, вернуць веру ў шчырыя пачуцці і абудзяць жаданне абнавіць уласнае жыццё.

На канале «Беларусь 3» можна будзе знайсці шэраг добрых і цікавых фільмаў, за пераглядам якіх вы дакладна не змарнуеце час. Напрыклад, музычная камедыя «Беражыце жанчын» (рэжысёры — Віктар Макараў, Аляксандр Палыннікаў), якая ўбачыла свет у 1981 годзе. Кінастужка, дарэчы, стала першай работай у кіно папулярнага спевака і кампазітара Юрыя Антонава. Менавіта яго хіты, якія чуем на працягу ўсяго фільма, зрабілі кінатвор папулярным. Па сюжэце гледачоў чакае гісторыя пра тое, як без пяці хвілін журналіст Яўген Маслоўскі трапляе пад выглядам кока ў асяроддзе маладых марачак.

І дзяўчаты тыя аказваюцца нямногія — яны дочкі «марскіх ваўкоў», якія жадаюць пайсці па слядах бацькоў, не зважаючы на цяжкія ўмовы, якія тут створаны для іх, каб страцілі інтарэс да прафесіі... Як у выніку складуцца ўзаемаадносіны маладых людзей, пабачым падчас сеанса. Ролі ў фільме выконвалі: Андрэй Градаў, Марына Шыманская, Святлана Пенкіна, Ігар Скляр і многія іншыя. Па-свойму папулярнае і судна «Цыклон», на якім адбываецца дзеянне карціны. Яно было пабудавана ў Нью-Ёрку ў 1944 годзе, а калі ў 1947-м яго перадалі СССР, частку шляху ў Адэсу яно прайшло сваім ходам. Пра гэтую яго вандроўку тады пісала ўся прэса. На момант здымак судна было апошнім амерыканскім буксірам, які быў перададзены ў рамках спецыяльнай праграмы дапамогі.

У эфіры тэлеканала АНТ на 8 сакавіка сярод іншага запланаваны паказ фільма «Карнавал», які быў зняты таксама ў 1981-м Таццянай Ліёзнавай (сюжэт рэжысёр узяла з уласнага жыцця). Тая самая гісторыя пра выпускніцу школы Ніну Саламаціну, якая прыязджае ў Маскву з марай стаць актрысай. І нягледзячы на тое што ў горадзе жыве яе бацька, дзяўчына спадзяецца толькі на ўласныя сілы, талент і на тых, хто здольны вылучыць і разгледзець яе сярод тысяч такіх, як і яна, летуценніц. Акрамя гісторыі пра валявую гераіню, гледачоў тут таксама чакае шмат добрай музыкі. Праўда, выконвае гэтыя песні не актрыса Мураўёва (Ніна), а Жанна Раждественская. А вось сярод акцёрскага складу можна ўбачыць Клару Лучко, Аляксандра Абдулава, Веру Васільеву і іншых. Ірына Мураўёва навучылася ездзіць на роліках, а за сваю ролю атрымала не толькі любоў гледача, але і была прызнана па выніках апытання публікі найлепшай актрысай 1982 года. Фільм варты ўвагі і сёння, бо ён — яшчэ адзін напамін пра тое, што ў жыцці сапраўды варта цаніць, а што ўвогуле не мае цаны.

А напярэдадні свята хочацца сказаць: верце ў сябе, дарагія жанчыны! І любіце сябе, бо гэта заўсёды будзе ўзаемна!

Алена ДРАПКО.

«На прыроду са «Звяздой»

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на II квартал або I паўгоддзе 2021 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 12 красавіка 2021 года ў рэдакцыю на адрас: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск.

Сярод падпісчыкаў 16 красавіка 2021 года будуць разыграны 7 тэрмасумак Bradex TD 0669 і суперпрыз — маслены радыятар General Climate. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 26 красавіка 2021 г.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 30 чэрвеня 2021 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на II квартал або I паўгоддзе 2021 г. і пашпарта. Пасля 30 чэрвеня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «На прыроду са «Звяздой» чытайце ў нумары 37 газеты «Звязда» ад 26 лютага.

Тэлефон для даведак (017) 263 66 73.

Тэрмін правядзення гульні — з 01.03.2021 да 30.06.2021.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3945 ад 23.02.2021 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на II квартал або I паўгоддзе 2021 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

Падпіска аформлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)
на II квартал або I паўгоддзе 2021 года

Жатні адрас і тэлефон _____ _____
(абавязкова) *(індэкс)*

Удачы ў розыгрышы!

Беларусь 1

5.45 Меладрама «Да цешчы на бліны». 1-я і 2-я серыі (12+).
7.55 Добрай раніцы, Беларусь!
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 Галоўны эфір.
10.20 Навіны надвор'я.
10.40, 11.50, 14.50, 20.50 Беларуская супержанчына.
10.45, 12.10, 15.45 Меладрама «Вялікія надзеі» (16+).
15.10 Адзін дзень (12+).
21.00 Панарама.
21.40 Зразумелая палітыка.
21.55 «Сэрца — дом для кахання». Канцэрт Таісіі Павалій (6+).
0.10 Меладрама «Без мяне» (16+).

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 16.25 Тэлебарометр.
9.05 «На тыдзень» (16+).
9.55 Меладрама «Прыгажуня» (12+).
12.05 Анімацыйны фільм «Гісторыя цацак» (0+).
13.20 Анімацыйны фільм «Гісторыя цацак-2» (0+).
14.50 Анімацыйны фільм «Гісторыя цацак: вялікія ўцёкі» (0+).
17.00 «Суперлато».
17.40 Прыгоды «Мсціўцы: вайна бясконцасці» (12+).

20.20, 21.15 Меладрама «Шапаголікі» (12+).
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНА.
22.30 Хачу ў тэлевізар!
22.35 «Арол і рэшка. Перазагрузка» (16+).
23.50 Меладрама «Вострыя прыправы і страсці» (12+).

Беларусь 3

7.20 «Нацыянальны хіт-парад».
8.15 «Варвара-краса, доўгая каса». Маст. фільм (6+).
9.35 «Беларуская кухня». Свініна, запечаная з бульбай.
10.00 «Беражыце жанчын». Маст. фільм (12+) [СЦ].
12.15 «Жывая спадчына».
12.45 «Чалавек з бульвара Капуцынаў». Маст. фільм (16+) [СЦ].
14.25 Канцэрт Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра імя І. Жыновіча «Маміна пласцінка».
15.15 «Па сямейных абставінах». Маст. фільм (12+) [СЦ].
17.35 Ф. Аляхновіч, Л. Родзевіч. «Адамавы жарты». Спектакль Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі.
19.05 «Вясна на Зарэчнай вуліцы». Маст. фільм (12+) [СЦ].

20.40 «Калыханка» (0+).
21.05 «Каханне зямное». Маст. фільм (12+) [СЦ].
22.35 «Лёс». Маст. фільм (12+) [СЦ].

АНТ

6.10, 9.00, 23.50 Фрыстайл. Чэмпіянат свету.
7.40, 11.05 Тэніс. WTA.
10.30 Вынікі тыдня.
16.40 Авертайм. КХЛ.
17.00 Хакей. КХЛ. Заходняя канферэнцыя. «Дынама-Мінск» — СКА (Санкт-Пецярбург). (У перапынках — Авертайм. КХЛ.)
19.20 Міні-футбол. Кваліфікацыя да ЧЕ-2022. Беларусь — Казахстан. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
21.20 На грані фолу. Футбольны агляд.
22.40 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
23.40 Спорт-цэнтр.

Беларусь 5

7.00, 9.00, 16.00, 20.30 Нашы навіны [СЦ].
7.10 Фільм «Жоўты карлік» (16+).
9.10 «Контуры».
10.05 Камедыя «Неверагодныя прыгоды італьянцаў у Расіі» (0+).
12.00 «Ці бачылі відэа?» (6+)
13.10 Маст. фільм «Карнавал» (0+)
16.20 Святочны канцэрт «Прызнанне ў каханні» (12+).
18.35 Фільм «Рыта» (16+).
21.00 «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
21.05 Серыял «40+, або Геаметрыя пачуццяў» (16+).

СТБ

6.10 «Як уладкаваны свет» (16+).
8.40 «Тыдзень».
10.15, 21.50 «Дзень. Неверагодна цікавых гісторый» (16+).
13.30, 16.30, 19.30 Навіны «24 гадзіны».
13.45 Дак. спецпраект (16+).
16.05, 16.45 «Маёр і Магія». Серыял (16+).
20.15 «СТБ-спорт».
20.20 Маст. фільм «Белыя росы» (12+).
0.10 «Суперцешча для няўдачніка». Маст. фільм (16+).
1.45 «Мінтранс» (16+).

МІР

5.00 Серыял «Цікаўная Варвара» [СЦ] (16+).
6.20 Маст. фільм «Майская ноч, або Тапельніца» (12+).
7.25 «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові». Да юбілею Аляксандра Роу (12+).
8.00,10.50, 16.15, 19.15 Серыял «Бабін бунт, ці Вайна ў Навасёлках» [СЦ] (16+).
10.00, 16.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
10.10 «Сусветныя лэдзі». Марыя Захарава (12+).
23.00 Маст. фільм «Дванаццаць крэслаў». 1—4-я серыі [СЦ] (12+).
4.20 Маст. фільм «Першая пальчатка» (0+).

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 20.00 Весткі.
11.15 «Плюс-мінус».
11.30 «У людзях».
12.15 «Петрасян і жанчыны» (16+).
14.40 «Дзявочнік». Святочны канцэрт, прысвечаны Міжнароднаму жаночаму дню.
16.25 Маст. фільм «Домакіраўніца» (12+).
21.00 Маст. фільм «Другая маладосць» (12+).
23.00 Святочнае шоу Валянціна Юдашкіна.

НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.15 Спорт-мікс.
6.25 Беларусы (6+).
7.05 «Здароўе» (12+).
8.00, 10.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.20 Фільм «Тонкая штучка» (16+).
10.20 Зламаць стэрэатыпы (12+).
10.40 Фільм «Расклад на паслязаўтра» (12+).
12.20 Дэтэктыў «Барс і Ляўка» (12+).
14.25 «Чакай мяне» (12+).
15.20, 16.20 Меладрама «Усім усяго добрага» (16+).
18.00, 19.25 Дэтэктыў «Балабон-4» (16+).
20.30 Баявік «Марскія д'яблы. Асаблівае заданне» (16+).
21.35 Фільм «Бацькі» (16+).
23.20 «Усе зоркі для каханай». Святочны канцэрт (12+).

8 канал

7.00, 15.15, 18.15, 21.00, 1.00 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05, 15.25 «Мультпарад». (6+).
7.30, 15.20, 20.45 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Серыял «Бывае і горш» (16+).
8.20 Серыял «Вістынг» (16+).
9.50 Дак. фільм «Трэнер на адраленцы» (12+).
10.05 Камедыя «Сэрцаедкі» (16+).
12.10 Серыял «Неўтаймоўны валадар» (16+).
12.55 Дак. фільм «Феномен кахання» (12+).
13.25 Камедыя «Французскі пацалунак» (16+).
16.40 Серыял «Жоўтае вока тыгра» (12+).
18.20 Серыял «Карона» (12+).
19.15 Серыял «Абараняючы Джэйкаба» (16+).
20.50 «Вечарніца» (6+).
21.05 Драма «Падмена» (16+).
23.25 Трылер «Смяротная сцежка» (18+).

ВТВ

6.05 «Дурні і дарогі» (16+).
7.25 Шоу «Раніца з гумарам» (16+).
9.25 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
10.00, 2.20 «Рогаў у справе» (16+).
11.00 Шоу «Міша псуе ўсё» (16+).
12.00 «Наш рамонт» (16+).
12.40 Анімацыйны фільм «Замбезія» (12+).
14.20 Серыял «Карані» (16+).
16.20 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
17.00, 22.00, 1.05 «Уральскія пельмені» (16+).
18.30 Фантастыка «Пяты элемент» (16+).
21.00 Шоу «Стэндап андэграўнд» (16+).
23.30 Travel-шоу «Селапаляцела» (16+).
0.15 «Кіно ў дэталях» (16+).
1.55 «Проста кухня» (16+).
3.10 «Даеш моладзь» (16+).
4.45 «6 кадраў» (16+).

Культура

6.30 «У заапарку — рамонт!», «Трам!, Добры дзень!», «Восеньскія карабліки», «Дзіўная бочка». «Вялікі сакрэт для маленькай кампаніі». М/ф.
7.30 «Краіна чараўніка Роу». Дак. фільм.
8.10 «Кашчэй Бессмяротны». Маст. фільм.
9.15 «Звычайны канцэрт»
9.45 «Мы — грамацеі!»
10.25 «Таня». Маст. фільм [СЦ].
12.20 «Вольга Якаўлева. Цішім голасам». Дак. фільм [СЦ].
13.00 Дыялогі пра жывёл. Сафары-парк у Геленджыку [СЦ].
13.45 «Іншыя Раманавы». «Другая лэдзі» [СЦ].
14.15, 0.20 «Выбар зброі». Маст. фільм.
16.30 «Карціна свету».
17.10 «Алібэк». Дак. фільм.
18.05 «Пешшу...» Масква Любімава [СЦ].
18.30 «Рамантыка рамансаў». Рыгору Панамарэнку прысвячаецца...
19.30 Навіны культуры.
20.10 «Паляванне на ліс». Маст. фільм [СЦ].
21.45 Шэдэўры сусветнага музычнага тэатра. Місці Коўпленд і Роберта Бале ў балеце С. Пракоф'ева «Рамэа і Джульета». Пастаноўка тэатра «Ла Скала».
2.35 «Каралеўскі бутэрброд», «Рускія напевы». М/ф для дарослых.

Настальгія

6.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1987-ы. 1-я частка. 2010 год (16+).
7.00, 9.40, 11.30, 13.15, 17.20, 17.45, 18.55, 21.40, 0.50, 3.40, 5.00 Музычная настальгія (12+).
7.15 Маст. фільм «Апёк» (16+).
9.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00 «Колба часу» (16+).
11.00 «Блеф-клуб» (16+).
12.00 Маст. фільм «Музычная гісторыя» (12+).
13.35 «Рытмічная гімнастыка». 1985 год (12+).
14.05 «Рок і вакол яго». Тэлемост Масква — Ленінград. 1987 год (16+).
15.00 «Быў час». 2009 год (16+).
16.00 Маст. фільм «Каханне — смяротная гульня» (16+).
17.35 «Сядзі і глядзі». 1994 год (16+).
18.00 «Народжаныя ў СССР». Найлепшае. 2014 год (12+).
19.15 «І жартам, і ўсур'ёз». 1987 год (16+).
20.00 Дак. фільм «Я вяртаю ваш партрэт». 1983 год (12+).
22.00 Маст. фільм «Сяброўка мая» (16+).
23.20 Дак. фільм «Фільм пра фільм. «Я крочу па Маскве». 2010 год (16+).
0.00 «Эліта Краіны Саветаў». 2007 год (12+).
1.15 Маст. фільм «Іншаземка» (12+).
2.25 «Ранішняя пошта». Мода. Мода. Мода. 1988 год (12+).
4.00 «Народжаныя ў СССР».

EuroSport 1

0.45, 6.30, 22.30 Фрыстайл. Чэмпіянат свету (12+).
1.45, 21.30 Веласпорт. Парыж — Ніца (12+).
2.45, 20.30 Веласпорт. Цірэна — Адрыятыка (12+).
3.30, 7.30 Снаўборд. Чэмпіянат свету (12+).
5.00, 11.25, 13.30, 19.15 Горныя лыжы. Кубак свету (12+).
8.30 Біятлон. Кубак свету. Нове-Места. Мужчыны. Пасьют (6+).
9.00 Біятлон. Кубак свету. Нове-Места. Жанчыны. Пасьют (6+).
9.30 Лыжныя гонкі. Кубак свету.
12.25 Біятлон. Кубак свету. Нове-Места. Змешаная эстафета.
15.30 Біятлон. Кубак свету. Нове-Места. Сінглмікст.
16.30 Лыжнае дваябор'е. Кубак свету (12+).
17.15 Скачкі на лыжах з трамплiна. Кубак свету (12+).

Кінакамедыя

0.55 З жыцця тайных агентаў (12+).
2.35 Смерць на пахаванні (16+).
4.15 Карпаратыў (16+).
5.55 Вулкан страсцей (12+).
7.35 Таксі-3 (16+).
9.10 Таксі-4 (16+).
10.50 Чаго жадае дзяўчына (12+).
12.45 Дрэнны Санта-2 (16+).
14.25 Браты з Грымсбі (18+).
15.55 Аслеплены жаданнямі (16+).
17.35 Маска (12+).
19.30 Дзень сурка (12+).
21.20 Суперняньк (16+).
22.55 Суперняньк-2 (16+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
8.00 «Улецы» (12+).
8.30 «Анамалія». Маст. фільм (12+).
10.05 «Глядзі сам» (16+).
10.20 «Выратуйце, я не ўмею гатаваць!» (12+)
11.10, 1.50 Серыял «Неспакойны ўчастак» (12+).
14.50 Анімацыйны фільм «Брыдкі Я-2» (0+).
16.30 Серыял «Каменнае сэрца» (12+).
20.40, 5.10 «Дзённік экстрасэнса» (16+).
21.45 «Глядзі сам» (16+).
22.00 «Фарсаж-6». Баявік (12+).
0.20 «Грым». Серыял (16+).
4.40 «Асцярожна: ашуканцы!» (16+)

ТБ1000

5.00 Чаго хочуць жанчыны (16+).
7.35 Добрай раніцы (16+).
9.35 Шэрлак: пачварная нявеста (16+).
11.20 Шэрлак (16+).
16.35 Вораг каля брамы (16+).
19.00 Піяніст (16+).
21.40 Чытальнік (16+).
23.55 Выбар капітана Карэлі (16+).
2.40 Правілы вінаробаў (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.30 ПіраММміда (16+).
7.35 Мая маручка (12+).
9.15 Нябесны суд (16+).
11.00 Падарунак з характарам (6+).
12.35 Дарагі тата (12+).
14.10 Параграф 78: фільм першы (16+).
15.40 Параграф 78: фільм другі (16+).
17.15 Нязломны (16+).
19.00 Ржэў (12+).
21.10 Адмірал (16+).
23.20 Мацільда (16+).
1.10 Стылягі (16+).
3.40 Падарунак з характарам (6+).

National Geographic

6.00 Фабрыка ежы (16+).
6.20, 2.00 Аўта-SOS (16+).
7.05 Навуковыя глупствы (16+).
7.35 Гульні розуму (16+).
8.25 Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня-5 (16+).
10.05 Тэхаскі ўлоў (16+).
11.45 Таемная гісторыя (16+).
13.25 Расследаванні авіякатастроф (16+).
15.55 Вострыў бунтароў (16+).
18.25 Схаваная жамчужына Турцыі (16+).
21.00, 22.40 Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
21.50 Панарама 360 ° Аб'ект сусветнай спадчыны (16+).
0.25 Гарачыя граніцы: Лацінская Амерыка (16+).
3.30 Асушыць акіян (16+).
5.10 Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).

Discovery

8.00, 19.57 Як гэта зроблена? (16+)
8.23, 19.03 Як гэта ўладкавана? (12+)
5.50 Зрабіць за адзін дзень (16+).

Discovery

8.00, 23.06 Бітвы за кантэйнеры (12+).
8.46, 11.25, 16.48, 22.12 Махінатары (12+).
9.39 Гульня камянёў (16+).
10.32, 21.18 Як гэта зроблена? (12+)
12.18 НАСА: невытлумачальныя матэрыялы (12+).
13.12, 7.15 Залатая ліхаманка (16+).
14.06, 0.00 Аперацыя «Выратаванне дома»: ранча Рэйні (12+).
15.00 Зроблена з другаснай сыравіны (12+).
15.54, 1.47 Музейныя загадкі (12+).
17.42 Склады: бітва ў Канадзе (16+).
18.36 Рэальныя дальнабойшчыкі (12+).
19.30, 3.30 Мяцежны гараж (16+).
20.24, 5.00 Паляўнічыя на старызну (12+).
0.54 Голыя і напалоханыя XL (16+).
2.40 Сіднейская бухта (12+).
4.15 Як гэта ўладкавана? (12+)
5.45 Голыя і напалоханыя (16+).

Беларусь 1

6.00, 7.30, 8.30 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
7.20, 8.20 Навіны эканомікі.
7.25, 8.25 «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
9.10 Серыял «След» (16+).
10.45 «Скажынемаўчы».
11.45, 12.10, 18.45 Меладрама «Нявеста, якая збегла» (16+).
13.05, 19.20 Меладрама «Нявеста, якая збегла». Заключная серыя (16+).
13.55 «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ]
14.35, 15.25 Меладрама «Дажыць да кахання» (12+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Сэнс жыцця. (12+).
17.30 Маршрут пабудаваны (12+).
18.15 «Зона Х». Вынікі тыдня (16+).
21.00 Панарама.
21.45 Клуб рэдактараў (16+).
22.25 Меладрама «Домік на шчасце-2» (16+).
2.10 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 16.25 Тэлебарометр.
9.05 Серыял «Сляпая» (16+).
10.15 «На нажах» (16+).
11.20, 18.25 Дэтэктыў «Унутры» (16+).
13.10 «Тры першыя спатканні» (16+).
14.00 «Камень, нажніцы, папера».
14.35, 17.25 «Арол і рэшка. Перазагрузка» (16+).
15.40 Нічога сабе ньюз (12+).
15.45 «Пін_код» (12+).
16.30 «Клон». Серыял (16+).
20.10, 21.20 «Бітва экстрасэнсаў» (16+).
21.10 Спортлато 5 з 36, КЕНА.
22.35 Трылер «Пакой страху» (12+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.20 «Беларуская кухня». Раўгеня з блінамі на калодзе.
8.05, 12.00,20.20, 23.45 Навіны культуры.
8.25, 18.20 «Людміла Гурчанка». Маст. фільм. 15-я і 16-я серыі, заключныя (12+).
10.00 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
10.30, 16.45 «Начное здарэнне». Маст. фільм (12+) [СЦ].
12.50 «Сіла веры».
13.15, 21.05 «Апошні дзень». Сяргей Міхалкоў (12+).
13.55, 21.40 «Ліквідацыя». Маст. фільм (16+) [СЦ].
15.30 Канцэрт ВІА «Сіняя птица».
19.55 «Гісторыя Беларусі. Бітвы». Клецкая бітва.
20.40 «Калыханка» (0+).
23.20 «Запіскі на палях». Алесь Адамовіч: голас знямелых [СЦ].

Беларусь 5

6.00, 16.00 Тэніс. WTA.
8.00, 22.55 Фрыстайл. Лыжная акрабатыка. Чэмпіянат свету.
9.05 Футбол. Ліга Еўропы. 1/8 фіналу. Першы матч. Дынама (Кіеў, Украіна) — Вільярэал (Іспанія).
11.05 Свет англійскай прэм'ер-лігі. Відэачасопіс.
11.35 Футбол. Ліга Еўропы. 1/8 фіналу. Першы матч. «Арсенал» (Англія) — «Алімпіякас» (Грэцыя).
13.35 Біятлон. Кубак свету. Нове-Места. Спрынт. Мужчыны.
15.05 Вось гэта спорт!
15.25 Авертайм.
17.20 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. ФК «Іслач» — «Славія» (Мазыр). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
19.20 Хакей. КХЛ. Заходняя канферэнцыя. (У перапынках — Спорт-цэнтр.) / Біятлон. Кубак свету. Нове-Места. Спрынт. Жанчыны.
21.50 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/8 фіналу. Першыя матчы. Агляд.
22.45 Спорт-цэнтр.

АНТ

6.00, 7.10, 8.10, 9.10 «Наша раніца».
7.00 [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 0.45** Нашы навіны.
10.00 «Жыць здорава!» (16+)
11.15 «Модны прыгавор» (6+).
12.20 «Бесталковыя нататкі» (12+).
13.15, 22.45 Серыял «Фурцава. Легенда пра Кацярыну» (16+).
15.10 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20 «Трывожная кнопка» (16+).
16.45, 18.20 «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
18.50 «Поле цудаў» (16+).
20.00 Час.
21.10 «Голас. Дзеці» (0+).

СТБ

6.00, 6.40, 7.45 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
9.00 «Загадкі чалавецтва» (16+).
10.40 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.20, 20.45, 1.00 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 23.20 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.40, 21.30 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
15.40, 16.50 «Рэха з мінулага». Серыял (16+).
20.15, 23.15 «СТБ-спорт».
20.20 «Сталічныя падрабязнасці».
20.30 «Міншчына».
22.15 «Глядзець усім!» (16+)

МІР

5.00 Маст. фільм «Сэрцы чатырох» (12+).
6.00 Маст. фільм «Дамы запрашаюць кавалераў» [СЦ] (6+).
7.25, 10.20, 17.00 Серыял «Знахар-2» [СЦ] (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00 Навіны (бягучы радок).
10.10 «У гасцях у лічбы» (12+).
13.15 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.10, 16.20 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
19.15 Ток-шоу «Слабае звяно» (12+).
20.15 «Гульня ў кіно» (12+).
21.00 «Сусветныя гульні розуму» (12+).
21.40 Маст. фільм «Ахоўнік для дачкі» [СЦ] (16+).
0.00 «Начны экспрэс». Мураками (16+).
1.20 Маст. фільм «На кручку!» (16+)
2.40 Маст. фільм «Трыццаць першага чэрвеня» (12+).
4.50 М/ф (0+).

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
12.35 Серыял «Вой, ма-мачкі!..» (12+)
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.40 Серыял «Скліфасоўскі» (12+).
17.15 «60 хвілін». Ток-шоу.
18.35 «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
21.05 Серыял «Нябёсы пачакаюць» (16+).
23.10 «Дом культуры і смеху» (16+).

НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.05, 7.00, 8.20, 16.20, 19.35, 22.05, 23.25 Сёння. Галоўнае.
6.15 Спорт-мікс.
6.25 «Беларусы» (6+).
7.15 «Здароўе» (12+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.30 Сфера інтарэсаў.
8.55 «Навукаманія» (6+).
9.25, 22.10 «НЗ.by».
9.45, 10.20 Дэтэктыў «Нагляднчык маяка» (16+).
11.10, 13.50 Серыял «Пчаляр» (16+).
13.20 Надзвычайнае здарэнне.
14.50 Пракурорская праверка (16+).
16.25 Гісторыі выратавання (12+).
16.55 «ДНК» (16+).
18.00, 19.50 Дэтэктыў «Балабон-4» (16+).
21.00 Баявік «Марскія д'яблы. Асаблівае заданне» (16+).
22.35, 23.40 Фільм «Зброя» (16+).

8 канал

7.00, 15.40, 19.15, 21.00, 1.20 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05, 15.50 «Мультпарад». (6+).
7.30, 15.45, 20.45 «Прыколы 13-й школы».
7.35 Серыял «Бывае і горш» (16+).
8.20, 19.40 Серыял «Абараняючы Джэйкаба» (16+).
9.15, 18.15 Серыял «Карона» (12+).
10.05 Дак. фільм «Агаф'я» (12+).
11.10 Меладрама «Вікторыя» (16+).
12.40 Фантастыка «Мсціўцы. Фінал» (16+).
16.10 «Гатуй як шэф» (12+).
16.30 Серыял «Жоўтае вока тыгра» (12+).
20.50 «Вечарніца» (6+).
21.05 «Героі коміксаў на экране». «Пунсовая ведзьма» (12+).
23.40 Трылер «Выкрадзеная» (16+).

ВТВ

6.05 «Дурні і дарогі» (16+).
7.00, 14.20 Шоу «Раніца з гумарам» (16+).
10.45, 21.30 Серыял «Івановы-Ивановы» (16+).
12.20 «Лаві момант» (16+).
13.15, 2.40 Серыял «Варонiны» (12+).
16.20, 1.50 Серыял «Пекар і прыгажуня» (16+).
17.25 «Уральскія пельмені» (16+).
18.30 Серыял «Атэль «Элеон» (16+).
20.30 Серыял «Дылды» (16+).
23.00 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
0.05, 3.55 Серыял «Беларуссаводдзе. Таямніца закінутай краіны» (16+).
1.00 Серыял «Маладзёжка» (16+).
4.45 «6 кадраў» (16+).

Культура

6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.50 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу…» Асабнякі маскоўскага купецтва.
7.05, 20.05 «Правілы жыцця».
7.35, 18.35, 0.10 «Жанчыны-вікінгі». Дак. фільм «Гнеў Сігрун і адкрыццё Ісландыі» [СЦ].
8.35 Колер часу. Эдгар Дэга.
8.45 «Шукайце жанчыну». Маст. фільм [СЦ].
10.15 «Назіральнік».
11.10, 1.05 XX стагоддзе. «Сустрэча з Аляксеем Баталавым».
12.20, 22.20 «Людміла Гурчанка». Серыял [СЦ].
13.50 «Закахацца ў Арктыку». Дак. серыял. «Арктыка. Тэрыторыя адкрыццяў» [СЦ].
14.20 «Архіў асаблівай важнасці». Дак. фільм.
15.05 Навіны. Падрабязна. Кіно.
15.20 «Біблейскі сюжэт».
15.50 «Кнігі, якія зазірнулі ў будучыню». Дак. серыял. «Жуль Верн» [СЦ].
16.20 «Мэры Попінс, да пабачэння!» Маст. фільм.
17.35 Вялікі палац Музея-запаведніка «Царыцына». Аляксандр Бузлоў і Андрэй Гугнін. В. А. Мошарт. Сачыненні для віяланчэлі і фартэпіяна.
19.45 Галоўная роля.
20.30 «Добрай ночы, малыя!»
20.45 Абсалютны слых.
21.25 95 гадоў Аляксандру Зацэпіну. Лінія жыцця [СЦ].
2.10 «Архіў асаблівай важнасці». Дак. фільм.

Настальгія

6.00 «Аншлаг! Аншлаг!» (12+)
7.05, 8.45, 9.40, 11.00, 11.30, 15.40,17.00, 20.25, 21.40, 23.00, 2.20 Музычная настальгія (12+).
7.20 Маст. фільм «Двое пад адным парасонам» (16+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00 «Народжаныя ў СССР».
11.20 «Сядзі і глядзі». 1994 год (18+).
12.00 «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Савецкія ўласкары ЦТ». 2007 год (16+).
12.50 Фільм-канцэрт «Чатыры інтэрв'ю з зімой». 1983 год (12+).
13.55 Маст. фільм «Сяргееў шукае Сяргеева» (16+).
18.00 «Спяем, сябры!» з Наталляй Казялковай. 2005 год (12+).
19.00 Маст. фільм «Мільён у шлюбным кошыку» (16+).
0.00 «Народжаныя ў СССР. Найлепшае. «8 Сакавіка». 2007 год (12+).
0.55 «Тэатральныя сустрэчы». 1978 год (12+).
3.40 Маст. фільм «Дамы ўдаўца» (16+).
5.20 «Блеф-клуб» (16+).

EuroSport 1

0.00, 4.15 Веласпорт. «Страдэ Б'янке» (12+).
1.00, 8.00 Лыжнае двайбор'е. Чэмпіянат свету (12+).
3.30, 10.30, 15.30, 19.00, 23.00 Веласпорт. Рыбалоўства — Ніца (12+).
5.00, 18.00 Снукер. Gibraltar Open (6+).
12.30 Біятлон. Кубак свету. Нове-Места. Жанчыны. Спрынт (6+).
13.30 Біятлон. Кубак свету. Нове-Места. Жанчыны. Пасьют (6+).
14.00 Біятлон. Кубак свету. Нове-Места. Мужчыны. Спрынт (6+).
15.00 Біятлон. Кубак свету. Нове-Места. Мужчыны. Пасьют (6+).
20.00 Веласпорт. Цірэна — Адрыятыка (12+).
21.00 Горныя лыжы. Кубак свету (12+).

Кінакамедыя

0.35 Таксі-3 (16+).
2.10 Таксі-4 (16+).
3.50 Галівудскія копы (12+).
6.00 Шанхайскія рыцары (12+).
8.05 Дзяжурны тата (6+).
9.55 Турэцкая для пачаткоўцаў (16+).
11.50 Дзень сурка (12+).
13.45 Шэрлак Холмс: Гульня ценяў (12+).
16.05 Таксі-2 (16+).
17.40 100 мільёнаў еўра (16+).
19.30 Целаахоўнік кілера (18+).
21.40 Дрэнны Санта-2 (16+).
23.20 Superнянь-2 (16+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.50 «Перыскоп» (16+).
10.10, 16.05, 4.30 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
11.10 «Паралельны свет» (12+).
12.10, 18.45, 2.45 «Сляпая» (16+).
13.20, 19.55 «Варажбітка» (12+).
14.30, 3.40 «Містычныя гісторыі» (12+).
15.30 «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
17.10 «Знакі лёсу» (16+).
17.45 «Паралельны свет» (12+).
21.05 «Вечнасць». Серыял (16+).
22.55 «Грым». Серыял (16+).
23.50 «Глядзі сам» (16+).
0.05 «10 самых» (16+).
0.40 «Лінія абароны» (16+).
1.15 «Тэлепорт». Маст. фільм (16+).

ТВ1000 ТБ1000

5.00 Шчаслівы выпадак (12+).
7.10 Адпачынак па абмене (16+).
9.55 Маленькі Манхэтэн (12+).
11.30 Чатыры вяселлі і адно пахаванне (12+).
13.40 Шэрлак (16+).
19.00 Еш, маліся, кахай (16+).
21.30 Усмешка Моны Лізы (12+).
23.40 Правілы вінаробаў (16+).
1.55 Вялікія вочы (16+).
3.30 Добрай раніцы (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.50, 15.35 Усё ці нічога (16+).
7.40, 1.55 ПіраММміда (16+).
10.00 Марафон жаданняў (16+).
11.45 Цвярозы кіроўца (16+).
13.35, 19.00 Маладая гвардыя (16+).
17.10 Нянькі (16+).
21.00 Ну, прывітанне, Аксана Сакалова! (16+)
22.45 Дублёр (16+).
0.20 Начная змена (18+).
3.40 Ван Гогі (16+).

National Geographic

6.00 Зрабіць за адзін дзень (16+).
6.20 Навуковыя глупствы (16+).
6.45 Гульні розуму (16+).
7.30 Ледзяная дарога (16+).
8.20 Падарожжы з Гордданам Рамзі-2 (16+).
9.10 Машыны: разабраць і прадаць (16+).
10.00, 13.25, 22.40, 1.55 Аўта-SOS (16+).
11.45 Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня-6 (16+).
12.35, 16.45 Наркавойны (16+).
14.15, 23.30 Ліхтугі за мяжой: злачынства і пакаранне (16+).
15.05, 19.20, 0.20 Расследаванні авіякатастроф (16+).
15.55 Служба бяспекі аэрапорта: Бразілія і Перу (16+).
17.40 У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
18.30 Фабрыка ежы (16+).
21.00, 3.30 Аляска: новае пакаленне (16+).
21.50 Вострай бунтаroй (16+).
1.10, 4.20 Асушыць акіян (16+).
5.05 Служба выратавання Аляскі (16+).

Discovery

8.00 Бітвы за кантэйнеры (12+).
8.46, 11.25, 16.48, 22.12 Махінатары (12+).
9.39 Гульня камянёў (16+).
10.32, 21.18 Як гэта зроблена? (12+)
12.18, 6.08 Фукусіма: праход забаронены (12+).
13.12, 6.53 Стварэнне вакцыны супраць каранавіруса (12+).
14.33, 0.00 Голыя і напалоханыя XL (16+).
15.27, 5.00 Як гэта ўладкавана? (12+)
15.54 Музейныя загадкі (12+).
17.42 Склады: бітва ў Канадзе (16+).
18.36 Рэальныя дальнабойшчыкі (12+).
19.30, 4.15 Мяцежны гараж (16+).
20.24, 5.23 Паляўнічыя на старызну (12+).
23.06 Бітвы за кантэйнеры (12+).
2.40 Чыгунка Аляскі (16+).
3.30 Узрываючы гісторыю (12+).

чацвер, 11 сакавіка ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10 «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
9.10, 22.15 Серыял «След» (16+).
10.45 «Скажынемаўчы».
11.45, 12.10, 13.05, 18.35, 19.20 Меладрама «Нявеста, якая збегла» (16+).
13.55 «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ]
14.40, 15.25 Меладрама «Дажыць да кахання» (12+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Беларуская часінка.
18.15, 0.30 «Зона Х». Крымінальныя навіны (16+).
21.00 Панарама.
21.45 Адзін дзень (12+).
0.10 Сфера інтарэсаў.
0.55 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 16.25 Тэлебарометр.
9.05, 20.10 Серыял «Сляпая» (16+).
10.10, 22.45 «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
11.20, 18.20 Дэтэктыў «Унутры» (16+).
13.05 «Да пабачэння» (16+).
13.55 «Камень, нажніцы, папера».
14.30, 17.25 «Арол і рэшка. Перазагрузка» (16+).
15.40 Нічога сабе ньюз (12+).
15.45 «ПІН_КОД» (12+).
16.30 «Клон». Серыял (16+).
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНА.
21.25 «Развод і дзявочае прозвішча» (16+).
23.55 Серыял «Анатомія страсці» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.15 «Беларуская кухня». Сашэнь.
8.05, 12.00, 20.20, 23.45 Навіны культуры.
8.25, 18.20 «Людміла Гурчанка». Маст. фільм (12+).
10.00 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
10.30, 16.55 «Гараджане». Маст. фільм (12+) [СЦ].
12.40 «Сваімі словамі». Тэлевікторына.
13.20, 21.05 «Апошні дзень». Георгій Юматаў (12+).
14.00, 21.40 «Ліквідацыя». Маст. фільм (16+) [СЦ].
15.35 «Удзячным вам». Канцэрт ансамбля «Сябры».
19.55 «Арт-гісторыі». Мастак Васіль Пукіраў і яго карціна «Няроўны шлюб».
20.40 «Калыханка» (0+).
23.20 «Запіскі на палях». Сяргей Грахоўскі: паэзія і проза жыцця [СЦ].

Беларусь 5

6.10 Слэм-данк.
6.40 Хакей. КХЛ. Заходняя канферэнцыя. / Хакей. Чэмпіянат Беларусі. П 10.03.
8.35 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. 1/8 фіналу. Матч у адказ. «Ліверпуль» (Англія) — «Лейпцыг» (Германія).
10.30 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. 1/8 фіналу. Матчы ў адказ. Дзённік.
11.00 Агнявы рубеж.
11.30 На шляху да Токіа. Відэасапіс.
12.00 Фрыстайл. Лыжная акрабатыка. Чэмпіянат свету.
13.00, 18.00 Тэніс. WTA.
17.00 Вось гэта спорт!
17.15 Хакей для ўсіх.
17.50 Спорт-цэнтр.
19.30 Біятлон. Кубак свету. Нове-Места. Спрынт. Мужчыны.
20.50 Футбол. Ліга Еўропы. 1/8 фіналу. «Манчэстэр Юнайтэд» (Англія) — «Мілан» (Італія). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
22.50 Футбол. Ліга Еўропы. 1/8 фіналу. «Рома» (Італія) — «Шахцёр» (Данецк, Украіна). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

АНТ

6.00, 7.15, 8.15, 9.10 «Наша раніца».
7.00 [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 0.40** Нашы навіны.
7.10, 8.10 «Трывожная кнопка» (16+).
9.10 «Аб'ектыўНа» (16+).
10.10 «Жыць здорава!» (16+)
11.15 «Модны прыгавор» (6+).
12.20 «Бесталковыя нататкі» (12+).
13.15, 22.40 Серыял «Фурцава. Легенда пра Кацярыну» (16+).
15.10 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20 «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
17.20, 18.20 «На самай справе» (16+).
18.50 «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
18.55 «Няхай гавораць» (16+).
20.00 Час.
21.10 «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
21.40 «Угрум-рака». Серыял (16+).

СТБ

6.00, 6.40, 7.45 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
9.00, 0.10 «Загадкі чалавецтва» (16+).
10.40 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.20, 20.45, 1.00 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 23.20 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.40, 21.30 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
16.05, 16.50 «Маёр і Магія». Серыял (16+).
20.15, 23.15 «СТБ-спорт».
20.20 «Сталічныя падрабязнасці».
20.30 «Міншчына».
22.20 «Глядзець усім!» (16+)

МІР

5.00 Маст. фільм «Варатар» [СЦ] (16+).
5.50 «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (12+).
6.30 Маст. фільм «Лузер» (16+).
8.45, 10.10 Серыял «Знахар» [СЦ] (16+)
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00 Навіны (бягучы радок).
13.15 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.10, 17.15, 1.55 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05, 2.40 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
16.15 «Міравое пагадненне» (16+).
18.00, 19.25 Серыял «Знахар-2» [СЦ] (16+).
21.40 «Гульня ў кіно» (12+).
22.25 «Назад у будучыню» (12+).
23.25 «Сусветныя гульні розуму» (12+).
0.15 Маст. фільм «Небяспечныя гастролі» (12+).
4.20 Маст. фільм «Сэрцы чатырох» (12+).

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
12.35 Серыял «Вой, ма-мачкі!..» (12+)
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.40 Серыял «Скліфасоўскі» (12+).
17.15 «60 хвілін». Ток-шоу.
18.35 «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
21.05 Серыял «Нябёсы пачакаюць» (16+).
23.10 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.05, 7.00, 8.20, 16.20, 19.35, 22.05, 23.25 Сёння. Галоўнае.
6.15 Спорт-мікс.
6.25 Беларусы (6+).
7.15 «Здароўе» (12+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.30 Сфера інтарэсаў.
8.55 «Навукаманія» (6+).
9.25, 22.10 «НЗ.by».
9.45, 10.20 Дэтэктыў «Наглядчык маяка» (16+).
11.10, 13.50 Серыял «Пчаляр» (16+).
13.20 Надзвычайнае здарэнне.
14.50 Пракурорская праверка (16+).
16.25 Гісторыі выратавання (12+).
16.55 «ДНК» (16+).
18.00, 19.50 Дэтэктыў «Балабон-4» (16+).
21.00 Баявік «Марскія д'яблы. Асаблівае заданне» (16+).
22.25 Серыял «Паравозчык» (16+).
23.40 «Справа ўрачоў» (16+).

8 канал

7.00, 15.20, 18.40, 21.00 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05, 15.25 «Мультпарад». (6+).
7.30, 20.45 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Серыял «Бывае і горш» (16+).
8.20, 19.50 Серыял «Абараняючы Джэйкаба» (16+).
9.55, 18.45 Серыял «Карона» (12+).
10.50 СБ ТБ «Гараскоп».
11.00 Драма «Асноўны інстынкт» (16+).
13.10 Камедыя «Сабака на сене» (12+).
16.50 Серыял «Жоўтае вока тыгра» (12+).
19.35 «Фэшн is my прафэшн» (12+).
20.50 «Вечарніца» (6+).
21.05 Меладрама «Вікторыя» (16+).
22.30 Фантастыка «Мсціўцы. Вайна бясконцасці» (16+).
1.00 «Надвор'е».

ВТВ

6.05 «Дурні і дарогі» (16+).
7.00, 14.20 Шоу «Раніца з гумарам» (16+).
10.45, 21.30 Серыял «Івановы-Ивановы» (16+).
12.20 «Лаві момант» (16+).
13.15, 2.40 Серыял «Варонiны» (12+).
16.20, 1.50 Серыял «Пекар і прыгажуня» (16+).
17.25 «Уральскія пельмені» (16+).
18.30 Серыял «Атэль «Элеон» (16+).
20.30 Серыял «Дылды» (16+).
23.00 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
0.05, 3.55 Серыял «Беларуская таямніца закінутай краіны» (16+).
1.00 Серыял «Маладзёжка» (16+).
4.45 «6 кадраў» (16+).

Культура

6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.50 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...» Масква баярская.
7.05 «Правілы жыцця».
7.35, 18.35, 0.10 «Жанчыны-вікінгі». Дак. фільм «Спадчына Ёвы і падзенне Хэдэбю» [СЦ].
8.35 Прыгожая планета.
8.50, 16.20 «Інспектар Гул». Маст. фільм [СЦ].
10.15 «Назіральнік».
11.10, 1.05 XX стагоддзе. «Чароўны ліхтар».
12.05, 22.20 «Людміла Гурчанка». Серыял [СЦ].
13.35 Колер часу. Рэнэ Магрыт.
13.50 «Закахацца ў Арктыку». Дак. серыял. «На крызе, як на Брыганціне» [СЦ].
14.20 Астравы. Аркадзь Мігдал.
15.05 Навіны. Падрабязна. Тэатр.
15.20 Пернікавы домік. «Нацыянальны касцюм аланаў» [СЦ].
15.50 «Кнігі, якія зазірнулі ў будучыню». Дак. серыял. «Рэй Брэдберы» [СЦ].
17.25 Колер часу. Васіль Кандзінскі. «Жоўты гук».
17.35, 1.55 Вялікі палац Музея-запаведніка «Царыцына». Дзмітрый Маслееў. Л. Бетховен. Сачыненні для фартэпіяна.
19.45 Галоўная роля.
20.10 Адкрытая кніга. Аляксандр Сегень. «Знамя тваіх перамог» [СЦ].
20.40 «Добрай ночы, малыя!»
20.55 Кіно пра кіно. «Сабачае сэрца». Піва Шарыкаву не прапаноўваць!» Дак. фільм [СЦ].
21.35 «Энігма». Бары Коскі.

Настальгія

6.00 «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Савецкія ўласкары ЦТ». 2007 год (16+).
6.50 Фільм-канцэрт «Чатыры інтэрв'ю з зімой». 1983 год (12+).
7.55 Маст. фільм «Сяргееў шукае Сяргеева» (16+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
9.40, 11.00, 14.25, 15.40, 17.00, 18.50, 21.40, 23.00, 1.05, 2.45, 3.40, 5.00, 5.30 Музычная настальгія (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР».
12.00 «Спяем, сябры!» з Наталляй Казялковай. 2005 год (12+).
13.00 Маст. фільм «Мільён у шлюбным кошыку» (16+).
18.00 «Эліта Краіны Саветаў». 2007 год (12+).
19.15 Маст. фільм «Іншаземка» (12+).
20.25 «Ранішняя пошта». Мода. Мода. Мода. 1988 год (12+).
0.00 «Аншлаг! Аншлаг!» (12+).
1.20 Маст. фільм «Двое пад адным парасонам» (16+).
5.20 «Сядзі і глядзі». 1994 год (18+).

EuroSport 1

0.00, 4.15, 11.30 Веласпорт. Цірэна — Адрыятыка (12+).
1.00, 20.50 Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету (6+).
3.30, 10.30, 15.30, 23.00 Веласпорт. Парыж — Ніца (12+).
5.00 Скачкі на лыжах з трамплiна. Чэмпіянат свету (12+).
8.00, 18.00, 22.00 Біятлон. Кубак свету (6+).
12.30 Зімовыя віды спорту. Агляд (12+).
15.00 Гольф. PGA-тур. Агляд (6+).

Кінакамедыя

1.00 Каханне ў вялікім горадзе (16+).

2.35 Каханне ў вялікім горадзе-2 (16+).
4.10 Каханне ў вялікім горадзе-3 (16+).
5.40 Вулкан страсцей (12+).
7.20 Шэрлак Холмс (12+).
9.40 Шэрлак Холмс: Гульня ценяў (12+).
12.00 Прыгажунчык са стажам (16+).
13.45 Целаахоўнік кілера (18+).
15.55 Таксі-3 (16+).
17.30 Чаго жадае дзяўчына (12+).
19.30 Маска (12+).
21.20 Прыгоды Падынгтана (12+).
23.00 Шанхайскія рыцары (12+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.40, 23.40 «Улегцы» (12+).
10.10, 16.05, 4.30 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
11.10 «Паралельны свет» (12+).
12.10, 18.40 «Сляпая» (16+).
13.20, 19.50, 4.00 «Варажбітка» (12+).
14.30, 3.10 «Містычныя гісторыі» (12+).
15.30 «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
17.05 «Знакі лёсу» (16+).
17.40 «Паралельны свет» (12+).
21.00 «Вечнасць». Серыял (16+).
22.50 «Грым». Серыял (16+).
0.15 «Знак якасці» (16+).
1.05 «Фарсаж-5». Маст. фільм (16+).

ТБ1000

5.15 Вялікія вочы (16+).
6.55 Правілы вінаробаў (16+).
9.05 Усмешка Моны Лізы (12+).
11.15 Еш, маліся, кахай (16+).
13.50 Шэрлак (16+).
19.00 Эдвард рукі-нажніцы (12+).
20.55 Прынцэса-нявеста (6+).
22.40 Апошняе каханне на Зямлі (16+).
0.20 Чаго хочуць жанчыны (16+).
2.35 Чатыры вяселлі і адно пахаванне (12+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.30 Уцячы, дагнаць, закахацца (12+).
7.05, 15.50 Марафон жаданняў (16+).
8.40 Пяць нявест (16+).
10.35 Дублёр (16+).
12.05 Нянькі (16+).
13.50, 19.05 Маладая гвардыя (16+).
17.30 Падарунак з характарам (6+).
21.10 Бабуля лёгкіх паводзін (16+).
22.45 Бабуля лёгкіх паводзін-2. Састарэлыя мсціўцы (16+).
0.15 Мамы (12+).
2.15 Мамы-3 (12+).
4.00 Я худзею (16+).

National Geographic

6.00 Навуковыя глупствы (16+).
6.30 Гульні розуму (16+).
7.15 Ледзяная дарога (16+).
8.05 Падарожжы з Гордданам Рамзі-2 (16+).
9.00 Машыны: разабраць і прадаць (16+).
9.50, 13.15, 22.40, 1.55 Аўта-SOS (16+).
11.30 Дзікі тунец: Поўначсупраць Поўдня-6 (16+).
12.25, 16.40 Аляска: новае пакаленне (16+).
14.05, 23.30 Ліхтугі за мяжой: злачынства і пакаранне (16+).
15.00, 19.15, 0.20, 3.30 Расследаванні авіякатастроф (16+).
15.50, 21.50 Служба бяспекі аэрапорта: першы клас (16+).
17.30 У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
18.25 Фабрыка ежы (16+).
1.10, 4.20 Асушыць акіян (16+).
5.10 Тэхаскі ўлоў (16+).

Discovery

8.00, 23.06 Бітвы за кантэйнеры (12+).
8.46, 11.25, 16.48, 22.12 Махінатары (12+).
9.39 Гульня камянёў (16+).
10.32, 21.18 Як гэта зроблена? (12+)
12.18 НАСА: невытлумачальныя матэрыялы (12+).
13.12 Экспедыцыя на край зямлі (12+).
13.39 Дабітыя тачкі (12+).
15.00 Зроблена з другаснай сыравіны (12+).
15.54, 1.47 Музейныя загадкі (18+).
17.42 Склады: бітва ў Канадзе (16+).
18.36 Рэальныя дальнабойшчыкі (12+).
19.30, 3.30 Мяцежны гараж (16+).
20.24, 5.00 Паляўнічыя на старызну (12+).
0.00 Залатая ліхаманка (16+).
0.54, 7.15 Голыя і напалоханыя XL (16+).
2.40 Сіднейская бухта (12+).
4.15 Як гэта ўладкавана? (12+)
5.45 Голыя і напалоханыя (16+).

МОЛАДЗЬ — У ТОПЕ

Сустрэчы сенатараў з моладдзю — добрая дапамога ў вывучэнні існуючых праблем у маладзёжным асяроддзі і выпрацоўцы падыходаў па іх вырашэнні

ПРЫКЛАД у гэтай справе дэманструе старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА, якая ўжо неаднойчы сустракалася і вяла актыўны дыялог са студэнтамі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта як у сценах гэтай вядучай навучальнай установы краіны, так і ў будынку верхняй палаты парламента. Прымала яна і дэлегацыю навучэнцаў Полацкага каледжа Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава, рэгулярна цікавіцца і дапамагае развіццю Маладзёжнага савета (парламента) пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь. У актыве Наталлі Качанавай — зацікаўленая і плённая размова з удзельнікамі VIII Беларуска-расійскага маладзёжнага форуму, шмат іншых падобных мерапрыемстваў.

Фота БелТА.

Можна сказаць, што сёння маладзёжная тэматыка ўвогуле знаходзіцца ў топе дзейнасці сенатараў. У рамках рэалізацыі праекта «Школа актыўнага грамадзяніна» старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей Сівец, так бы мовіць, на сваёй тэрыторыі, у памяшканні верхняй палаты сустрэўся з вучнямі мінскай сярэдняй школы № 117. Паводле водгукаў юных гасцей, яны былі ўражаны змястоўнай экскурсіяй па музеі Савета Рэспублікі, аповедам пра спецыфіку работы верхняй палаты Нацыянальнага сходу, шчырымі адказамі Сяргея Сіўца на пытанні.

Пазней расказалі журналістам, што засталіся задаволеныя ўбачаным і пачутым у Савеце Рэспублікі. Вось два меркаванні. Дзмітрый Сацэвіч: «Вельмі добра, што нас сюды паклікалі, бо моладзь трэба знаёміць з палітыкай». Ілья Ясенскі: «Гэта была цікавая і пазнавальная сустрэча. Мяне заўсёды цікавіла гісторыя Беларусі, нашы традыцыі». Такія сустрэчы ў Савеце Рэспублікі мяркуюць зрабіць традыцыйнымі.

У сваю чаргу, Сяргей Сівец называе карыснымі падобныя мерапрыемствы. У моладзі з'яўляецца магчымасць адчуць сябе непасрэднымі ўдзельнікамі заканатворчага працэсу. Яны знаёмяцца з гісторыяй верхняй палаты парламента і Нацыянальнага сходу ў цэлым, нібы прапускаючы праз сябе ўсю тую адказнасць, з якой сутыкаюцца парламентарыі. І, вядома, гэта сур'ёзна пашырае светапогляд і кругагляд маладых людзей, лічыць Сяргей Сівец.

Апошнім часам пачасціліся кантакты членаў Савета Рэспублікі з моладдзю і ў рэгіёнах краіны. Такія сустрэчы дазваляюць сенатарам лепш і з першых вуснаў пачуць аб тым, што на самай справе хвалюе юнакоў і дзяўчат. У выніку ўдаецца абмеркаваць даволі шырокае кола пытанняў, выслухаць аўтараў ініцыятыў і прапаноў.

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар Лісковіч у рамках рабочай паездкі на Гродзеншчыну ў фармаце дыялогавай пляцоўкі правёў сустрэчу з навучэнцамі Навагрудскага дзяржаўнага сельскагаспадарчага прафесійнага ліцэя. Сенатар і яго суразмоўцы абмяняліся думкамі аб тым, як зацікавіць маладых людзей авалодваць рабочымі спецыяльнасцямі, як увогуле павысіць прэстыж рабочых прафесій.

Напрыклад, у ліцэі і яго філіяле 300 юнакоў і дзяўчат атрымліваюць прафесіі повара, афіцыянта, трактарыста, электрагазазваршчыка і іншыя. Паспяхова развіваецца таксама навучанне па аграрных спецыяльнасцях. Увогуле цікавасць да рабочых прафесій трэба прывіваць яшчэ нават з дзіцячага садка, а ўжо ў школе стварацца умовы для іх асваення, адзначыў у ходзе размовы парламентарый.

Заўважана, што ўсё большую цікавасць у юнакоў і дзяўчат выклікае дзейнасць так званых маладзёжных парламентарыяў. Яны таксама па меры магчымасці ладзяць сустрэчы з маладымі людзьмі ў рэгіёнах. Так, у Брэсцкім раёне на базе дзіцячай школы мастацтваў і сярэдняй школы аграгарадка Клейнікі адбылася дыялогавая пляцоўка «Беларусь будучыні». На сустрэчу з членамі камісіі па пытаннях адукацыі, навукі і культуры Маладзёжнага савета (парламента) пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь Віктарыяй Саляйчук і Максімам Сыцэвічам былі запрошаны вясковыя вучні і педагогі.

Школьнікі з цікавасцю слухалі гасцей, якія расказвалі аб паўнамоцтвах членаў Маладзёжнага парламента, яго задачах, удзеле ў распрацоўцы праектаў нарматыўных прававых актаў, што закранаюць законныя інтарэсы моладзі, аб асаблівасцях маладзёжнай палітыкі дзяржавы і іншым.

Цяжка пералічыць усе прыклады ўзаемадзеяння членаў верхняй палаты парламента з моладдзю, яе грамадскімі аб'яднаннямі ў рэгіёнах. Вось яшчэ асобныя факты. Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Алег Жынгель сустрэўся са студэнтамі Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта. Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Таццяна Палушкіна ў Полацку паўдзельнічала ў дыялогавай пляцоўцы «Ва ўстойлівую будучыню — разам!». Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Юрый Дзеркач наведаў Аршанскі раённы цэнтр тэхнічнай творчасці дзяцей і моладзі, азнаёміўся з дзейнасцю асноўных лабараторый «Камп'ютарныя сеткі і тэлекамунікацыі», «3D-мадэляванне і камп'ютарная графіка», «Робататэхніка і нейрапілатаванне». Ва ўстанове навучаецца больш за 500 дзяцей.

На такіх сустрэчах маладыя людзі задаюць самыя розныя, часам вострыя, пытанні і звычайна атрымліваюць шчырыя адказы. А сенатарам такія дыскусіі дазваляюць на месцы выслухаць аўтараў цікавых і, магчыма, нестандартных ініцыятыў і прапаноў, абмеркаваць з імі новыя ідэі, каб потым выпрацаваць меры па вырашэнні тых пытанняў, якія сёння найбольш хвалююць моладзь Беларусі.

Леанід ТУГАРЫН.

Добрае — выкарыстаць.

А непатрэбнае — ліквідаваць

У новай пяцігодцы на Віцебшчыне больш увагі будуць аддаваць пытанню эфектыўнага выкарыстання нерухомасці. А самы эфектыўны спосаб зносу аб'ектаў будуць распрацоўваць

Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ канстатуе, што тэма знаходзіцца на пастаянным кантролі ў народных абраннікаў. І нагадвае, што для кіраўнікоў райсаветаў арганізуюць выязныя пасяджэнні — менавіта там, дзе навучыліся актыўна знаходзіць новых гаспадароў будынкаў і збудаванняў, інвестараў. (У прыватнасці, вопытам дзяліліся жыхары Глыбоччыны, пра што мы распавядалі ў «МС».)

Усяго летась у параўнанні з пазамінулым годам стала на 92,1 тысячы «квадратаў» менш агульнай плошчы нерухомасці, якая не выкарыстоўваецца, — а гэта каля 10 %. Летась прыкладна 25 % з усіх праведзеных (каля 580) аўкцыёнаў былі ўдалыя. З «малатка» сышло 140 аб'ектаў — на трэць больш, чым у 2019-м. Ад рэалізаванага ў бюджэт паступіла 3,6 мільёна рублёў. Прадалі мэтава (на агульную суму каля 2 мільёнаў рублёў) нерухомасць і тым, хто яе арандуе больш чым тры гады і не мае запазычанасці па арэнднай плаце. Такім чынам, пастаянных гаспадароў знайшло дваццаць аб'ектаў.

Кіраўніцтва абласной «вертыкалі» адзначае добрую работу на Аршаншчыне. Прэзідэнт Беларусі ў канцы 2018 года падпісаў Указ № 506 «Аб развіцці Аршанскага раёна Віцебскай вобласці», якім сцвярджалася праграма развіцця гэтага рэгіёна на перыяд да 2023 года. І за два гады тут здзейснены каласальны аб'ём работ па ўсіх кірунках. Калі казаць пра нерухомасць, то пасля прыняцця ўказа ўключана ў гаспадарчы абарот каля 520 аб'ектаў, у тым ліку прыкладна 30 % — у 2020 годзе. Супрацоўнікі камітэта «Віцебскаблмаёмасць» і райвыканкама прааналізавалі сітуацыю, быў складзены спіс аб'ектаў нерухомасці Аршаншчыны, якія на пачатак бягучага года не выкарыстоўваюцца, або выкарыстоўваюцца неэфектыўна — усяго ў яго ўключана больш за 170 будынкаў і збудаванняў. І па ўсіх вызначаны тэрмін і спосаб уключэння ў гаспадарчы абарот...

Нядаўна старшыня аблвыканкама Мікалай Шарснёў патрабаваў паскорыць знос таго, што ўжо дакладна не зацікавіць патэнцыйных пакупнікоў. Па апошняй інфармацыі з 243 аб'ектаў, з якімі трэба было развітацца, знесена пакуль 199.

Каб актывізаваць знос, у «Віцебскаблмаёмасці» вывучылі вопыт дзейнасці тых, хто гэтым займаецца. Правялі папярэднія перагаворы з трыма прадпрымальнікамі: з Оршы, Полацка і Віцебска, якія спецыялізуюцца на гэтым відзе бізнесу.

У якасці прыкладу вельмі цікавага вопыту ў камітэце прыводзяць супрацоўніцтва Сенненскага райвыканкама з аршанскім індывідуальным прадпрымальнікам. Ён арганізаваў знос старога дзіцячага садка плошчай 1000 «квадратаў», які не выкарыстоўваўся з 2014 года. У якасці аплаты дзелавы чалавек у кошт усіх работ — 12 тысяч рублёў — узяў будаўнічыя матэрыялы, якія атрымаў у ходзе дэмантажу. Сярод іншага былі вывезены 300 «кубоў» бруту — на падсыпку дарог да сельскагаспадарчых аб'ектаў, праведзена рэкультывацыя зямельнага ўчастка. Вопыт будзе прапанаваны для пераймання ў іншых раёнах Віцебшчыны.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«Маладзёжны» ўзрост і «пад'ёмныя» для маладых спецыялістаў

НАВУЧЭНЦЫ Ваўкавыскага аграрнага каледжа задалі пытанні дэпутату Палаты прадстаўнікоў Паўлу ПАКАНЕЧНАМУ падчас дыялогавай пляцоўкі.

Інфармацыйнай нагодай стала работа Усебеларускага народнага сходу, дзе сярод іншых абмяркоўваліся пытанні маладзёжнай палітыкі. Удзельнікі форуму сумесна з прадстаўнікамі дэпутацкага корпуса сустракаюцца з калектывамі ў рэгіёнах, каб расказаць, што на ім вырашалася, і адказаць на пытанні аўдыторый.

Напрыклад, будучыя ветэрынары, навучэнцы Ваўкавыскага дзяржаўнага аграрнага каледжа, якія сёлета заканчваюць вучобу, пацікавіліся перспектывамі далейшай вучобы ў ВНУ. Многія хлопцы, магчыма, не змогуць яе працягнуць з-за прызыву ва Узброеныя Сілы. Павел Паканечны растлумачыў, што, сапраўды, сёння даецца толькі адна адтэрміноўка для працягу адукацыі. Гэты дакумент рыхтаваўся даўно і мае такое палажэнне з з-за колішняга недахопу юнакоў прызыўнога рэсурсу. Тым не менш пытанне будзе ўзята на кантроль і накіравана ў адпаведныя інстанцыі.

Многіх хвалюе пытанне так званых «пад'ёмных». Выпускнікі стаяць на парозе размеркавання і хочуць ведаць, чаму дзяржаўная фінансавая падтрымка датычыцца толькі тых, хто выязджае за межы свайго раёна. Як заўважыў дэпутат Палаты прадстаўнікоў, «пад'ёмныя» выплачваюцца на ўладкаванне бытавых умоў тым, хто з'язджае з бацькоўскага дома, застаецца без пастаяннай падтрымкі, яны таму і называюцца — «пад'ёмныя».

— Вядома, хацелася б, каб такую дзяржаўную дапамогу атрымлівалі ўсе маладыя спецыялісты без выключэння. Але стварыць спрыяльныя ўмовы, у тым ліку фінансавыя, каб замацаваць у сябе моладзь, могуць усе арганізацыі — і многія сельскагаспадарчыя прадпрыемствы менавіта так і робяць», — удакладніў дэпутат.

Таксама падчас дыялогавай пляцоўкі былі абмеркаваны праблемы даверу да розных крыніц інфармацыі ў інтэрнэце, магчымасці прымянення новых лічбавых тэхналогій пры правядзенні выбарчых кампаній. У чарговы раз было ўзнята пытанне аб афіцыйным падаўжэнні «маладзёжнага» ўзросту да 35 гадоў — зараз у дадзеную катэгорыю ўваходзяць маладыя людзі ад 14 да 31 года. Многія схіляюцца да таго, каб гэты тэрмін падоўжыць.

Паводле слоў Паўла Паканечнага, такія сустрэчы выклікаюць інтарэс у моладзі і вельмі важныя для фарміравання іх светапогляду.

— Моладзь цяпер — адна з галоўных рухаючых сіл у грамадстве. На Усебеларускім сходзе маладзёжнай палітыцы ўдзялялася нямала ўвагі. Вызначаны асноўныя кірункі дзейнасці на найбліжэйшыя гады — бясплатная адукацыя, працаўладкаванне, забеспячэнне жыллём, дапамога маладым і шматдзетным сем'ям. Але гэтыя кірункі сфармуляваны ў цэлым. Таму сустрэчы ў фармаце адкрытага дыялогу дазваляюць пачуць канкрэтныя прапановы ад канкрэтных людзей, — адзначыў дэпутат парламента. — Праз год-два сённяшнія выпускнікі стануць спецыялістамі, будуць уплываць на поспехі сваіх працоўных калектываў, а значыць, і на поспехі ўсёй краіны.

Галоўнае, як адзначалася падчас сустрэчы, каб маладыя людзі думалі не толькі аб бягучым моманце, але і заглядвалі наперад, прагназавалі будучае, мысліліглабальна.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

МАСТОК УЗАЕМАРАЗУМЕННЯ І АДЗІНСТВА

У Дамачаўскім сельсавеце, што на Брэстчыне, надзвычай беражліва ставяцца да багатай гісторыі пасёлка і яго ваколіц

Многія, калі не ўсе, памежныя населеныя пункты Прыбужжа маюць багатую, насычаную падзеямі, гісторыю апошніх стагоддзяў. На мяжы заўсёды асабліва трагічную адзнаку пакідаюць войны. Тут і самі межы мяняліся шмат разоў, перасоўвалі цэлыя вёскі, пераносілі або зносілі пад гэтую кампанію храмы, высялялі людзей па нацыянальнай прыкмеце. І Дамачава ў шэрагу такіх населеных пунктаў бадай што на перадавых пазіцыях.

Калонія перасяленцаў з Галандыі

Штуршком для напісання гэтага матэрыялу, не паверыце, паслужыла рэклама аднаго буйнога вытворцы малочных прадуктаў. Можа, чулі па тэлебачанні, як расхвальваюць «Галандскі» сыр: маўляў, мы робім яго па традыцыі сыраварaў з Галандыі, якія 400 гадоў таму жылі ў Брэсце і навучылі тутэйшых майстроў? Думала адразу, што гэта такая вобразная метафара, удалы маркетынгавы ход. Аказалася, што рэкламная версія можа быць блізкай да праўды. Праўда, перасяленцы з Галандыі жылі не ў Брэсце, а за 50 кіламетраў на поўдзень — у Дамачаве.

З мясцовым краязнаўцам, настаўнікам-гісторыкам на пенсіі Мікалаем Ганчаровым разглядаем старыя здымкі і дакументы. У Мікалая Рыгоравіча некалькі сшыткаў нарысаў па гісторыі мястэчка, якое ў 50-я гады паспела пабыць і раённым цэнтрам.

— Пасяленне Нэйдорф—Нэйбраў па абодва бакі Буга было заснавана нямецкамоўнымі пасяленцамі, як іх называлі «галендрамі» ў XVII стагоддзі, — расказвае гісторык. — Лютэранскі прыход быў заснаваны ў 1617 годзе, аб тым ёсць дакументы, таму менавіта згаданы час лічыцца пачаткам гісторыі галендраў на гэтай зямлі.

Мікалай Ганчароў знайшоў звесткі аб тым, што Мікалай Радзівіл Чорны на сто гадоў раней за ўказаную дату пасяліў тут 12 сямействаў з Галандыі, якія і паклалі пачатак калоніі. Аб гэтым, дарэчы, згадваецца ў нарысе Міхаіла Крывецкага, надрукаваным у 1898 годзе ў расійскім часопісе «Сельский вестник». Аўтар цікава апісвае жыццё і звычаі прадстаўнікоў розных канфесій — жыхароў Дамачава.

Дык вось пра дамачаўскіх галендраў ён піша, як пра эфектыўных земляробаў і жывёлаводаў: «...Зямлю яны апрацоўваюць жалезнымі прыладамі працы. Сеюць палепшанымі сартамі насення, у іх садах растуць, акрамя груш, сліў, яблынь, таксама агрэст, маліны, парэчкі, ёсць вінаград і клубніцы, яны атрымліваюць добрыя ўраджаі агародніны і прадаюць лішкі. Жывёла ў іх буйная і малочная, выраб сыроў і масла прыносіць добры даход (ну і сыраварная школа ў прыдачу. — **Аўт.**)». Сказана яшчэ, што галендры ахвотна займаюцца цяслярнымі і земляными работамі, многія працуюць на будоўлі. Падрадчыкі вельмі ахвотна бяруць з калоніі майстроў і рабочых. Некалькі дзясяткаў чалавек каля трох гадоў працуюць на сібірскай чыгунцы. За лета на будоўлі работнік зарабляе ад 70 да 100 рублёў, таму жывуць яны багацей за суседзяў-сялян... Дамы каланістаў даволі прасторныя, светлыя, высокія, каля кожнага дома — сады і кветнікі.

Яшчэ цікавыя звесткі датычылі моўных пераваг былых перасяленцаў. Адразу пасля іх пераезду яны, вядома, карысталіся роднай нямецкай мовай, праз стагоддзе-другое гаварылі на польскай, а вось на пачатак XX стагоддзя аўтар так іх апісвае: «У сваім хатнім побыце яны гавораць па-беларуску, ёсць толькі 2-3 старыя, якія ведаюць сваю ранейшую нямецкую мову. Амаль усе і дарослыя, і дзеці пісьменныя, у кожнага ў доме ёсць Біблія і іншыя кнігі. Большасць ведае рускую грамату. Яны падтрымліваюць матэрыяльна народнае вучылішча. Першымі адгукнуліся, калі было прапанавана заснаваць у мястэчку паштовае аддзяленне». Адным словам, перадавыя людзі свайго часу.

Старшыня сельскага Савета Анатоль СТРУК, які родам з тутэйшых мясцін, сказаў, што бацька не раз згадваў успаміны дзеда пра суседзяў. Прадзед старшыні адзначаў, што галандцы былі спецыялістамі ў кавальскай справе, і ў сферы меліярацыі ім роўных не было. Меліярацыю яны праводзілі ўручную. Дарэчы, рэшткі каналаў можна знайсці ў ваколіцы і цяпер. Адным словам, пра сябе перасяленцы з Еўропы пакінулі добрую памяць.

Нашчадкі дамачаўскіх галендраў

Памяць, таму што з амаль чатырох тысяч насельніцтва калоніі Нэйдорф, столькі налічвалася ў 1911 годзе, зараз у пасёлку не засталося нікога. Няма ніводнага іх дома, не захавалася нават рэшткаў прыгожай кірхі. Некаторыя галендры выехалі на Урал і ў Сібір яшчэ ў пачатку XX стагоддзя, там былі падобныя калоніі. Частка людзей пакінула родныя мясціны пасля 1939 года. Ну а тыя, хто перажыў вайну, былі рэпрэсіраваныя, іх адправілі ў працоўныя лагеры на 8-9 гадоў, у асноўным на лесапавал. У сшытках Мікалая Ганчарова ёсць успаміны сталай жыхаркі Дамачава, якая расказала пра жанчыну па прозвішчы Бытава з галендраў. Юзэфа Густаваўна працавала адразу пасля вайны ў дзіцячым садку. За сваё паходжанне атрымала 10 гадоў лагераў. Такая вось сумная гісторыя працавітых і мірных дамачаўскіх галендраў. Нашчадкі іх жывуць цяпер у многіх краінах свету, ёсць у Германіі, Польшчы, у Сібіры.

Адзін з іх — Зігфрыд Людвіг, які жыве ў Германіі, заняўся пошукам былых землякоў. На яго радзіме такіх знайшлося нямала, яны аб'ядналіся ў грамадскую арганізацыю. Упершыню Зігфрыд наведаў Дамачава ў 2008 годзе. Потым візіты і стасункі сталі рэгулярнымі. У выніку ў 2017 годзе на месцы былых могілак з'явіўся памятны знак у гонар калоніі пасялення галендраў.

У 2019 годзе нямецкая дэлегацыя прыняла ўдзел у раённым фальклорным свяце на дзень Пятра і Паўла. Тады прыязджалі таксама нашчадкі землякоў з Расіі, Польшчы, Украіны. Быў прафесар Луцкага універсітэта, які займаецца вывучэннем гэтай тэмы. Дамовіліся сустрэцца ў больш шырокім складзе праз год. Але пандэмія памяняла планы.

Памяць пра вайну

Вялікія страты панёс пасёлак у час Другой сусветнай вайны. Дарэчы, немцы займалі Дамачава на кароткі час і ў 1939 годзе, потым пакінулі, бо сюды ўвайшлі часці Чырвонай Арміі. Побач прайшла мяжа, былі абсталяваны заставы. І 22 чэрвеня 1941 года пагранічнікі першыя прынялі на сябе ўдар захопнікаў. Большасць з іх загінула. Ужо 23 чэрвеня акупанты расстралялі некалькі дзясяткаў яўрэяў з пасёлка. Астатніх сагналі ў гета. 20 верасня 1942 года гета было знішчана, 2700 чалавек яўрэйскага насельніцтва пазбавілі жыцця. Так знікла яшчэ адна дамачаўская дыяспара. У нататніку Мікалая Ганчарова ёсць запіс расказаў старых людзей, якія згадвалі той расстрэл і пахаванне тысяч цел у адным месцы: «Траншэю засыпалі высока, нібы курган, з якога сцякалі рэкі крыві».

Старшыня сельскага Савета Анатоль СТРУК і краязнавец Мікалай ГАНЧАРОЎ.

Праз тры дні пасля ліквідацыі гета нацысты расправіліся з выхаванцамі дзіцячага дома. Іх вывезлі ў лес, 54 хлопчыкаў і дзяўчынак разам з юнай выхавальніцай Палінай Грахольскай расстралялі. Так было вырашана пытанне памяшкання дзетдома, якое спатрэбілася акупацыйнай уладзе.

Памяць усіх названых трагічных падзей годна ўвекавечана. На месцы расстрэлаў, на брацкіх магілах воінаў стаяць помнікі, якія падтрымліваюцца ў парадку намаганнямі мясцовай улады і грамадскіх арганізацый.

Памяць важна падтрымліваць і ў выглядзе музейнай экспазіцыі. Музей баявой славы ў свой час стварыў настаўнік Мікалай Ганчароў. Разам з вучнямі яны запісалі ўспаміны ветэранаў, сваякоў загінулых франтавікоў, сабралі дакументы. У 1987 годзе ў Дамачаве праходзіла сустрэча ветэранаў 28-га палка, які вызваляў пасёлак. Потым школа вяла з некаторымі з іх перапіску. Апошняя стала асобнай часткай музейных матэрыялаў. Мікалай Рыгоравіч збіраў іх з 1973 года. Музей функцыянаваў у школе з 1985 года. Але пасля капітальнага рамонту школы... музей не адкрылі. Бо старыя стэлажы і стэнды не пасуюць да новых інтэр'ераў, ды і самім экспанатам неабходна мадэрнізацыя. На гэта патрэбны немалыя грошы. Але ж усё сабранае беражліва і надзейна захоўваецца. Былы настаўнік і яго цяперашнія калегі спадзяюцца, што з часам знойдуцца спонсары, каб аднавіць Музей баявой славы на новым сучасным узроўні.

На электронным і папяровым носьбітах

У сельскім Савеце працуюць над тым, каб выдаць запісанае і сістэматызаванае Мікалаем Ганчаровым асобнай брашурай. Як нядаўна ўбачыў свет нарыс пра гісторыю вёскі Чэрск, напісаны Вольгай Стаднік. Былая вясковая настаўніца, як і яе калега ў Дамачаве, шмат гадоў збірала матэрыялы пра родную вёску Чэрск і яе людзей. Вольга Дзмітрыеўна не гісторык, а філолаг, яна зрабіла найбольшы ўпор на ўспаміны. Запісала сведчанні аднавяскоўцаў пра падзеі пачынаючы з Першай сусветнай вайны. Найвялікшы раздзел прысвечаны трагічным старонкам Вялікай Айчыннай, ну і пасляваенная гісторыя вёскі адлюстроўваецца ў лёсах канкрэтных людзей.

Грунтоўным унёскам у шанаванне сваёй гісторыі можна лічыць і сайт, прысвечаны Дамачаву, які стварыў вучань Мікалая Ганчарова Іван Пракапюк. Там сабрана вельмі многа матэрыялаў, дакументаў, архіўных фотаздымкаў. Гістарычныя звесткі ахопліваюць перыяд ад глыбокай старажытнасці і да нашага часу.

Старшыня Дамачаўскага сельскага Савета Анатоль Струк лічыць работу па захаванні гісторыі не другараднай справай мясцовай улады:

— Мяне ў гэтым аднадушна падтрымліваюць дэпутаты. Наша мястэчка было некалі разнастайным і шматканфесіянальным. Людзі жылі побач у згодзе і добрасуседстве. І цяпер вось гэта наладжванне кантактаў паміж нашчадкамі землякоў спрыяе дружбе паміж народамі, стварае масток узаемаразумення, адзінства.

Ну а для справы выхавання маладога пакалення веданне сваёй гісторыі, пашана да мінулага малой радзімы становяцца ўрокам, які цалкам не здольная замяніць тэорыя.

Святлана ЯСКЕВІЧ,
Брэсцкі раён.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. **Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;

e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 4 сакавіка 2021 года.

125 гадоў Кандрату Крапіве

ЯГО ПСЕЎДАНІМ БЫЎ НАВАТ ЗАПІСАНЫ Ў ПАШПАРЦЕ

Некалькі гісторый пра творы вядомага сатырыка

«Хто сустрэўся быў са мною,
Дакрануўся раз ці два,
Дык той ведае ўжо, хто я:
Я — пякучка-крапіва».

Гэты верш абвяшчаў з'яўленне беларускага байкапісца з пякучым псеўданімам.
Хоць падлеткам, падчас навучання ў Койданаўскай вучэльні, той быў перакананы, што сапраўдная паэзія — гэта вершы пра «сусветную тугу». І сам сачыняў пад Лермантава. Каб з рэдакцыі часопіса «Жизнь для всех» не даслалі кепскі водгук, хто ведае, ці надоўга тая туга ў творчасці зацягнулася б? Пасля ліста з рэдакцыі юны аўтар не браўся за пяро цэлых восем гадоў.
Звалі яго Кандрат Атраховіч. Але, як успамінае ўнучка, Алена Атраховіч, «Яго літаратурны псеўданім — Крапіва — настолькі адбіўся ў свядомасці чытачоў, настолькі шчыльна «прыклеіўся» да яго асобы, што знаёмыя і сябры нашай сям'і ўсіх нас, яго родных, называлі ды і дагэтуль называюць «крапівамі»... Псеўданім дзеда быў запісаны ў яго пашпарце. Выглядала гэта так: «Атраховіч Кандрат Кандратавіч (Кандрат Крапіва)».
Давайце ж пачнем з гісторыі твора, у якім упершыню прагучаў псеўданім.



«Крапіва»

Здарылася гэта 16 снежня 1922 года, калі быў напісаны праграмны верш «Крапіва». Вось што расказвае ўнучка:

«Дзед адзначыў, што ў яго было некалькі прычын. Уласнае прозвішча падавалася яму нязручным для вымаўлення, ён меркаваў, што чытач яго папросту не запомніць. Вырашыў «прыкрыцца» псеўданімам. Пэўнага прыкрыцця патрабаваў і сатырычны кірунак вершаў, бо ў іх часам былі змешчаны сапраўдныя імёны. Чаму абраў раслінны псеўданім? Быў малады, толькі ўвайшоў у літаратурныя колы, і, магчыма, паўплываў прыклад такіх аўтарытэтаў, як Якуб Колас і Янка Купала. А чаму ўзяў псеўданім такі просты? «Дык я ж і сам просты,— казаў дзед, — селянін, ад зямлі». Неяк, прыехаўшы на дзедаву радзіму ў вёску Нізок, убачыла я на беразе ракі Усы густыя зараснікі сапраўднай, нізоўскай крапівы і падумала: вось чаму менавіта Крапіва».

У першапачатковым варыянце пачатак верша гучаў так:

«Не цягнусь я за Чаротам
І Купале не раўня»...

Праз некаторы час гэта выправілася на хрэстаматыйнае:

«Я ў мастацкім агародзе
Толькі марная трава.
А якая? Смех, дый годзе:
Я — пякучка-крапіва.
Я расту вось тут пад плотам
І не так даўно ўзышла,
А ўжо многім абармотам
Рукі-ногі папякла».

«Сава, асёл і сонца»

«Сава лятала паначы,
З сабою птушкам смерць насіла,
Хаўтурны спеў ім пеючы, —
Сама там драла іх,
сама ж і галасіла».

У 1927 годзе ў першым нумары альманаха «Узвышша» была надрукаваная байка Кандрата Крапівы «Сава, асёл і сонца». Як пісаў у эміграцыі крытык Антон Адамовіч: «У ёй нядвузначна паказваецца бальшавізм у вобразе савы». А вось у вобразе Асла, які спрабуе захіліць вушамі сонца, каб дапамагчы саве не слепнуць і ўдзень драць птушак, Адамовіч бачыў «вельмі дакладны і жывы партрэт» вядомага камуністычнага дзеяча Змітра Жылуновіча, ён жа — беларускі паэт Цішка Гартны.

Напрыклад, Хвядос Чырвоны нос — гэта Паўлюк Шукайла, эксцэнтрычны шумлівы паэт і крытык, з якім Крапіва варагаваў. Не забываецца аўтар і на сябе, і на таго ж Цішку Гартнага. Калі Хвядос ляціць на аўтакрылах над Беларуссю, каментуе ўбачанае так:

Кандрат Крапіва з сынам Барысам.

«Узвышша» было разгромленае, амаль усе яго чальцы рэпрэсаваныя. У зборнік 1932 года байка была ўключаная аўтарам у перароблены варыянце — з'явілася канцоўка, якая тлумачыла, што паэма скіраваная супраць злыдняў-капіталістаў.

«Хвядос — Чырвоны нос»

У 1930 годзе з'яўляецца паэма Кандрата Крапівы «Хвядос — Чырвоны нос». Яе сюжэт пераклікаецца з «Клапом» Маякоўскага. Галоўны герой так перапіў, што... заспіртаваўся і ачомаўся ў шкляной скрынцы ў музеі толькі праз сто гадоў. Хвядос апынуўся ў камуністычнай будучыні, калі ўвесь свет гаворыць на адной усезямной мове, а іншыя мовы захоўваюцца ў якасці дыялектаў. Гаспадарка на ўсёй зямлі таксама адна, толькі ў кожнага рэгіёна свая спецыфікацыя. Беларусь у гэтай светлай будучыні гадуе свіней і вырошчвае сады. «Скрозь электрыка слугуе», людзі лётаюць на аўтакрылах і ездзяць на рухомых тратуарах. У паэме шмат патаемных сэнсаў. А галоўнае — у ёй пародыі на вядомых пісьменнікаў.

«Вось Н-і-з-о-к — радзіма Труса.
Жыў такі паэт-юнак,
Быў вясёлы ды здаровы,
Павянчала смерць, аднак,
Юнака вянком лаўровым.
А яшчэ скажыце — вы
Не чыталі Крапівы?
Не здарапася ніколі?
А я знаў яго даволі.
Ён таксама з гэтай вёскі,
Шмат пісаў аб справах боскіх.
Чуць мы з ім не сябравалі ж,
На Падхлюпінскай жылі,
Хоць ён дрэнны быў таварыш —
Наступаў на мазалі.
Вось К-а-п-ы-л-ь. Свінарнік бачу.
Чую музыку свінячу.
Тут, мне помніца, й даўней
Добрых шмат было свіней,
Жарабцы былі, паэты —
Пладавіты горад гэты.
З Капыля такая шышка,
Як, напрыклад, Гартны Цішка.
Праз нахілы да дыскусій
Ды праз «трэскі»,
ды праз «хвалі»
Яго ў нас на Беларусі
Нібы лысага ўсе зналі.
Ён то й быў не кучаравы,
Камляваты, невысокі,
Дзеля справы, дзеля славы
Ў выдавецтве ціснуў «сокі».

«Трэскі і «хвалі» — намёк на апавяданне Цішкі Гартнага «Трэскі на хвалях», «сокі» — гэта яго даўжэзны, у некалькіх частках, сацыяльна-бытавы раман «Сокі цалены», які цвялілі за нудоцце.

Паэму Кандрат Крапіва не раз рэдагаваў, прыбіраючы намёкі і імёны.

«Хто смяецца апошнім»

Цікавая гісторыя і ў гэтай п'есы... Менавіта яе абралі для паказу падчас Дэкады беларускага мастацтва ў Маскве ў 1940 годзе. Камедыя вострасатырычная і актуальная, бо ў ёй адлюстравалася падазроная атмасфера часу рэпрэсій. Навуковым інстытутам кіруе нахабны і малапісьменны прысасаванец Гарлахвацкі, які хоча знішчыць таленавітага вучонага Чарнавуса. У інстытут выпадкова зайшоў чалавек у форме НКУС — і Гарлахвацкі пускае плётку, што «органы» зацікавіліся «ворагам народа» Чарнавусам... Імгненна ад навукоўца адварочваюцца ўсе. Адмаўляюцца дапускаць да лекцый, друкаваць яго кнігі... Дачка-студэнтка — пад пагрозай выключэння. У п'есы, зразумела, хэпі-энд — дзякуючы прынцыповай моладзі, пільнаму парторгу і пастанове ЦК ВКП(б) «Аб памылках партарганізацый пры выключэнні камуністаў з партыі...».

Прэм'ера адбылася 16 кастрычніка 1939 года ў Першым беларускім дзяржаўным тэатры, але ні ў адной газеце не з'явілася водгуку. Чаму выбралі падазроны твор для Масквы? Быў заказ паказаць сучасную Беларусь, ну і высмейванне навуковай інтэлігенцыі магло спадабацца.

Падчас чыткі ў мінскім гатэлі «Еўропа» начальніку ўпраўлення па справах мастацтваў пры СНК СССР Храпчанку п'еса не спадабалася, ён назваў яе пасквілем і катэгарычна забараніў везці ў Маскву. Рэжысёр Рахленка патэлефанаваў першаму сакратару ЦК Панцеляймону Панамарэнку, той прызначыў чытку ў дванаццаць ночы ў сваім кабінеце. П'еса была ўхваленая. Добра, што Крапіва не агучваў п'есу сам — па водгуках таго ж Рахленкі, рабіў ён гэта так манатонна, што слухачы засынялі нават падчас самых вясёлых сцэн.

Спектакль у Маскве прайшоў трыумфальна, Крапіва атрымаў ордэн Леніна, а ў 1941-м — Сталінскую прэмію. У беларускі фальклор назаўсёды ўвайшоў «свінтус грандыёзус», альбо «мамантавая свіння», — фальшывае адкрыццё Гарлахвацкага.

«Проба агнём»

Падчас Вялікай Айчыннай вайны Крапіва атрымаў ліст ад аднапалчаніна свайго сына, Барыса, што той гераічна загінуў на фронце пад Сталінградам. Пісьменнік пабаяўся гаварыць жонцы Алене... Схаваў ліст у кішэню, вазіў з сабою. У гэты час Другі беларускі тэатр (БДТ-2), які эвакуіраваўся ва Уральск, ставіў п'есу Кандрата Крапівы, толькі што ім скончаную, — «Проба агнём». Драматург з жонкай паехалі на прэм'еру. Напярэдадні прэм'еры, на досвітку, жонка вырашыла памыць гімнасцёрку Крапівы, з кішэні выпаў патрапаны франтавы «трохкутнічак». Так і даведалася, што яе Борыка ўжо паўгода, як няма.

А што датычыцца п'есы, дык Алена Атраховіч кажа наступнае:

«Адзін з галоўных герояў твора Барыс Перагуд — малады лейтэнант, амаль хлапчук. Эмацыянальны, чулы, цнатлівы, высакародны. Перачытваючы драму «Проба агнём» яшчэ і яшчэ раз, я ўсведамляю, што ў вобразе гэтага лейтэнанта Кандрат Крапіва ўвасобіў свайго сына. Па-першае, герою п'есы аўтар даў імя сына — Барыс. Па-другое, герой — разведчык, сын таксама некаторы час на фронце быў камандзірам разведгрупы. Да таго ж абодва яны блізкія па ўзросце, па чалавечых якасцях і рысах характару. Калі дзед рабіў канчатковую рэдакцыю п'есы, яго сын Барыс ужо загінуў. Але ў п'есе ён пасля цяжкіх баёў застаўся жывы. Назаўсёды».

Можаце ўявіць, з якімі пачуццямі глядзелі Крапіва і яго жонка прэм'еру ва Уральску!

«Брама неўміручасці»

Даўжэй за ўсё пісалася дасціпная камедыя «Брама неўміручасці»... Пачаў яе Крапіва ў 1960-х, закончыў у 1972-м. У 1964-м перажыў яшчэ адно гора: пайшла з жыцця пасля цяжкай хваробы жонка. Дык вось, як сцвярджае ўнучка Крапівы, у «Браме неўміручасці» «ёсць асобныя эпізоды, якія датычацца жыцця галоўнага героя і яго жонкі, іх адносін, дзе ў вобразнай апасродкаванай форме ўвасабляюцца аўтабіяграфічныя моманты жыцця аўтара. Выбар галоўнага героя — адмовіцца ад неўміручасці і застацца са сваёй жонкай, якая паводле стану здароўя не можа быць неўміручай, — вобразна адлюстроўвае рашэнне самога Кандрата Кандратавіча застацца верным сваёй Алене Канстанцінаўне, нават пасля яе адыходу з жыцця».

Сцэна са спектакля «Хто смяецца апошнім».

Цікава, што ўжо пасля смерці аўтара ў ягоным стале былі знойдзеныя старонкі са сцэнай, якая не ўвайшла ў п'есу. Вось урывачак:

«Барыс Пятровіч (націскае кнопку званка. Уваходзіць сакратарка): Хто там яшчэ прагне неўміручасці?

Сакратарка: Пісьменнік.

Барыс Пятровіч: Які пісьменнік?

Сакратарка: Сусветны.

Барыс Пятровіч: Сусветны? Справа сур'ёзная. А адкуль вы ведаеце, што ён сусветны?

Сакратарка: Ён сам сказаў.

Барыс Пятровіч: Народны?

Сакратарка: Гэтага не гаварыў. Але калі сусветны, то напэўна ж народны.

Барыс Пятровіч: Гэта яшчэ невядома.

Сакратарка: Сусветны ж большы чым народны.

Барыс Пятровіч: Бачыце, званне народнага прысвойвае Вярхоўны Савет, а сусветнага кожны сам сабе можа прысвоіць. Сусветны... Як быццам нешта знаёмае... А, успомніў, ёсць такі: Мацей Сусветны».

«Загадкі дзеда Кандрата»

Калі Кандрату Крапіве споўнілася 90 гадоў, выйшла яго першая і адзіная кніжка для дзяцей — «Загадкі дзеда Кандрата». З'явілася яна на свет дзякуючы праўнучцы Варвары. Як тая ўспамінае, «Пакуль была я зусім маленькая, то, пачуўшы, што прадзед Кандрат — доктар (а ён быў доктар навук), думала, што ўрач. Але калі крыху паразумнела, то ўсвядоміла, што ён не ўрач, а доктар філалагічных навук. Пачала распытваць яго, што такое філалогія. І вось падчас такіх з ім размоў захапіў мяне прадзед гульнёй са словамі. Ды як захапіў! Некаторы час я проста «даставала» яго з гэтым. Давай гуляць у словы, і ўсё тут. Так было цікава, што спыніцца не магла. А ён прыдумваў для мяне розныя вельмі цікавыя гульні з загадкамі пра словы. А пасля, відаць, вырашыў, што такія загадкі будуць цікавыя не толькі для яго праўнучкі, але і для іншых дзяцей. І запісаў тыя загадкі, што прыдумваў для нашых «гульняў у словы».

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ОАО «Сукно», г. Минск, ул. Матусевича, д. 33, тел. +375 (17) 363-99-40**

Предмет аукциона

№ лота	Наименование	Начальная цена (без НДС), бел. руб.	Шаг аукциона
Оборудование, бывшее в употреблении, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Матусевича, 33			
1	Узловязальная машина Staubli типа TORMATIC TPM-301 с узловязальной рамой для основ TPF 3B-23 Standart, инв. номер 00004278	88 500,00	4 425,00
2	Электрическая подъемная тележка для навоев, тип EE-KHUR 20/8 в технике АС, инв. номер 00004279	49 400,00	2 470,00
3	Тележка для извлечения и транспортировки рулонов ткани типа Тип WB 3/6, инв. номер 00004280	8 400,00	420,00
4	Фильтровальная установка фирмы LTG для удаления отходов и запыленного воздуха ткацких станков, инв. номер 00028287	279 000,00	13 950,00
5	Резервуар чистой воды осветленной на 2000 кубов № 1 общей площадью 29,1 кв. метров	180 822,95	9 041,15
6	Резервуар чистой воды осветленной на 2000 кубов № 2 общей площадью 29,1 кв. метров	180 822,95	9 041,15
Капитальные строения, в следующем составе:			
7	**Коммерческий пункт** (здание неустановленного назначения), инв. номер 500/С-64486 общей площадью 27,3 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Матусевича, 33/12	10 318,00	515,90
8	**Насосная станция повторного использования воды** (здание неустановленного назначения), инв. номер 500/С-64487 общей площадью 29,1 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Матусевича, 33/13	12 897,50	644,88
9	**Пункт коммерческого учета тепла** (здание неустановленного назначения), инв. номер 500/С-64485 общей площадью 40,4 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Матусевича, 33/11	17 540,60	877,03
10	**Здание контрольно-пропускного пункта** (здание неустановленного назначения), инв. номер 500/С-63690 общей площадью 10,5 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Матусевича, 33/8	6 357,00	317,85
11	**Здание котельной** (здание специализированное энергетики), инв. номер 500/С-62607 общей площадью 1 111 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Матусевича, 33/6 **В состав лота входит иное имущество,** размещенное на сайте организатора торгов www.cpo.by	849 197,21	42 459,86

Сведения о земельном участке: земельный участок пл. 6,1157, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания зданий неустановленного назначения, здания специализированного для производства текстильных, швейных и кожаных изделий, здания специализированного энергетики, сооружения специализированного водохозяйственного назначения. После проведения аукциона Продавец уполномочивает покупателя в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением регистрационных действий в отношении земельных участков, необходимых для обслуживания предметов аукциона, и произвести государственную регистрацию договора купли-продажи. Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных продавцом. Расходы по оформлению земельного участка, государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права собственности на предмет аукциона несет покупатель

Порядок ознакомления	Осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Ответственное лицо: Жуковская Татьяна Евгеньевна, контактный телефон +375 (29) 752-08-29

Лица, желающие принять участие в аукционе, обязаны внести задаток и подать организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов аукциона определяются ст. ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».

Порядок оформления участия в аукционе: лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона в срок до 17.00 05.04.2021 заявление на участие в аукционе с приложением документов согласно ст. 127 вышеуказанного закона.

Критерии выявления победителя аукциона: имущество считается проданным лицу, которое предложило на аукционе самую высокую цену.

В случае регистрации или явки на аукцион одного участника (претендент на покупку) предмет аукциона может быть продан данному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Порядок оформления результатов торгов: победитель торгов (претендент на покупку) в день проведения торгов подписывает протокол

Срок подписания договора купли-продажи	**15 (пятнадцать) рабочих дней** после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Победитель аукциона либо претендент на покупку обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее **30 (тридцати) дней** со дня проведения аукциона, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона либо претендент на покупку обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **3 %** по лотам №№ 1–10 и **2 %** по лоту № 11 от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата, время и место проведения аукциона: 07.04.2021 в 13.00, г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»

Для участия в аукционе необходимо перечислить организатору торгов задаток, а также подать заявление с приложением всех необходимых документов в срок **с 9.00 05.03.2021 до 17.00 05.04.2021** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»

Контактные данные	**+375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29**

Предмет аукциона

Наименование (назначение)	Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.
Лот № 1 – магазин (торговое помещение) общей площадью 136,5 кв. м, инв. номер 252/D-911270, по адресу: Витебская обл., г. Новополоцк, ул. Молодежная, 167-141а	**250 248,32**
Лот № 2 – аптека (помещение здравоохранения) общей площадью 21 кв. м, инв. номер 252/D-911272, по адресу: Витебская обл., г. Новополоцк, ул. Молодежная, 167-141б	**51 672,97**

Обременение: аренда. Более подробная информация на сайте организатора торгов www.cpo.by

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок заключения договора купли-продажи: 20 календарных дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона: победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – единственный участник аукциона), обязан произвести оплату в размере 100 % стоимости имущества не позднее **30** календарных дней с момента заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.

Передача предмета аукциона победителю аукциона (единственному участнику аукциона), заключившему договор купли-продажи, производится по акту приема-передачи в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента полной оплаты стоимости недвижимого имущества.

Победителю аукциона (единственному участнику аукциона) обратиться за государственной регистрацией перехода прав на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке.

Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, заключением (удостоверением) договора купли-продажи, в том числе оплатой государственной пошлины, государственной регистрацией договора и перехода права собственности на недвижимое имущество, а также с удостоверением сделки, включая оплату государственной пошлины, несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона	**07.04.2021 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов	**05.04.2021 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	**+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

Уважаемые акционеры ОАО «МАПИД»

26 марта 2021 года СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ГОДОВОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «МАПИД»,

расположенного по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205.

Собрание созывается по инициативе Наблюдательного совета ОАО «МАПИД».

Собрание пройдет по адресу: г. Минск, ул. К. Либкнехта, 130. (Пристройка к общежитию ОАО «МАПИД»)

Повестка дня:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2020 году и основных направлениях деятельности Общества на 2021 год.
2. О работе наблюдательного совета в 2020 году.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2020 год.
4. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2020 год.
5. Утверждение порядка распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества, за 2020 год. О выплате дивидендов за 2020 год.
6. Утверждение плана распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества, на 2021 год и первый квартал 2022 года. Периодичность выплаты дивидендов в 2021 году.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. О вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

С материалами по вопросам повестки дня собрания можно ознакомиться в рабочие дни с 9.00 до 16.00 по месту нахождения Общества: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, каб. № 208А (производственный отдел собственного строительства УКС):

с 05.03.2021 по 25.03.2021 – ознакомление с информацией о деятельности Общества за 2020 год и основных направлениях деятельности на 2021 год;

с 18.03.2021 по 25.03.2021 – ознакомление с иными материалами по вопросам повестки дня общего собрания;

в день проведения собрания по всем вопросам повестки дня – с 13.00 до 14.30 по месту его проведения.

Регистрация участников собрания с 13.00 до 14.30 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания – 26 марта 2021 года, 15.00.

Список лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров, будет составлен на основании реестра акционеров сформированного на 05 марта 2021 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:
- акционеру Общества – паспорт;
- представителю акционера – паспорт и доверенность.

Обращаем внимание участников общего собрания акционеров! На основании решения Мингорисполкома от 07.04.2020 № 1069 (в ред. от 12.11.2020 № 3674) использование средств индивидуальной защиты органов дыхания (маска) при посещении административных зданий ОБЯЗАТЕЛЬНО.

УНП 100008115

Администрация

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: **УП «Комбинат декоративно-прикладного искусства им. А.М. Кищенко»** (УНП 600126458) 222520, г. Борисов, ул. Блюхера, 19, тел. 8 033 688 86 54 в лице ликвидатора ООО «Правовая компания «Делегат».

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены **18 марта 2021 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**.

Предмет торгов – гараж, инв. № 1-005, общ. пл. 114 кв. м, механические мастерские, инв. № 01-008, общ. пл. 336,5 кв. м, производственный корпус керамического цеха, инв. № 01-010, общ. пл. 4027,0 кв. м, производственный корпус № 01-003, столовая комбината, инв. № 01-03а, общ. пл. 3000,1 кв. м, проходная, инв. № 01-006 (задняя), проходная центральная, инв. № 01-013, общ. пл. 13 кв. м, склад, инв. № 01-009, склад материальных ценностей, инв. № 01-017, общ. пл. 183,9 кв. м, склад материальных ценностей, инв. № 01-012, общ. пл. 103,7 кв. м, художественные мастерские, инв. № 01-002, общ. пл. 996 кв. м, г. Борисов, ул. Блюхера, 19, художественные мастерские 610/с-26438, инв. № 01-016, общ. пл. 200,6 кв. м, г. Борисов, пр-т Революции, 42А, художественные мастерские 610/с-26415, инв. № 01-004, гостиница, инв. № 01-001б – общ. пл. 459,8 кв. м, **г. Борисов, пр-т Революции, 42Б.**

Начальная цена – 2 838 982,39 бел. руб. с НДС. Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов.

Телефон для ознакомления и осмотра +37529-698-53-53.

Для участия в торгах необходимо в срок с 06.03.2021 г. 09.00 по 17.03.2021 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов: не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 24.11.2020 г.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

ООО «ИПМ-Консалт оценка», организующее электронные торги на основании договора поручения, извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ПК «Денежный оберег» (УНП 191562866)**, в отношении которого открыто производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 482-5Б/2020 в экономическом суде города Минска

Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов – дебиторская задолженность

№ лота	Кредитор	Дебитор	Сумма дебиторской задолженности	Начальная цена (без НДС)	Минимальная цена (без НДС)
1	**ПК «Денежный оберег»**	**Физические лица** (граждане Республики Беларусь) в количестве 18 человек	20 719,92 бел. руб.	**20 719,92** бел. руб.	**12 431,95** бел. руб.
2	**ПК «Денежный оберег»**	**Физические лица** (граждане Республики Беларусь) в количестве 33 человек	803 320,10 бел. руб.	**803 320,10** бел. руб.	**481 992,06** бел. руб.

*Примечание: перечень дебиторов представлен на сайте организатора аукциона

Размер шага составляет **5 (пять) процентов** от начальной цены лота

Имеющиеся обременения в отношении имущества: отсутствуют

Задаток **10 %** по курсу НБРБ на дату платежа от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Срок подписания договора купли-продажи	**10** (десять) рабочих дней после электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Порядок оформления участия в торгах, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов определяется постановлением Министерства экономики № 9 от 1 апреля 2019 года «Об электронных торгах по продаже имущества в процедурах экономической несостоятельности (банкротства)»

Победитель аукциона, либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить продавцу и организатору торгов затраты на их проведение и оплатить организатору торгов установленное вознаграждение в размере 5 % от итоговой цены продажи предмета аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте www.ipmtorgi.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов	**Начало торгов: 07.04.2021 в 09.00 Окончание торгов: 07.04.2021 в 16.00**
Дата и время окончания приема заявок	**Заявки на участие в электронных торгах принимаются с 9.00 04.03.2021 по 06.04.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by**

Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by

Нехта губляе, нехта знаходзіць

Што было, — было. За святочным сталом (трэба ж музы́кам даць адпачыць?) госці сталі жартаваць ды «травіць» анекдоты. Адзін, помню, быў пра каўказца, які ў рэстаране ўбачыў у сваёй талерцы нешта падазронае і гучна прамовіў: «Ой, мух!» — «Не мух, а муха», — тут жа паправіў яго афіцыянт. — «Вау! Які ў цябе добры зрок!» — пазайздросціў каўказец.

Мы, госці, досыць дружна пасмяяліся з гэтых двух мужчын, а трэці, пажылы палкоўнік, які быў сярод нас, раптам дадаў, што жыццё яшчэ і не такія анекдоты падкідвае.

«Памятаю, былі мы тут, у Беларусі, на вайсковых вучэннях, — стаў расказваць ён, — праходзілі з салдатамі па невялікай вёсцы, і ў адным з двароў убачылі вельмі прыгожую дзяўчыну, якая развешвала па вяроўках бялізну. Я — тады малады афіцэр і зайздросны жаніх — не вытрымаў: пакіраваў да яе, папрасіў вады. Дзяўчына страшэнна сумелася, мігам сарвала з вяроўкі нейкую сваю драбязу (я толькі белы ліфчык убачыў) і хуценька «нырнула» ў сенцы. Я застаўся чакаць, аднак... Не з маім шчасцем: замест дзяўчыны з хаты выйшла... бабуля, падала мне поўны збанок ды кажа:

— Пі, саколік, квасок, вады і з крынічкі нап'ешся...

Гэта было і нечакана для мяне, і прыемна (у нас, на Разаншчыне, кваску чужым не падавалі), і надзіва смачна!

Я шчыра падзякаваў жанчыне і на тым, відаць, назаўсёды развітаўся б, але ж праз дзень дзяжурны далажыў, што да яго падыходзіла тая самая бабуля, скардзілася, што ў яе прапалі панталоны, аж дзесяць штук...

Я нічога не разумеў, аднак падумаў, што яны, мусіць, з гардэроба той прыгажуні і нейкія вельмі адмысловыя, дарагія — іначай бабуля сюды не прыйшла б...

Давялося сабраць салдат, правесці невялікае «следства» і ў час яго пачуць хіба рогат: маўляў, хто ж гэта ў нас так баіцца ўзрываў, што для падстрахоўкі ажно панталонаў накраў?..

Смех смехам, а падазрэнне з салдат мне трэба было адвесці. Гэта — раз, а два — хацелася зноў убачыць дзяўчыну. Карацей, я сабраўся ісці ў вёску, як раптам пачуў:

— Таварыш камандзір, дазвольце звярнуцца!

Я, вядома ж, дазваляю, а салдацік раптам дакладвае, што ў бабулі прапалі зусім не *панталоны*, а *трусы*.

— Якая розніца? — пытаю ў яго.

— Вялікая: *панталоны* — гэта бялізна, а трусы — гэта *кролики*.

— Што?!

— *Кролики*... Я тутэйшы, з Беларусі, і чуў размову з дзяжурным: бабуля па-нашаму, па-беларуску казала, што ў яе было дзесяць трусоў...

У мяне і камень з душы: *кроликов* салдаты дакладна не бралі...

Але ж да бабулі я тады ўсё роўна схадзіў, паспачуваў, пагутарыў, а заадно — пабачыўся з прыгажуняй унучкай і абедзвюм паабяцаў, што трусоў (у сэнсе *кроликов*) абавязкова ім прывязу — адразу ж пасля вучэнняў...»

На гэтым палкоўнік завяршыў свой расказ.

— А як жа дзяўчына? — спыталі мы, слухачы. — Вы тады пазнаёміліся з ёй, абмяняліся адрасамі?

— А як жа! — засмяяўся мужчына. — Я нават ажаніўся! Вунь яна, мая каханенькая-родненькая, з цёткамі на лаўцы сядзіць.

...Эдзіта П'еха некалі спявала: *«Так уж бывает, так уж выходит, кто-то теряет, кто-то находит...»*

У гэтым выпадку знайшлі, як выглядае, усе.

Зоя Наваенка,
г. п. Падсвілле, Глыбоцкі раён.

Сыны былі Іванавы...

Яшчэ класік пісаў, што імя чалавеку даюць тады, калі невядома яшчэ, які ён будзе, а вось мянушку — толькі па заслугах.

Дык вось. Выйшла адна дзеўка замуж, колькі там часу пражыла, пагаспадарыла, і здалося ёй, што муж працуе куды менш. Ва ўсякім разе, дома яго работы, можна сказаць, няма, а вось жаночай — без канца і краю...

Не спадабалася маладзіцы такое размеркаванне, захацела яна адпачынкі сабе рабіць. Зранку ежы якой згатуе, мужа пакорміць, сёе-тое ў торбачку яму пакладзе — хіба чарвячка замарыць, а заадно не праміне паскардзіцца, як жа ёй нездаровіцца...

Маладая жонка, прыгожая, муж, бедны, шкадуе: кажа, каб яна паляжала, а сам лётам і на работу, і з работы ляціць: спяшаецца, каб скаціну ўсю агледзець, каб жонцы дапамагчы...

Вось так і павялося ў іх: паціху-памалу ледзь не ўся жаночая работа па гаспадарцы стала мужчынскай. Муж не пярэчыць, ён неяк спраўляецца...

Аднойчы ранічкай збіраецца на касьбу, акідвае ўсё гаспадарскім вокам і бачыць, што на ступе рэшата ляжыць, што кот па ім топчацца ды круціць хвастом... «Яўна нешта ўнюхаў, — думае гаспадар. — Не іначай мыш увалілася? Трэба злавіць, дапамагчы мурлыку».

Скінуў ён рэшата, разам з катом зірк у ступу. Бачаць, нешта бялее там.

Іван за скрутак, разгарнуў — ладны кавалак варанага бачка! І такі ад яго смачны водар, што ў мужчыны аж галава закружылася ды слінкі пацяклі! А тут яшчэ і кот каля локця трэцца — узнагароды просіць...

Гаспадар быў чалавек справядлівы — пачаставаў ката. І сам здагадаўся, як тое салка ў ступу трапіла, адрэзаў кавалачак, да цыбулі з агуркамі ўзяў з сабой. Рэшту паклаў на месца, накрыў, як было, і пайшоў на работу.

Паўдня касою махаў і сам сабе думаў: «Вось дык жонка ў мяне! Вось дык малайчына! Хвароба ад работы, апетыт ад ляноты». Ката яшчэ ўспамінаў...

Яму весела працавалася, хіба смажыла крыху — піць хацелася — асабліва пад'еўшы...

А там і вечар надышоў, муж дадому вярнуўся. Бачыць, жонка ў ложку ляжыць, стогне, бедная, просіць вады.

Ён поўны кубак набраў — і сам прылажыўся, і ёй падаў.

— Хоць з бяды напілася вады, — плачацца маладзіца.

Муж у адказ:

— Я з яе таксама цэлы глячок сёння выпіў.

...Невядома, як яны там паразумеліся, але ж гісторыя гэта выйшла з хаты — стала вядомая ўсім вяскоўцам.

У выніку Маня стала не проста Маняй, а Маняй-Бядой.

Адметна, што гэтая мянушка перайшла потым да яе дачок: у вёсцы з'явіліся Таня-Бяда і Надзя-Бяда. А вось сыны раслі Іванавы, без Бяды.

Ніна Кандрашонак,
г. Петрыкаў.

Дурны двойчы ходзіць, скупы двойчы плоціць

Каля нашага Варапаева ў 60-я гады мінулага стагоддзя на ўсю моц ішла меліярацыя, асушалася балота, што цягнулася ад Свініцы аж да Навасёлак, працавала шмат рознай тэхнікі, у прыватнасці, на трактары з прычэпам ззаду і адвалам-сувачом наперадзе — вядомы ў акрузе «чудзіла», якога звалі Зэнусь.

Дык вось. Неяк раз яго, таго Зэнуся, адзін з вяскоўцаў папрасіў прывезці дровы. Мужчыны абгаварылі «цану пытання», ударылі па руках, і ў хуткім часе трактар ужо быў каля падворка: развярнуўся там, падняў прычэп — высыпаў дровы. Гэта азначала адно: Зэнусь сваю работу выканаў.

Тое ж самае час быў зрабіць і гаспадару, аднак яго раптам жаба заела: грошай стала шкада. Падалося, што трактарыст за сваю работу лішняе «дзярэ»... Да таго ж — прыкінуў гаспадар — дровы ўжо на двары, прывезеныя... То хопіць з трактарыста і паловы той сумы...

Як падумаў, так і зрабіў: адлічыў грошы, падаў Зэнусю. Той паглядзеў на іх і спытаў:

— А чаму так мала?

— Дык малавата ж прывёз... І дровы не з лепшых. Бяроза хіба месцамі трапляецца...

Хацеў яшчэ нешта сказаць — ды не меў каму, бо Зэнусь, злосна плюнуўшы, ускочыў у кабіну, развярнуў свой трактар і тым адвалам-сувачом... папхнуў дровы ў сажалку.

Гаспадар за ім і ў крык:

— Стой!.. Што ты надумаўся? Не рабі так! Я ўсё заплачу!

— Позна... Раней трэба было! — адказаў яму Зэнусь. І не толькі сапхнуў дровы ў сажалку, а яшчэ і «пакатаўся» па іх.

— Пустадомак! Вар'ят! Чым жа я ў печы буду паліць? — пытаў гаспадар, але трактар ужо грукатаў па вуліцы.

...Не, нездарма людзі кажуць, што дурны двойчы ходзіць, а скупы двойчы плоціць. Праверана: так яно ўсё і ёсць.

Ігар Пракаповіч,
г. Паставы.
Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Неасабісты суб'ектыў

Дарога дарог

Пра тое, што абавязкова трэба зрабіць 8 Сакавіка

ЗГАДВАЛІ ўчора з калегам мінулыя гады. Раптам успомнілі, што ў пачатку сакавіка далёкага ўжо 1995 года забілі Улада Лісцьева. І — вось яны, дзівосныя здольнасці чалавечай памяці — пацягнулася ад гэтай малазначнай сёння згадкі іншая, больш важная, тое, што стала значным і вельмі патрэбным разуменнем на ўсё астатняе жыццё.

ЯК цяпер памятаю той сакавіцкі дзень дваццаць шэсць гадоў таму. У дзяржынскай кватэры дзядзькі быў уключаны тэлевізар, але экран быў чорны, толькі белымі літарамі было напісана, што Лісцьеў забіты. Гэта было змрочным фонам да іншай трывогі, якая на той момант хвалявала значна больш. Кожныя пяць хвілін я тэлефанавала на аўтастанцыю з адным пытаннем: «Ці будзе аўтобус на Якуты?», і мне цярпліва адказвалі: «Пакуль не ведаем». Даўно мінуў час адпраўлення таго аўтобуса, але на нашай узгорыстай мясцовасці быў у той дзень такі жудасны галалёд, што на аўтастанцыі ніяк не маглі вырашыць, ці пускаць транспарт з людзьмі па спрэс незаасфальтаванай дарозе ў самы далёкі ў раёне рэйс. Я ўжо дваццаць разоў пашкадавала, што выправілася ў тую пятніцу дамоў, ды яшчэ такая хворая — тэмпература была пад трыццаць дзевяць. Але ж менавіта гэта і падштурхнула ехаць: да мамы, якая вылечыць і пашкадуе. І вось «завісла» ў Дзяржынску, паміж мінскім студэнцкім інтэрнатам і роднай хатай (добра, што каля самай аўтастанцыі жыў стрыечны дзядзька). А на вуліцы ўжо пачынала цямнець, і хілела легчы пад цёплую коўдру, і вусцішна свяціліся белыя літары на чорным экране маўклівага тэлевізара, які чамусьці ніхто не дадумаўся выключыць ці хоць бы пераключыць на іншую праграму...

Нарэшце на мой чарговы званок цётка з аўтастанцыі стомлена сказала: «Праз дзесяць хвілін адпраўленне», і я стрымгалоў, забыўшыся, што ледзьве стаю на нагах, кінулася на той вакзал, убілася разам з натоўпам у цесны душны аўтобус, выдыхнула з палёгкай — ён прыходзіў амаль што пад родную хату, праз нейкую гадзіну буду дома. Але ў той дзень нічога не было проста. Праехаўшы больш чым паўдарогі, кіроўца заявіў, што ні ў Якуты, ні ў мае родныя Кавальцы ён не паедзе — там вельмі крутыя пад'ёмы і спускі, а на дарозе літаральна шкло, і ён не збіраецца рызыкаваць ні нашымі жыццямі, ні тым больш сваім, якое ў яго адно. Так што паедзе напрасткі ў Скірмантава, і гэта будзе канцавым прыпынкам... Такую перспектыву нешматлікія ўжо пасажыры ўспрынялі даволі спакойна: хтосьці менавіта ў гэту вялікую вёску і ехаў, у астатніх былі сваякі ці знаёмыя, у якіх можна было спыніцца. У мяне таксама з гэтым праблем не было — у брата ў тым Скірмантаве вялікая хата, толькі што без папярэджання з'яўлюся, бо хто ж у 1995-м пра якія мабільнікі чуў?

АЛЕ, выйшаўшы з аўтобуса на плошчы, я пакіравала не ў бок брата-вага жытла, а ў напрамку роднай вёскі. Так шчымліва-нецярпліва захацелася да мамы, менавіта сёння, менавіта цяпер. І я пайшла — адна, упоцемку, па суцэльным галалёдзе, пад мокрым снегам, хворая, сем кіламетраў. (Ад аднаго толькі ці то ўспаміну, ці то ўяўлення сёння становіцца ніякавата.) І дайшла, і пастукалася ў замкнёныя ўжо дзверы, і мама войкнула, убачыўшы мяне на ганку. А потым яна паслала мне пасцель, пагрэла, трымаючы на выцягнутых руках каля грубкі, коўдру, заварыла ў каструлі наламанага паблізу хаты маліннiку. Мітусілася, нешта прыгаворвала, падыходзіла, мацала лоб, гладзіла па галаве. А пасля я соладка і моцна заснула і ранкам прачнулася зусім здаровая, нібы не было ні немачы, ні трывожнага чакання, ні рызыкоўнага шляху. А мама казала: «Гэта ж трэба — па ночы, хворая ішла», а сама радасна і, мне здалося, з нейкай ціхай гордасцю ўсміхалася...

ЯўдзячнаЯ лёсу, што гэтая слізкая дарога праз цемру здарылася ў маім жыцці менавіта ў дваццаць гадоў. Якраз у тым самым узросце, калі пачынаеш расстаўляць свае ўласныя жыццёвыя прыярытэты. У тым самым узросце, калі ты становішся або не становішся дарослым. Бо, як для мяне, вызначэнне кагосьці з псіхолагаў пра тое, што чалавек незалежна ад узросту не можа лічыцца па-сапраўднаму дарослым, пакуль не перастане думаць: як у такіх нягеглых бацькоў з'явіўся такі геній, як я? — самае правільнае. Тая дарога мне растлумачыла адно: ёсць на гэтай зямлі чалавек, якому нічога не трэба даказваць, які любіць цябе безумоўна і назаўсёды, да якога будзе цягнуць з усіх вандровак і далёкіх шляхоў. І галоўнае — якое гэта шчасце, што такая магчымасць — вярнуцца і падставіць галаву пад цёплыя маміны далоні — проста ёсць. Гэткае пачуццё абароненасці назаўсёды... І так было яшчэ шмат шчаслівых гадоў: дарога да мамы — нават калі даводзілася ўставаць у чатыры гадзіны на самую першую электрычку, нават калі ламалася машына і даводзілася ехаць аўтастопам — заўсёды была самым радасным шляхам. А ў пачатку сакавіка яна здаралася абавязкова, бо яшчэ з дзяцінства гэта ж маміна свята, праўда?

МНЕ шкада тых, хто думае і жыве інакш. Хто сварыцца з самым родным чалавекам, спрабуючы давесці, што ён лепшы і разумнейшы. Хто, замест таго каб радавацца, што можна проста прыехаць да мамы, высвятляе з ёй адносіны, нярэдка з-за пустых, надуманых непаразуменняў крыўдзіцца сам, крыўдзіць яе. Хто такі заняты, што не едзе, не звоніць, пастаянна адкладваючы «заўтра — абавязкова», знаходзячы сабе апраўданне, чаму тое «заўтра» не прыйшло і праз тыдзень. Яны не здагадваюцца, не разумеюць, што ўсё гэта — сказанае і не сказанае, зробленае і не зробленае — адкладваецца ў памяці і ў сумленні. І калі ўжо ніхто не назаве іх «дачушка» або «сынок» — усё гэта выбухне такім страшным безвыходным адчаем, ад якога не будзе ні суцяшэння, ні паратунку.

ЯгэтА дзеля чаго, уласна, пішу. 8 Сакавіка — яно ж з дзяцінства маміна свята, праўда? Не забудзьце павіншаваць матулю, пакуль у вас ёсць шчаслівая магчымасць гэта зрабіць.

У мяне, на жаль, такой магчымасці ўжо няма. Але засталася слізкая сакавіцкая дарога, па якой я праз цемру прыйшла пад цёплыя маміны далоні.

Алена ЛЯЎКОВІЧ.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению СУП «Гомельская СПМК-49» (продавец) извещает о проведении 19 марта 2021 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 10 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб.	Шаг аукциона – 5 %, бел. руб.	Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб.
1	**Капитальное строение с инв. № 350/С-162112** общей площадью **2 295,6 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **здание административно-хозяйственное.** Пристройка (лит. Б2/к). Открытая автостоянка автомобилей (лит.1). Асфальтобетонное покрытие общей площадью **814,31 кв. м** (инв. № 24700734). Инженерные сети водопровода и канализации (сети водопровода, ливневая канализация, хоз. фекальная канализация) (инв. № 24700730). Сети водопровода протяженностью 10 м. Ливневая канализация – 300,0 м. Хоз. фекальная канализация 100,0 м. Железобетонное ограждение – 90 кв. м (инв. № 24700735). Недвижимые улучшения – ворота с редуктором (инв. № 200117). Недвижимые улучшения – ворота (инв. № 200118). Металлические ворота въездные (инв. № б/н). **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000006001452** общей площадью **0,2118 га (право постоянного пользования). Адрес:** Гомельская обл., Гомельский р-н, г. Гомель, ул. Борисенко, д. 8	**651 105,00**	32 555,25	65 110,50
2	Железобетонное ограждение 262,0 кв. м (инв. № 24700735). Асфальтобетонное покрытие – 5719,23 кв. м (инв. № 24700734)	**354 330,00**	17 716,50	35 433,00
